ЛіМ ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

23 КРАСАВІКА 2004 г. №17/4254

АНОНС!

Набліжаецца 60-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 60-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Установа «Літаратура і Мастацтва» падрыхтавала да выдання кнігу «Наша Перамога». Заказы на яе прымаюцца па тэлефоне : 284-66-71

ХАЛОДНЫЯ АБДЫМКІ АЙЧЫНЫ

Тым, хто трапіў у пантэон на Маскоўскіх могілках, пашанцавала (калі да месца такое слова). Іхныя магілы дагледжаныя, прыбраныя, да іх прыходзяць людзі. Менш пашанцавала тым, каго абмінулі мармуровыя абдымкі Айчыны.

СТАР. 15

...ПАЎНАЛЕЦЦЕ ТРАГЕДЫІ НА ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ АЭС

Вось ужо 18 гадоў, як чалавецтва спазнала, што далёка не ўсе дасягненні навукі ў стане ціхамірна служыць яму. Здарэнне, якое паклала пачатак нашаму тэхналагічнаму дэкадансу, адзначае сваё паўналецце.

СТАР. 12-13



Фотакалаж А. Патапенкі

ЗАКАНАДАЎСТВА

ШТО БУДУЧЫ ЗАКОН РЫХТУЕ?

Угэтым месяцы пачала сваю працу восьмая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ. І тым самым завяршаецца тэрмін паўнамоцтваў ПП НС РБ другога склікання. Аднак расслабляцца дэпутатам ранавата, да хуткіх наступных выбараў ім давядзецца яшчэ шмат працаваць. "Многія актуальныя задачы павінны быць вырашаны неадкладна, для таго каб грамадства і дзяржава мелі эфектыўную заканадаўчую базу для далейшага развіцця", — сцвердзіў Старшыня Палаты прадстаўнікоў В. А. Папоў.

Чым жа будзе адметная гэтая сесія? Па-першае, выступленнем кіраўніка дзяржавы са штогадовым Пасланнем Нацыянальнаму сходу РБ, дзе будуць вызначаны прыярытэтныя напрамкі эканамічнага, дэмакратычнага развіцця і дзяржаўнага будаўніцтва, асветлены пытанні сацыяльнага сектара, а таксама вызначаны напрамкі па ўмацаванні бяспекі Беларусі. На восьмай сесіі разгледзяць Праграму дзейнасці Урада рэспублікі, для чаго правядуць сумеснае пасяджэнне абедзвюх палат — ніжняй і верхняй. З улікам ходу абмеркавання згаданай Праграмы адбудзецца спецыяльнае сумеснае пасяджэнне па пытаннях дэпутатаў і сенатараў, на якія адкажуць прадстаўнікі ўрада Рэспублікі Беларусь па тэме: аб стане і перспектывах развіцця аграпрамысловага комплексу.

У парадку дня сесіі — больш за 100 пытанняў, якія мяркуецца ўключыць да разгляду. Аднак, колькі здолеюць абмеркаваць, пакуль невядома. Усё будзе залежыць ад працавітасці народных абраннікаў. "Адным з асноўных напрамкаў заканатворчасці застаецца кадыфікацыя беларускага заканадаўства, якая дае магчымасць больш сістэмна і комплексна забяспечыць прававы фундамент рэгулявання ўсіх сфер грамадскіх адносін у дзяржаве", — лічыць старшыня ПП НС РБ В. Папоў. Сярод першачарговых — разгляд праектаў Законаў "Аб зацвярджэнні Асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі РБ", "Аб міжнароднай прававой дапамозе па крымінальных справах", "Аб пракуратуры РБ", "Аб барацьбе з карупцыяй", "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс РБ аб шлюбе і сям'і" і г.д.

Хацелася б асобна закрануць заканадаўчыя акты, якія тычацца праблем адукацыі і культуры. На восьмай сесіі ў другім чытанні (а гэта значыць, што ён набліжаецца да прыняцця і ўвядзення ў жыццё) будзе разгледжаны праект Закона РБ "Аб адукацыі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця (спецыяльнай адукацыі); у першым чытанні — праект Закона РБ "Аб вышэйшай адукацыі". Заканадаўцы небеспадстаўна лічаць, што законы, якія закранаюць пытанні культуры, маюць адметнасць у тым, што забяспечваюць гістарычную перспектыву развіцця нашага народа, захаванне ягонай адметнасці і фарміруюць пачуццё годнасці і патрыятызму ў грамадзян. У другім чытанні пройдзе абмеркаванне Закона РБ "Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь". У ім распісаны нормы аб культуралагічнай адукацыі, сказана аб асобах, якія маюць доступ да культурных каштоўнасцяў на льготных умовах, апісаныя гарантыі ў дзейнасці ўстаноў культуры.

Разам з тым у рамках сваіх паўнамоцтваў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў працуюць над вырашэннем міжнародных праблем, пытаннямі інтэграцыі. Для чаго прымаюць удзел у выязных пасяджэннях і канферэнцыях. Да прыкладу, у красавіку-маі пройдзе 5-е пасяджэнне Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва і 23-е пасяджэнне Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД у Санкт-Пецярбургу. А ў першы месяц лета — 24 і 25 чэрвеня ў Брэсце — чарговая, 26-я сесія Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. Дарэчы, падчас правядзення мерапрыемстваў у паўночнай сталіцы РФ адбудзецца навукова-практычная канферэнцыя па пытаннях прававога забеспячэння фарміравання адзінай эканамічнай прасторы. Тым самым на парламенцкім узроўні будуць выпрацаваныя механізмы паглыблення супрацоўніцтва Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана ў эканамічнай, сацыяльнай, культурнай ды іншых сферах.

Тое, што дэпутаты лічаць істотным умацаванне сяброўскіх сувязяў у першую чаргу з суседнімі краінамі, нашымі даўнімі партнёрамі, можна лічыць і факт правядзення ў Гомелі першага пасяджэння Міжпарламенцкай камісіі па супрацоўніцтве Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Вярхоўнай Рады Украіны. Вось і сведчанне таго, што адносіны паміж нашымі парламентамі набылі новую якасць. Можа быць, такім чынам будуць знятыя пытанні, якія ёсць паміж Беларуссю і Украінай. Мажліва, гэта шлях да таго, каб здымаць любыя пытанні, якія ўзнікаюць паміж еўрапейскімі краінамі.

Вольга МЕШЧАРАКОВА

ЭНЦЫКЛАПЕДЫЙ ПАБОЛЬШАЕ

Падчас выязнога пасяджэння камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь былі абмеркаваны пытанні развіцця энцыклапедычнай справы і накірункі ўдасканалення заканадаўчай базы па яе дзяржаўнай падтрымцы.

Пасяджэнне адбылося ў выдавецтве "Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі", якое ўзначальвае Генадзь Пашкоў. Ён і расказаў, што на сённяшні дзень выдавецтва завяршае работу над 6-томнікам "Гісторыя Беларусі", а таксама над іншым выданнем — "Гарады і вёскі Беларусі". Да выдання рыхтуюцца па 2 тамы "Фальклору Беларусі" і "Вялікага княства Літоўскага", а таксама аднатомнік "Кіно Беларусі". Як пісала ўжо і наша газета, адна з найпершых задач выдавецтва — завяршэнне праекта "Хронік памяці": у гэтым годзе выдадуць ажно 8 тамоў, а ў наступным — апошні, абагульняючы, прымеркаваны да вялікага юбілейнага свята Перамогі.

Варта адзначыць, што справа з выданнем энцыклапедый у нашай краіне значна палепшылася, да таго ж у гэтым накірунку мы апярэджваем суседзяў. З гэтай думкай згадзіліся і парламентарыі. Старшыня парламенцкай камісіі Ігар Катляроў адзначыў, што без падтрымкі дзяржавы выканаць адказныя задачы, якія стаяць перад дзяржаўным выдавецтвам, няможна. Аднак не абмінулі і праблем кнігавыдання. Падчас шчырай размовы выдаўцоў і заканадаўцаў была выказана думка матэрыяльнага плану, каб выдавецтва падтрымлівалася і падахвочвалася матэрыяльна згодна спецыяльнага указу Прэзідэнта, распрацаванага для "Беларускай энцыклапедыі імя П. Броўкі". Аднак пакуль такога ўказа няма, даводзіцца працаваць на энтузіязме. Парламентарыі паставіліся да праблемы спачувальна. Зразумеўшы значнасць гэтага дзяржаўнага выдавецтва, яны прапанавалі пасля зацвярджэння плану выпуску энцыклапедый даручыць кіраўнікам рэспубліканскіх органаў кіравання, навукова-даследчых інстытутаў аказваць усебаковую падтрымку у падрыхтоўцы, а Міністэрству фінансаў — у выпуску выданняў шляхам выдзялення сродкаў пры фарміраванні рэспубліканскага бюджэту.

ВІКа

Колькі каштуе беларускае слова?

Амаль паўсюдна — у школах, на вуліцы, дома, СМІ — мы чуем у асноўным мову рускую. Роднае слова гучыць усё менш і слабей. Якую ролю мова мае ў жыцці чалавека? Адказ на гэтае пытанне дае аналіз доследаў вядомага Маскоўскага вучонага-генетыка Пятра Гараева, аб якіх ён паведаміў у канцы 90-х гадоў на хвалі Радыё-1 Астанкіна ў перадачы "Веру — не веру". Паводле яго дадзеных, мова з'яўляецца адным з асноўных механізмаў настройкі арганізма на рэзананс з навакольным асяроддзем. А як вядома, усё ў Сонечнай сістэме знаходзіцца ў рэзанансным стане, у тым ліку і чалавек. У сваіх доследах вучоны паказаў, што малекулы ДНК, у якіх захоўваецца ўся генетычная інфармацыя, маюць імгненную і адназначную рэзанансную рэакцыю толькі на родную мову. Калі ўзяць гэты ягоны вывад за аснову, то роля мовы з абстрактнага паняцця пераходзіць у разрад аднаго з галоўных паказчыкаў у здароўі чалавека і яго развіцці як асобы. Таму, каб быць здаровымі, трэба, каб наша беларускае слова ў краіне было пануючым, так, як напрыклад, — у Польшчы — польскае, на Украіне — украінскае і г.д. Тады наша беларуская мова стане адным з падмуркаў нацыянальнай ідэі. І калі да гэтага дададзім яшчэ нашы адноўленыя прыродныя ландшафты — балоты, малыя рэчкі, крыніцы, ручаі, то беларуская нацыя абавязкова выжыве.

Валянцін КЛЯПКО,
в. Лотвіны, Капыльскага раёна

Карысныя ўрокі пісьменніка

Магчыма, не зусім сціпла ўспамінаць сваё надрукаванае, але мушу ўспомніць, спадзеючыся, што мне прабачаць. Дык вось, свой матэрыял "Шлях да малітвы" ў мінулым нумары "ЛіМа" я закончыла акцэнтам, маўляў, усё павінна быць "на дабро". І ў жыцці, і ў літаратуры, ды ў любой сферы чалавечай дзейнасці. На гэтую думку, якая, вядома ж, не адкрыццё, мяне падштурхнуў артыкул выдатнага беларускага пісьменніка Уладзіміра Дамашэвіча "Кніга павінна ачышчаць нашу мову", надрукаваны ў "ЛіМе" за 2 красавіка гэтага года. У ім Уладзімір Максімавіч, як я ведаю з друку, настаўнік не аднаго пакалення нашых празаікаў — шмат гадоў працаваў у часопісе "Маладосць" з літаратурнай моладдзю — вядзе гаворку з чытачамі аб культуры мовы. Ён надзвычай даходліва тлумачыць, як трэба ставіцца да роднага слова, і як я разумею, да жыцця наогул, да ўсяго, што было, ёсць і будзе сярод людзей.

Што датычыць роднай мовы, то мяркую па сабе, гараджанцы: нам яе вучыць ды вучыць, і няма нічога кепскага ў гэтым. Мы, гарадскія хлопцы і дзяўчаты жывём не ў беларускамоўным асяроддзі, далёка не ў кожнай сям'і размаўляюць на роднай мове, і часта вучымся ёй з кніг і газет, у якіх часам шмат запазычаных слоў з іншых моў. Гэта кепска, вядома. Але ж, здаецца, за апошні час артыкул Уладзіміра Максімавіча Дамашэвіча ледзь не адзіны, у прыватнасці, у "ЛіМе", які можна лічыць своеасаблівым урокам майстра роднай мовы. Мне асабіста ўрок гэты вельмі спадабаўся: просты і даходліва-добры. Хай бы Уладзімір Максімавіч і надалей вёў прыкладна такія ўрокі на старонках газет і часопісаў. Ён жа нікога не крыўдзіць, не зневажае; — а робіць усё гэта на дабро!

Ды якая ж сувязь паміж маім названым у пачатку матэрыялам і артыкулам слыннага пісьменніка? Баюся, што няма ніякай: хто я такая... Але ўсё думаю: гаворыць жа пісьменнік, што мова наша настолькі багатая і каларытная, таму лёгка можам абысціся сваім, родным словам, без чужога запазычвання. А чужое нам невядома чаму навязваюць праз газеты і некаторыя кнігі. Вось тут і не пакідае думка: чаму?.. Але ці толькі ў мове "навязваюць?"

Мне асабіста не зразумела, колькі ні задумваюся, у каго ні пытаю: дзеля чаго радыё, тэлебачанне, большасць газет называюць людзей, нават шаноўнага ўзросту, проста па імені, а не па імені і па бацьку? Мо хочацца так, як у некаторых чужынцаў? Дык, мабыць, гэта іх справа. А ў нас, бацькі мае кажуць, было прынята людзей паважаных, старэйшых за сябе называць па імені і па бацьку. Іншы раз думаю, можа гэта дробязь? Ды — не... Вось і вяртаюся зноў да артыкула "Шлях да малітвы". З кніжкі Алены Кобец-Філімонавай зразумела — быў час, калі ў многіх і многіх людзей наогул забіралі бацькоў, прымушалі забыць іх і свой род. Калі ж мы засмечваем іншаземнымі словамі родную мову, то тым самым адмаўляемся таксама ад свайго бацькоўскага. А тут яшчэ — ад імя па бацьку.

Магчыма, я і памыляюся. Толькі ж неяк няёмка, калі ўсё чужое. Нібы і гісторыі ў нас не было і народа, дзядуль, а зараз — і бацькоў "губляем". Мне могуць запярэчыць, што ўсё залежыць ад кожнага з нас. Я гэта ведаю: той жа прыклад Алены Кобец-Філімонавай. Але ж калі зробім нормай грамадскага жыцця адмаўляць сваё: то сапраўды застанемся бязбацькавічамі.

Вольга ЛЕШЧАНКА,
вучаніца 11 класа Мінскай тэхналагічнай гімназіі № 13.

Чаму "Векапомныя дні" не сталі "Войной и миром"

Нядаўна на старонках "ЛіМа" была ўзнята цікавая тэма. Хацелася б дадаць колькі слоў...

Калі выраз "поле бою" пераўвасобіць у вобраз "поле вайны", яно мне ўяўляецца не суцэльным палеткам, заараным і засеяным, а шматлікімі, апрацаванымі і ўходжанымі палоскамі і загонамі, нівамі і ніўкамі, раскіданымі ўздоўж і ўпоперак, сярод якіх кідаюцца ў вочы і парослыя травой бліндажы і акопы з нявыяўленымі астанкамі (з нявыяўленымі і неперазахаванымі) абаронцаў роднай зямлі.

Што яшчэ не сказалі пісьменнікі пра вайну — гэта тэма даследаванняў інстытута літаратуры. Я магу выказаць толькі сваё суб'ектыўнае меркаванне, сыходзячы з той літаратуры, якую я змог прачытаць на працягу жыцця.

Прынамсі, можна зрабіць цікавую і патрэбную даследчыцкую кнігу, кнігу-даведнік, якая стала б настольнай кнігай не толькі настаўнікаў і вучняў, але і ўсіх, хто цікавіцца тэмай вайны.

Ці маем цяпер мы больш-менш дакладнае ўяўленне, якія аспекты панарамы франтавых падзей, нястомнай партызанскай барацьбы і поўнага трагізму акупацыйнага жыцця беларускага народа знайшлі сваё праўдзівае адлюстраванне ў беларускай мастацкай літаратуры — і прозе, і паэзіі? Якія былі ў экстрэмальных умовах ваеннага часу ўзаемаадносіны камандзіраў і радавых салдат, скажам, у эпоху таталітарызму, масавых рэпрэсій і гулагаў?

Па розных прычынах пісьменнікі не сказалі яшчэ пра вайну ўсю праўду, асабліва пра першыя месяцы вераломнага нападу на нашу разгубленую і негатовую даць адпор краіну, пра бяспечнасць, непрадбачлівасць і звычайную злачыннасць савецкага кіраўніцтва.

Мала мы ведаем і пра вызваленчую місію Чырвонай Арміі, пра адносіны да яе народаў усходнееўрапейскіх краін, пра палон цэлых армейскіх фарміраванняў, а не толькі асобных салдат ці невялікіх груп франтавікоў (акрамя рамана Міколы Аўрамчыка "У падзямеллі" нічога адразу і не ўспомніш).

А колькі "момантаў ісціны" не трапіла ў аб'ектыў беларускай літаратуры?

Не менш настойліва напрошваецца і другое пытанне: што неабходна дапоўніць ці перапісаць са сказанага нашай літаратурай пра вайну?

Нягледзячы на тое, што беларускія пісьменнікі стварылі шмат выдатных твораў пра Другую сусветную вайну, напісанне Эпапеі пра яе яшчэ не скончана.

Няма ў нас і сваёй "кнігі пра байца" — праўдзівай аповесці пра радавога салдата (пехацінца, зенітчыка, танкіста, разведчыка), які прайшоў бы ўсю вайну і вярнуўся б дамоў з перамогай.

А што мы ведаем пра глыбінныя прычыны з'яўлення "вогненных вёсак" — нашых Хатыняў?

Прызнаюся, я не раз думаў пра тое, чаму "Векапомныя дні" Міхася Лынькова не сталі "Войной и миром"? А — яркімі эпізодамі партызанскай барацьбы на Беларусі". Гэта залежыць ад таленту пісьменніка ці, можа, і ад яго спадчыннай культуры?

Праўда і псіхалогія — вось што першнаперш патрэбна для стварэння Эпапеі пра жыццё і змаганне кожнага народа.

Яўген МІКЛАШЭЎСКІ

Кожная гістарычная эпоха, якая адыходзіць у мінулае, пакідае за сабой след у выглядзе матэрыяльнай і духоўнай культуры. На яе падставе складаецца грамадскі гістарычны вопыт, а яго сведчаннямі назаўсёды застаюцца помнікі гісторыі і культуры. Значную частку такіх помнікаў захоўвае і Мотальскі музей народнай творчасці Іванаўскага раёна, які ў пачатку гэтага года атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За высокія творчыя дасягненні ў галіне музейнай справы".

Пра тое, чым зараз жыве музей, і пойдзе размова ніжэй.



МОТАЛЬСКАЯ СВЯТЫНЯ

Колькі б разоў ні заходзіў у Мотальскі музей народнай творчасці, абавязкова чамунебудзь ды здзівішся. Хоць, здаецца, кожны экспанат знаёмы, на экскурсіях ты неаднойчы пабываў, розных легенд і паданняў наслухаўся.

Трапілі мы сюды якраз на другі дзень пасля Яблычнага Спаса. Дзень гэты, дарэчы, у мотальцаў у вялікай пашане: з году ў год у вёсцы адзначаецца вялікі святок — амаль паўтара стагоддзя таму ў мястэчку была адкрыта Свята-Прэабражэнская царква.

— Добра, што прыехалі не ўчора, — прывітаўшыся, прамовіла дырэктар музея Вольга Рыгораўна Мацукевіч, — бо не знайшлося б нават і хвілінкі вольнай, каб пагутарыць: паўнюткія залы былі цэлы дзень. А напрыканцы дня, ужо надвячоркам, нашы гарманісты на прыступках ганачка так зайгралі, што ногі самі ў танец рынуліся. Традыцыя наведваць музей у гэты дзень у вяскоўцаў пачала складвацца ў апошнія гады, таму і назвалі мы яго Днём адчыненых дзвярэй. Каля 200 чалавек завіталі сюды ўчора. І не толькі госці, якія прыехалі да бацькоў, — працягвае аповед Вольга Рыгораўна, — але і карэнныя жыхары: для іх музей, як і царква, стаў яшчэ адной святыняй.

Што ж прываблівае ў музей, чаму асобныя з жыхароў просяць самі прайсціся са знаёмымі, гасцямі, родзічамі, якія прыязджаюць часцей за ўсё на святок, па яго залах?

У гутарцы адна з экскурсаводаў-аматараў Марыя Якаўлеўна Калілец прызналася:

— Па-першае, царква побач. Выйсці адтуль і не зайсці ў музей — як быццам заканчэння службы ў царкве не дачакаўся. Тут жа, бы ў храме, адчуваеш сябе. А па-другое, мала такіх мотальцаў, якія не падаравалі б тую ці іншую рэч для музея: ці то ручнік выткані, ці кажушок, якімі так славіцца зямля наша, ці то нейкія прылады працы даўно ўжо забытага рамяства, а то і вопратку з бабулінага куфэрка. А чаму не прыйсці ды не "пагутарыць" з гэтымі музейнымі рэліквіямі і пра час, і пра сябе, дзядоў і прадзедаў словам добрым памянуць. А калі ўсё гэта бачыш на вітрыне, ды яшчэ подпіс стаіць, дык аж сэрца замірае ад дакранання да такога роднага і падзяліцца радасцю, пачуццямі хочацца з усімі.

Усіх, хто прыходзіць у музей, які знаходзіцца ў цэнтры вёскі, на беразе рэчкі Ясельда, аб'ядноўвае адно — вялікі гонар за сваіх прашчураў. І гэта не выхваленне. Каб стварыць прыгажосць, якой аздоблены залы, патрэбны не толькі старанне, майстэрства, але і здольнасці авалодаць унікальнай навукай, пераўтварыць лён у цудоўныя карункі, у ручнікі з таямнічымі ўзорамі, вясельныя сукенкі ды розныя вышыванкі.

Музей, дзякуючы гасцям і жыхарам вёскі, штогод папаўняецца каштоўнымі экспанатамі. А гэта ў сваю чаргу дае магчымасць пастаянна рыхтаваць новыя выставы ў спецыяльна прызначанай для гэтага зале. Толькі ў апошні час тут можна было пазнаёміцца з выставамі меднага посуду, саломапляценнем, вырабамі з лазы. Нядаўна тут была адкрыта экспазіцыя Брэсцкага краязнаўчага музея, прысвечаная Хаіму Вейцману, ураджэнцу вёскі Моталь — палітычнаму і дзяржаўнаму дзеячу Ізраіля, вучонаму-хіміку, прафесару біялогіі, выкладчыку Жэнеўскага і Манчэстэрскага універсітэтаў, першаму прэзідэнту Ізраіля, заснавальніку яўрэйскага універсітэта ў Іерусаліме.

А зараз тут можна ўбачыць выставы нёманскага шкла, тульскіх самавараў, германскага і кузняцоўскага фарфору, малюнкі на шкле, сучасны жывапіс нашых землякоў. Менавіта адсюль пачынаецца радзімазнаўства. Трэба быць своеасаблівымі людзьмі, каб розумам і рукамі стварыць усё, што ёсць у музеі.

Але сюды вабіць не толькі ўзнёслая прыгажосць рэчаў музея, якія пяюць гімн працы людзей заходнепалескага рэгіёна, але заварожвае і ўменне супрацоўнікаў музея падрыхтаваць да экскурсіі кожную залу так, каб была яна непаўторнай для ўспрымання.

Жамчужынай музея, лічыць Вольга Рыгораўна, з'яўляецца жывы гук, пры дапамозе якога кожная зала ажывае прыказкай, прымаўкай, народнай песняй. У зале земляробства, напрыклад, можна пазнаёміцца з мноствам земляробчых звычаяў і абрадаў, а ў зале ткацтва — не толькі сесці і паткаць, а і пад ціхі стук бёрдаў пачуць мілагучную песню "Ой за гаем зеляненькім рвала ўдава лён драбненькі...", ці бойкую частушку "Праду, праду тонка, — свішча верацёнка..."

А вось убранне ў абрадавай зале кожны раз іншае — у залежнасці ад свята, якое прыходзіць з календаром абрадавага цыкла. Зараз, дарэчы, яна падрыхтавана да восеньскіх свят.

У гэтай сялянскай хаце, якую напамінае зала, заўсёды жывуць героі мотальскага быту: тут хрэсьбіны і Траецкія святы, вяселлі і Дзмітраўскія дзяды.

Музей прыцягвае студэнтаў і навукоўцаў, якія заўсёды знаходзяць для сябе нешта новае і цікавае. Зараз тут з натхненнем працуе Віктар Абухоўскі, дактарант Варшаўскага універсітэта, член культурна-асветніцкага аб'яднання палякаў на Беларусі імя А. Міцкевіча.

Ён перакананы ў тым, што ў Моталі знаходзіцца самы вялікі збор музейных археалагічных матэрыялаў на Брэстчыне, якія датычаць першапачатковага заселення Заходняй Беларусі ў XI—V стагоддзях да н.э. Найкаштоўнейшыя з іх, сабраныя Сяргеем Сцяпанавічам Лазюком і перададзеныя музею яго жонкай Марыяй Пятроўнай, а таксама адкрытыя ў час раскопак супрацоўнікам Нацыянальнай акадэміі навук краіны Аленай Каленчыц.

Зацікавілі матэрыялы музея і Ганну Энгелькінг, доктара, асістэнта кафедры беларускай культуры універсітэта ў Беластоку, якая два гады запар разам са студэнтамі працавала тут у час летніх канікул. Нядаўна яна звярнулася з прапановай да загадчыка аддзела культуры райвыканкама Уладзіміра Шэляговіча зрабіць пры падтрымцы заходнепалескага навукова-краязнаўчага таварыства "Загароддзе" сумеснае выданне фотаальбома вядомага майстра Аляксея Мінюка, якога называюць у вёсцы "мотальскім Кулібіным". Гэта ён пакінуў звыш чатырох тысяч негатываў палескай хронікі жыцця з 1927 па 1977 гады, зробленых змайстраваным ім самім фотаапаратам.

Заклапочанасць супрацоўнікаў музея адчуваецца не толькі ў дзень свят, а штодзённа. Дарэчы, яны падрыхтавалі "Мотальскую карчму" да абласнога свята "Дажынкі—2002", якое адбылося ў нашым раёне, а наперадзе — зноў розныя цікавыя задумкі. Але галоўнае для іх — каб музей не стаў "старамодным" "кранутым моллю і цвіллю", незвычайным зборам рэчаў, а, па трапным выказванні рускага філосафа Фёдарава, "саборам асоб".

Для тых, хто аднойчы наведаў музей і з цікавасцю аднёсся да рэчаў народных майстроў — а іх тут каля 27 тысяч, — той абавязкова захоча вярнуцца сюды яшчэ раз. Бо тут, у цішы залы, ён сустрэнецца з гісторыяй, адчуе каларыт эпохі, дакранецца да каранёў сваіх і паспрабуе зрабіць усё, каб яны ніколі не засыхалі, каб не змаўкалі песні, а "дрэва жыцця буйна зелянела".

Марыя ГАРУПА
г. Іванава

ВЕЧАРЫНЫ

ПАДАРЫ МНЕ СВАЮ АДЗІНОТУ...

Пад такой назвай напрыканцы сакавіка ў дольнай зале тэатра аднаго акцёра "Зьніч" прайшла прэзентацыя аднайменнай паэтычнай кнігі Міколы Шабовіча. Скажу шчыра, калі я ішоў на вечарыну, то не мог нават уявіць сабе, што апынуся на сапраўдным свяце паэзіі і песні. Мяркуйце самі, абсалютная большасць выступоўцаў — кампазітары і спевакі, а гэта шмат пра што гаворыць.

Паэзія Міколы Шабовіча нібыта створана для таго, каб быць пакладзенай на музыку — кожны вершаваны радок прасякнуты музычным настроем. Вось чаму паэт аддае перавагу інтымнай лірыцы, апяваючы светлыя і высокія пачуцці душы. І я не здзіўся, калі першай на сцэну з песняй пра каханне выйшла маладая спявачка — студэнтка БДПУ імя М.Танка Кацярына Цішкевіч. Дарэчы, Мікола Віктаравіч з'яўляецца выкладчыкам гэтага універсітэта, таму песні ў выкананні таленавітых студэнтаў на музыку кампазітара Генадзя Кубаркі — натуральная з'ява.

На вечарыне прысутнічаў Алег Елісеенкаў, адзін з першых кампазітараў, які паклаў вершы Міколы Шабовіча на музыку. Віртуозная ігра на фартэпіяна ў спалучэнні з цудоўным выкананнем ператварылі верш "Не адлятай" у эстрадны хіт, які адпавядае ўсім запатрабаванням эфірнага фармату радыёстанцый. Свае творы прадэманстравалі і іншыя сааўтары М.Шабовіча: Алег Залётнеў, Алена Атрашкевіч, Алег Малашчыцкі, Мікола Яцкоў. Не абышлося без сюрпрызаў... Імі сталіся выступленне фальклорнага гурта "Менскі гармонік" пад кіраўніцтвам Івана Раманчука, а таксама прэм'ера песні на вершы Міколы Шабовіча ў выкананні маладога барда Аляксандра Барташэвіча.

"Для запісу сноў і адчуванняў не дастаткова адных фарбаў, патрэбны яшчэ і цені. Менавіта гэтыя цені, а дакладней паўтоны, знаходзіць Мікола Шабовіч..." — гэткія трапныя словы ў адрас "імянінніка" выказаў галоўны рэдактар часопіса "Вожык" вядомы паэт Алесь Пісьмянкоў. Услед за "галоўным" слова ўзялі супрацоўнікі і сталыя аўтары "Вожыка", на старонках якога часта друкуецца М.Шабовіч, Анатоль Зэкаў і Уладзімір Ермалаеў. Апошні падарыў віноўніку ўрачыстасці сваю літаральна знятую з друкарскага варштата кнігу "Дулі будуць апасля..." Тон імпрэзе, дасціпна, з гумарам прадстаўляючы выступоўцаў, задаваў галоўны рэдактар "Беларускага радыё" Навум Гальпяровіч.

Сённяшнія творцы — небагатыя людзі. Але, калі ў цябе ёсць такія сябры, якія ёсць у паэта Міколы Шабовіча, то можаш лічыць сябе заможным чалавекам... Натхненне, як і старыя сябры і чароўная закаханая Муза-незабудка, крочыць з ім праз усё жыццё. А гэта значыць, што нас чакаюць новыя хвалюючыя сустрэчы з небаўзнёслай, завоблачнай паэтычна-песеннай творчасцю Міколы Шабовіча.

ЯнАк

НА ДРУГІ ДЗЕНЬ ВАЙНЫ

За вайну ў Беларусі загінуў кожны чацвёрты. А мы хавалі адразу чатырох: маці, сястру, бабулю і дзядзьку Сяргея. У час налёту фашысцкіх бамбардзіроўшчыкаў на Мінск ужо на другі дзень вайны мае родныя прынялі жудасную смерць.

Як цяпер памятаю, быў ціхі сонечны ранак. На небе — ні хмурынкі. У нашым двары, дзе рос вялікі куст бэзу, весела цвыркалі неўтаймоўныя вераб'і, раптам аднекуль здалёк пачуўся глухі гул. Ён усё набліжаўся і набліжаўся. Мы з маці выскачылі на ганак і ўбачылі страшэннае відовішча: проста на нас з боку аэрапорта ляцяць самалёты. Я налічыла іх трыццаць чатыры. Як прывіды, з чорнымі крыламі. Вось яны ўжо над нашым агародам. Маці схапіла мяне за плячук:

— Лезем у склеп!

— Трэба Таню апрануць. — І я кінулася ў бакоўку да Тані.

Сястрычка сядзела на ложку і гуляла з лялькай. Яна пазірала на мяне блакітнымі вочкамі і старалася дакрануцца да шчакі, каб пацалавацца, як заўсёды рабіла гэта, убачыўшы мяне. Я апранула ёй сукенку, узяла ў руку сандалік. І тут усё навокал затрашчала, заварушылася, над намі ўзняўся вогненны слуп. Сцяна бакоўкі абвалілася, нешта моцна выцяла мяне па галаве, прыціснула да другой сцяны, і я страціла прытомнасць. Ачнулася ад гарачыні і болю ў галаве. "Бомба! Гэта запальная бомба трапіла ў нашу хату, — скеміла я. — Трэба ратавацца хутчэй". Пачала адкідваць ад сябе разбітыя дошкі, кавалкі тынкоўкі і неяк выбралася з-пад абломкаў. Але што са мною? Нічога не чую, па шчацэ цячэ кроў, капае на падраную сукенку. У гэты момант каля маіх ног нехта заварушыўся. "Таня!" Схапіўшы малую пад паху, праз агонь і дым пачала прабірацца на двор.

Не паспелі мы перабегчы на другі бок вуліцы, як з моцным гулам, падобным на стогн, абрушыўся дах. Ва ўсе бакі разляцеліся галавешкі, клубы агню, і вось ужо запалала ўся хата. Ад яе загарэліся хаты і хлявы суседзяў.

Пачалі збягацца людзі. Нехта прынёс бінт, перавязаў мне галаву, даў папіць вады. Пра тое, каб тушыць агонь, ніхто і не думаў. Прыбеглі бацька з цёткай Поляй (яны працавалі на чыгунцы) і старэйшая сястра Жэня, якая з самага ранку пайшла да сяброўкі. Калі дагарэлі бярвенні і засталіся адны галавешкі, пачалі шукаць сваіх родных.

Маці ляжала ў склепе. Правая скронь была прабіта асколкам. Па усім было відаць, яна вельмі пакутавала ад агню і дыму, прыкрываючы твар абгарэлай анучай. Так і застылі яе рукі. А было ёй толькі сорак гадоў.

Сястры Лідачцы было адзінаццаць. Разумная дзяўчынка, вучылася на адны пяцёркі. Настаўнікі заўсёды хвалілі яе. Яна часта весяліла нас сваімі выдумкамі, хораша спявала дзіцячыя песні, і тады яе блакітныя вочы свяціліся светлым агеньчыкам, які мне ніколі не забыць.

Бабуля была строгая, але справядлівая. Працуючы ўсё жыццё на зямлі, маючы ў гаспадарцы карову, свіней і хатнюю птушку, яна ведала цану працы і вучыла нас, унукаў, працаваць. Мне, чатырнаццацігадовай дзяўчынцы, было ў радасць дапамагаць бабулі палоць грады, паліваць расліны. Але найбольш я любіла даглядаць куранят, гэтых маленькіх жоўтых камячкоў. А яшчэ яна даручала мне пасвіць карову. І, вядома ж, дзякавала сваёй ласкай, купляла розныя прысмакі: сітро, цукеркі, шакаладку.

Дзядзька Сяргей быў вельмі падобны да бабулі: крыху рыжаватыя валасы, рабаціністы твар.Ён працаваў шафёрам, часта прыязджаў на нашу ціхую, зарослую травою Студэнцкую вуліцу на грузавіку. Дзядзьку знайшлі каля хлява, чорнага, абгарэлага. Як ён апынуўся там, невядома. Ці калі грымнула бомба, яго адкінула паветранай хваляй, ці, магчыма, ён поўз, паранены, у агарод, каб схавацца ад агню.

Як успомню, робіцца жудасна, калі мы разам з суседзямі шукалі нашых родных і калі я знайшла ў попеле бабуліну нагу, а непадалек — галаву сястрычкі Ліды. Знайшлі і бабулю Ракітніцкую, якая жыла у першай кватэры з сынам Казімірам, пазней вядомым беларускім шашыстам, майстрам спорту СССР. Ён і мяне вучыў гуляць у шашкі і прарочыў спартыўную будучыню.

Я таксама магла загінуць. Не жартачкі апынуцца пад руінамі хаты і цудам выратавацца. Думаю, ёсць Бог на свеце. І ёсць добрыя людзі, якія дапамаглі нам выжыць. Гэта жыхары вёскі Шчомысліца, куды нас, галодных, знясіленых, параненых, тых, хто застаўся без бацькоў, вывезлі на машыне. Гэта і жыхары Мачулішчаў, да якіх мы, блукаючы, стукаліся ў дзверы і якія давалі нам вопратку, абутак, кавалак хлеба, а хто і кубак малака ці звараную ў лушпінах бульбу.

Калі вярнуліся ў Мінск да сваякоў, нас знайшоў бацька. І пачаліся новыя пакуты: не было дзе жыць, не было чаго есці. Бацька знайшоў нейкую кватэру, гаспадары якой з'ехалі з Мінска, і мы атабарыліся ў ёй. Крыху ачуняўшы, давялося паехаць на заробкі. З трыма дзяўчынкамі трапілі да багатай гаспадыні, што жыла непадалёк ад мястэчка Мір. Малацілі збожжа, капалі бульбу і выконвалі розную брудную работу. Зарабіла я два мяшкі бульбы і трохі мукі.

Аднаго дня, ужо ў Мінску, калі я ішла па ваду, мяне дагнаў наш блізкі сусед Пятро Бачыла, з якім мы вучыліся ў адной школе. "Алена, зайдзі, калі ласка, да мяне. Хачу перамовіцца з табой", — пачула я. Прынесла дахаты ваду і адразу пайшла да Пятра. Убачыўшы мяне, твар яго адразу пасвятлеў, у вачах, як мне здалося, зазіхацелі іскрынкі дзіцячай гарэзлівасці. Ён узяў мяне за руку і павёў у склеп, паказаў на радыёпрыёмнік, што стаяў на самаробным стале, і прамовіў:

— Хачу даручыць табе адказную справу. Ты — піянерка, давала клятву быць вернай Радзіме. Ведаю, як ненавідзіш фашыстаў. Будзеш прымаць зводкі Саўінфармбюро, потым дапаможаш распаўсюджваць іх, каб жыхары нашага раёна ведалі, што дзеецца на франтах. Справа гэта сакрэтная. Нікому нічога не расказвай. Нават бацьку.

Так я стала дапамагаць падпольшчыкам. Седзячы ў халодным склепе каля прыёмніка, старалася як найхутчэй запісваць паведамленні і размнажаць іх. Паперы было мала, і мы выкарыстоўвалі шпалеры: рэзалі іх на лісты і буйнымі літарамі пісалі тэкст. А ўначы расклейвалі іх дзе толькі маглі, у асноўным на вуліцах Вакзальнай, Студэнцкай, Тыфліскай, Барысаўскай, Талстога.

Я спраўна выконвала ўсё, што загадваў мне гэты цудоўны васемнаццацігадовы хлапец, сапраўдны таварыш, вельмі сур'ёзны, удумлівы і добразычлівы.

Бывалі моманты, калі Пятро даручаў мне як сувязной перадаць запіску свайму кіраўніку. Каб нікога не сустрэць, я агародамі прабіралася на Магілёўскую вуліцу і ўручала яе зусім незнаёмаму юнаку, які чакаў мяне ў двары. Як звалі яго, Пятро не сказаў. Толькі пазней я даведалася, што гэта быў Мікола Кедышка, з якім наша група трымала сувязь.

Пятро з хлопцамі збіралі ў лесе зброю і некалькі разоў перадавалі партызанам. Нічога не прадвяшчала няшчасця. Ды раптам...Пятро ехаў у атрад на падводзе са схаванай у сене зброяй, і каля Чэрвеньскага рынку яго схапілі паліцаі. Знайшлі зброю, адправілі ў гестапа. Ніякія катаванні не зламілі волю Пятра Бачылы. Мужны патрыёт загінуў у фашысцкіх засценках, але нікога не выдаў. І наша група распалася.

Калі я ўспамінаю Пятра Бачылу, якога ведала з маленства, сэрца маё напаўняецца вялікім смуткам. Хоць мінула шмат гадоў, ён назаўсёды застаўся для мяне маладым. Цяпер яму было б восемдзесят, як і многім партызанам, падпольшчыкам, франтавікам, хто загінуў смерцю храбрых у змаганні з фашысцкімі захопнікамі. Успамінаю з болем у сэрцы сваіх родных: маці, сястру, бабулю, дзядзьку, пахаваных на Кальварыйскіх могілках.

Алена МІМРЫК

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II КВАРТАЛ 2004 ГОДА!

Шаноўныя чытачы! Ідзе падпіска на другі квартал 2004 года. На выданні Рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва" можна падпісацца ў любым паштовым аддзяленні нашай краіны. Для ўстаноў Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адкрыта льготная падпіска.

«Літаратура і мастацтва»

Індывідуальная (індэкс — 63856)
на 1 месяц — 2600 руб.
на 3 месяцы — 7800 руб.
Ведамасная (індэкс — 63857)
на 1 месяц — 4100 руб.
на 3 месяцы — 12 300 руб.
Льготная (індэкс — 63880)
на 6 месяцаў — 16 800 руб.

«Полымя»

Індывідуальная (індэкс — 74985)
на 1 месяц — 2600 руб.
на 3 месяцы — 7800 руб.
Ведамасная (індэкс — 00141)
на 1 месяц — 3600 руб.
на 3 месяцы — 10 800 руб.
Льготная (індэкс — 00727)
на 6 месяцаў — 16 800 руб.

«Маладосць»

Індывідуальная (індэкс — 74957)
на 1 месяц — 2700 руб.
на 3 месяцы — 8100 руб.
Ведамасная (індэкс — 00137)
на 1 месяц — 3900 руб.
на 3 месяцы — 11 700 руб.
Льготная (індэкс — 00731)
на 6 месяцаў — 16 800 руб.

«Нёман»

Індывідуальная (індэкс — 74968)
на 1 месяц — 2600 руб.
на 3 месяцы — 7800 руб.
Ведамасная (індэкс — 00238)
на 1 месяц — 3600 руб.
на 3 месяцы — 10 800 руб.
Льготная (індэкс — 00728)
на 6 месяцаў — 16 800 руб.

«Всемирная литература»

Індывідуальная (індэкс — 74863)
на 1 месяц — 2600 руб.
на 3 месяцы — 5200 руб.
Ведамасная (індэкс — 00135)
на 1 месяц — 3600 руб.
на 3 месяцы — 7200 руб.
Льготная (індэкс — 00729)
на 6 месяцаў — 8400 руб.

УВАГА!

Пачынаючы з КРАСАВІКА бягучага года Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва» ПРЫПЫНІЛА ПАСТАЎКУ СВАІХ ВЫДАННЯЎ («Полымя», «Маладосць», «Нёман», «Всемирная литература», «ЛіМ») У РОЗНІЦУ.

Адзіная магчымасць застацца нашымі чытачамі — ПАДПІСАЦЦА на часопісы і газету.

ЦІ "КНІЖНАЯ" МЫ НАЦЫЯ?

Беларускі народ за гісторыю свайго існавання стварыў вялікую і самабытную літаратуру, якая з'яўляецца адной з самых багатых у свеце. Але, на жаль, у поўным аб'ёме яна пакуль яшчэ недаступна для масавага чытача. Трэба энергічней садзейнічаць прапагандзе беларускамоўнай літаратуры, нашай культурнай спадчыне, без якіх ні адзін народ не можа ўсвядоміць сябе як нацыю.

На тэрыторыі Беларусі, і ў Мінску ў прыватнасці, існуюць аб'яднанні, таварыствы, выдавецтвы, зацікаўленыя ў друкаванні і распаўсюджванні нацыянальнай літаратуры. Пра дзейнасць адной з такіх устаноў — Грамадскае аб'яднанне "Беларускае таварыства "Кніга" — распавядае чытачам штотыднёвіка загадчык аддзела па сувязях з бібліятэкамі гэтага аб'яднання Людміла НЕСЦЯРОВІЧ.

— Людміла Васільеўна, раскажыце пра ўтварэнне і дзейнасць вашага грамадскага аб'яднання.

— У чэрвені для нас будзе вельмі значная падзея — нам спаўняецца 30 гадоў. Бо менавіта трыццаць год таму створана Рэспубліканскае добраахвотнае таварыства аматараў кнігі. Калісьці гэта была не проста ўплывовая арганізацыя (створаная ў гады татальнага кніжнага дэфіцыту), апякаемая кіраўніцтвам. Прайшло 30 гадоў, цяпер памянялася ўсё: мы ў другой дзяржаве, у абсалютна іншых умовах, сітуацыя з кнігамі прынцыпова змянілася, але, тым не менш, арганізацыя выжыла. На сённяшні дзень яна не такая ўсеабдымная, агульная колькасць таварыства — каля 2000 сяброў. Захаваны рэспубліканскі статус — на Беларусі дзейнічаюць 8 арганізацый. Таксама не памянялася адна з асноўных задач — распаўсюджванне айчыннай кнігі. Сёння мы рэальна маем дасягненні, бо, дзякуючы нашым намаганням, пэўная частка насельніцтва мае магчымасць набыцця беларускамоўнай літаратуры. Мы не толькі выдаём тое, што лічым востра неабходным, але і садзейнічаем рэалізацыі кніжак. На сённяшні дзень нацыянальная літаратура мае абмежаваны попыт і даволі складана звесці якасную кніжку і патэнцыльнага чалавека, які будзе зацікаўлены ў ёй.

— Ці ладкуеце вы творчыя сустрэчы з пісьменнікамі, выстаўкі і прэзентацыі выданняў? У якіх мерапрыемствах прымаеце ўдзел?

— Так, мы наладжваем ва ўстановах культуры, адукацыі, безумоўна, па іх запрашэнні, сустрэчы з пісьменнікамі, прэзентуем выданні, даём магчымасць набыцця без гандлёвых надбавак, што немалаважна для пэўнай часткі насельніцтва. Акрамя таго, удзельнічаем ва ўсіх святах, якія наладжваюцца і маюць, у прыватнасці, рэспубліканскі статус. Можна прыгадаць усебеларускае свята гумару ў Аўцюках, Дзень беларускага пісьменства і друку (мы былі ў Міры, Полацку, дасць Бог, пабудзем у Тураве), Купалаўскія святы ў Вязынцы, Маладзечанскія святы беларускай песні і паэзіі. Паўсюдна, дзе можам прадставіць паслугу насельніцтву па рэалізацыі айчыннай кнігі ў найбольш спрыяльных для пакупніка ўмовах. За паўтары гады правялі 200 мерапрыемстваў, і ў выніку амаль 1800 бібліятэк Беларусі рознай ведамаснай прыналежнасці маюць у сваіх фондах нашу літаратуру. Напрыклад, кожная чацвёртая з мінскіх школьных бібліятэк і кожная другая гімназія маюць нашы выданні. Але пры адсутнасці цэнтралізаванага камплектавання не ўсё так проста: набыццё кнігі — гэта магчымасць, а не абавязак.

— У вас ёсць якія-небудзь цікавыя творчыя праекты і праграмы па кнігавыданні на сённяшні дзень і на будучыню, і якое ваша стаўленне да электронных носьбітаў?

— Мы не можам дазволіць сабе выдаваць усё, што хацелася б нам, і пры такой інтэнсіўнасці, як жадалася б, таму што не маем дачынення да дзяржавы ў сэнсе таго, што не спажываем ад яе ніякія сродкі. Можа, гэта і не дрэнна. Але мы і не завязаны на нейкія канкрэтныя гранты.

Мы здзейснілі, на мой погляд, чатыры цікавых праекты. Па-першае, "Народная бібліятэка". У нас была мара, каб кнігі гэтай серыі былі ці не самыя танныя ў Беларусі. Мы дасягнулі такога аптымальнага кошту, каб крышку больш за адну тысячу рублёў можна было купіць кнігу ў 500 старонак. Гэта танней, чым пачак цыгарэт; яе можа набыць кожны: навучэнец, выкладчык і г.д. Па-другое, вырашылі выдаваць літаратуру элітарную — мініяцюрныя выданні. Іх практычна ніхто не выдае на беларускай мове: першапачаткова нявыйгрышную кніжку, неканкурэнтаздольную не з-за сваёй якасці, а з-за немагчымасць рэалізацыі. Мы вырашылі і не памыліліся. У нас выйшла дзесяць назваў кніг, і з гэтых дзесяці сёння рэальна толькі дзве можна набыць — усе астатнія разышліся, прытым, што выдаваліся накладам у 1000 асобнікаў. Для мініяцюрнага выдання гэта не такі ўжо і малы тыраж. Трэці праект — зборнік "Шчыра, як на духу..." Як ні дзіўна, такога ў рэспубліцы ніхто не выдаваў, хаця гэта даволі папулярны від літаратуры на Захадзе і ЗША — анкетаванне знакамітасцяў. Прычым пытанні разнастайныя (і філасофскія, і несур'ёзныя). Анкетаваліся 83 знакамітасці, людзі, якія ўславілі Беларусь у той ці другой галіне: спартсмены, артысты, спевакі, больш за 30 пісьменнікаў. Пабачыў ужо свет першы том, падрыхтаваны другі, у рабоце — трэці. Па-чацвёртае, справа ў тым, што выдаваць сёння беларускамоўную літаратуру і чакаць прыбытку можа толькі чалавек недасведчаны, у сэнсе — мы жывём тут і зараз, і ўвесь комплекс праблем нікуды не дзяецца. У нас стратнасць выданняў памяншаецца ўвесь час. Беларускае таварыства "Кніга" мела гонар выдаць "Доўгую дарогу дадому" В. Быкава (11тыс. экз.) Разышлася за кароткі тэрмін. На гэта выданне адгукнулася ледзь не ўся беларуская перыёдыка. Прыемна, што такія розныя газеты, як то "Советская Белоруссия" ці "Народная воля" знайшлі магчымым адзначыць гэта як факт нашай культуры, дастойна і адэкватна адлюстраваць гэтую кнігу. Можна або падзяляць погляды, ці мець супрацьлеглыя. Гэта нармальна і натуральна. Але прыемна, калі ў вызначэннях культурных здабыткаў літаратуры погляды супадаюць у тым, што належыць нам і будзе належаць і праз 30 — 50 год. Акрамя таго ў аўтарызаваным перакладзе на рускай мове выдалі тры аповесці — "Сцюжу", "Ваўчыную яму" і "Балота". Была такая дамоўленасць і так хацеў Быкаў, для тых, хто не чытае па-беларуску.

Ёсць мары пра стварэнне інфармацыйнага цэнтра беларускай кнігі. Маем праект, звязаны як з выдавецкай дзейнасцю, так і суправаджэннем рэалізацыі. Зараз модна супрацьстаўляць друкаваныя папяровыя і электронныя носьбіты. Першыя, па сутнасці, прайграюць. Але мы ж не гаворым, што каштоўнасць зборніка вершаў, напрыклад Багдановіча, вымяраецца толькі інфармацыйным зместам.

— Як у вас справа наконт супрацоўніцтва з рознымі ўстановамі, іншымі выдавецтвамі, ці канкурыруеце вы на рынку кнігадрукавання і распаўсюджвання?

— Што да партнёрства, то ў першую чаргу гэта пісьменнікі. Людзі поўнасцю самаадданыя, актыўныя, яны карэктныя, скіраваныя на культуру. Супрацоўнічаем з усімі, хто хоча супрацоўнічаць з намі: Таварыства беларускай мовы, літаратурныя музеі, ВНУ, сярэднія навучальныя ўстановы, прафесійна-тэхнічныя, бібліятэкі. І зусім незалежна ад месца знаходжання — у Мінску, райцэнтры, рабочым пасёлку.

Канкурэнцыя? З маіх назіранняў скажу, што ніколі, напрыклад, Бураўкін не будзе канкурэнтам Дранько-Майсюка — калі чалавеку цікавая беларуская паэзія, то для яго толькі ягоны густ з'яўляецца крытэрыем. Такой канкурэнцыі, як "я не буду купляць творы Караткевіча, таму што люблю выключна Т.Бондар", не сустракала. Сёння законы рынку добра паказваюць усё. Трэба, каб кожны займаўся сваёй справай, знайшоў сваю нішу. Шматварыянтнасць будзе толькі стымуляваць цікаўнасць. У параўнанне, павінны быць маленькія крамы на тваёй вуліцы і супермаркеты. Канкурэнцыя павінна быць плюсам для спажыўца. Хачу сказаць два словы пра мой любімы "Беларускі кнігазбор". Самыя, можа, кранальныя падарункі, якія робіць мне нявестка — кнігі гэтага выдавецтва. У іх свае спецыфічныя асаблівасці. "Беларускі кнігазбор" не з'яўляецца тым, што перашкаджае продажу "Народнай бібліятэкі". Мы супрацоўнічаем па рэалізацыі. Мне цікава, чаму ў нас розныя святы не суправаджаюцца продажам літаратуры?

Хачу выказаць падзяку нашаму кіраўніку, старшыні таварыства Уладзіміру Лапцёнку. Наша дзейнасць абрана правільна. Яго пазіцыя зрабіла нас такімі, якія мы ёсць сёння.

— Ці вывучаеце вы чытацкі попыт, каб вашы выданні задавальнялі іх інтарэсы?

— Так, у тым уся справа, што пры нашых умовах мы не можам памыляцца. Выдаём толькі запатрабаваную літаратуру. Напрыклад, Купалу, бо быў недахоп "Тутэйшых" і сучаснай крытыкі. Хіба можна па спарахнелых зборніках літаратурнай крытыкі 30-гадовай даўніны, калі пагляд на многія рэчы змяніўся, дапамагчы студэнту, абітурыенту, школьніку напісаць даклад ці рэферат пра актуальнасць сённяшнюю? Мы здзейснілі выданне Купалы, куды ўвайшлі не толькі тэксты, п'есы, але і публіцыстычныя артыкулы.

— Што вы можаце асабіста сказаць пра сучаснае становішча беларускай кнігі, адносіны да яе і нацыянальнае выхаванне на Беларусі?

— Я не прымаю папрокі, што няма літаратуры. Звычайна так гавора той, хто нічога не чытае. Ёсць жудасная пагроза, што колькасць тых, хто піша і хто чытае, максімальна наблізіцца. Гэта — рэальная праблема. Выходзіць, што чытае беларускія кнігі невялічкая частка людзей, якія маюць нацыянальную самасвядомасць. У нас уся сістэма так складзена, што нават інтэлігентныя людзі не вырастаюць у людзей, існуючых у нацыянальнай культуры. Трэба, каб заклік "купляйце беларускае" тычыўся не толькі вытворчасці. Давайце паглядзім праўдзе ў вочы: наша родная літаратура пішацца на мове, якая не з'яўляецца мовай штодзённага ўжытку. Першапачаткова яна патэнцыяльна звужанага попыту, пра яе ўжо мала хто скажа "матчына мова", а для многіх, асабліва моладзі, гэта — не мова дзядоў. Аб'ектыўна, гэта літаратура, напісаная на мове, якой не карыстаешся штодня. Я часта прыгадваю дзіцячых пісьменнікаў, іх творы і разважаю, чаму ніхто не гаворыць пра тое, што дашкольнікі і пачатковая школа — патэнцыяльныя чытачы — іх амаль не засталося. І калі сям'я не зацікаўлена чытаць свайму дзіцяці гэтую літаратуру, няма каму чытаць. А потым у 4 — 5-м класах ён ужо не будзе чытаць Вітку, які ў нас нездарма атрымаў прэмію Андэрсена. Вучні разумеюць, што беларуская мова і літаратура — гэта ўсяго толькі адзін з прадметаў, прычым не самы запатрабавальны. Заканчваюць ВНУ і ідуць у жыццё маладыя інтэлігенты і кіраўнікі, якія не здольны працытаваць восем радочкаў любімага беларускага пісьменніка, паэта ў прыватнасці. Звычайна, хто можа працытаваць Багдановіча, працытуе і Лорку, Баратынскага, Неруду ці каго іншага. А хто не ведае беларускага, не ведае і іншае.

Выходзяць цікавыя беларускамоўныя творы, кнігі, а мы прывучаем на тым жа тэлебачанні да другараднасці. Няўжо нельга паказваць людзей чытаючых, каб гучалі іх думкі. Хай прагучаць спрэчныя творы, хай будзе тры, чатыры думкі, але гэта будзе літаратура і толькі. Таксама нядаўна надарыўся казус, калі спадар Хрусталёў у адной з перадач сказаў прыкладна так: не змаглі мы знайсці ніякіх слядоў былога Таварыства аматараў кнігі. Нам нават з Маладзечна тэлефанавалі людзі, якія пачулі тыя словы, ім было крыўдна. Гэта гаворыць пра тое, што тэма беларускай літаратуры — рэдкая госця на нацыянальным тэлебачанні.

Я, напрыклад, не веру ў патрыятычнае выхаванне, калі яно не грунтуецца на здабытках роднай культуры. Мы хочам, каб нашы дзеці і ўнукі раслі здаровыя. Трэба спалучэнне: апякаць заняткі фізічнай культуры дзеля здароўя нацыі (гэта ніхто не можа аспрэчыць) і ў той жа час адлаведнае значэнне і пэўнае прыцягненне павінна быць і да кнігі як інструмента, які садзейнічае разумовай дасканаласці людзей, духоўнаму ўзбагачэнню.

Віктар КАВАЛЁЎ

ЗАХАРАВА, 19

РЭДАКЦЫЙНА-ВЫДАВЕЦКАЯ ЎСТАНОВА «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

прымае да разгляду:

выдавецкія праекты самай шырокай тэматыкі;

выканае ўвесь спектр рэдакцыйна-выдавецкіх паслуг;

арганізуе рэкламу і прэзентацыю выданняў.

Вул. Захарава, 19,
тэл.: 284-66-71.

Выдавецкая ліцэнзія — ЛВ № 570 ад 23 кастрычніка 2002 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Пішыце на адрас: 220005, Мінск, вул. Захарава, 19, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва";
e-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце — www.lim.by

Кнігі "Мы — беларусы", "Беларусь мая, Песня мая...", "Чарнобыльская рана" і "Чырвоная кніга для дзяцей" можна набыць у Рэдакцыйна-выдавецкай установе "Літаратура і Мастацтва". Тэлефоны аддзела маркетынгу і рэкламнай дзейнасці: 284-66-71; 284-84-62.

ВЫДАННІ

"Беларускі кнігазбор" выдаў кнігу твораў Фёдара Дастаеўскага, куды ў перакладзе на беларускую мову Андрэя Каляды ўвайшлі: "Белыя ночы", "Дзядзечкаў сон", "Прыніжаныя і зняважаныя", "Гулец". Выданне твораў славутага рускага пісьменніка, продкі якога — з Брэстчыны, безумоўна, не выпадковае. Як піша Аляксей Рагуля ў прадмове да зборніка, "проза Фёдара Дастаеўскага ў Беларусі заўсёды выклікала да сябе цікавасць і чытача, і творцаў. Пра свае "неарыгінальныя" літаратурныя сімпатыі да творчасці Ф.Дастаеўскага і Л.Талстога гаварылі неаднаразова Якуб Колас, Кузьма Чорны, Іван Мележ, Васіль Быкаў. Глыбокі аналіз псіхалогіі кожнага, нават "эпізадычнага" персанажа, спаґадлівая ўвага да "прыніжаных і зняважаных", бязлітаснае выкрыццё антыгуманістычных грамадскіх устояў і заганных бакоў чалавечай натуры — усяму гэтаму творча вучыліся беларускія пісьменнікі ў генія рускай літаратуры, які стварыў у сваіх раманах, аповесцях, апавяданнях цэлы свет, густа населены яркімі і самабытнымі характарамі, вобразамі людзей самых розных саслоўяў — свет Дастаеўскага."

Маланкаю выткаты дыванок

Шаноўнае спадарства, наша выданне намагаецца быць плюралістычным. Мы, як кажуць, даём "скрытыкаваным" аўтарам магчымасць для рэабілітацыі свайго літаратурнага гонару. У тым ліку і тым, хто не пагаджаецца з высновамі і пунктам погляду рубрыкі "Легалізацыя".

Эстэт Леанід Дранько-Майсюк вырашыў заступіцца за "пакрыўджаную" паэтку Алену Гінько. Што ж, гэты ўчынак варты сапраўднага "гжэчнага" мужчыны.

Вось толькі б не стала падобнае "заступніцтва" творчай нормай нашага сучаснага літаратурнага працэсу.

Марудна, цэлы тыдзень, я чытаў невялікую па аб'ёме кнігу вершаў Алены Гінько "Пяшчота пры журбе" і, пэўна ж, яшчэ і гэтая разумная павольнасць чытання дапамагла мне ўспрыняць паэзію спадарыні Гінько, як цікавую мастацкую прастору.

Дарэчы кажучы, мы развучыліся чытаць разважліва, непаспешліва, ўдумліва, і таму нам цяжка іншы раз творча засвоіць сапраўднасць тэксту.

Пры ролікавай хуткасці чытання часам жывое бачыцца мёртвым, святочнае будзённым, незвычайнае банальным...

У кнізе "Пяшчота пры журбе" ёсць радкі, якія імгненна запамінаюцца:

Не ведаю большай красы,
чым тая,
што роднай завецца...
("Бацькаўшчына")

Ёсць, без перабольшання, прамаўленні купалаўскай вышыні:

Ці будзем век правінцыялы?
Цурацца роднае зямлі?
Чужыя славіць ідэалы?..
Калі ж абудзімся, калі?!
("Не тая сёння
ў нас Айчына...")

Сапраўды, нават па рытме гэта купалаўскае гучанне, купалаўскі балючы змест.

Згадаем словы Незнаёмага са знакамітай драматычнай паэмы песняра "На папасе":

Йдуць песні,
казкі ў дамавіну,
Якія дзед спяваў, складаў;
Свае жалейкі
люд закінуў, —
Чужым свісцёлкам
месца даў...

Гэта тое характэрнае суголоссе, якое выразна сведчыць пра Алену Гінько, як пра таленавітую спадчынніцу класікі...

Пісьму нашай паэткі ўласціва і запамінальная метафарычная дакладнасць.

Так у вершы "Мая мова" з сацыяльна-гістарычнай правільнасцю і непазбыўнай злабадзённасцю літаральна выдыхнута, што беларуская мова — "...палыновага лёсу сястра".

І сапраўды ж так.

А ў мініяцюры "Ляцець высока..." ёсць усё — і беларуская мудрасць, і заходняя безвыходнасць, і ўсходняя ціхамірнасць.

Зайздроснае спалучэнне!

Няхай чытачы штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва" прачытаюць гэты верш цалкам:

Ляцець высока —
упасці нізка,
глядзець далёка —
убачыць зблізку.
Упасці —
і не падняцца,
убачыць —
расчаравацца.
Што лепей:
жаўрук?
сініца?
памерці ці нарадзіцца?

А якое яно дзівоснае, як маланкаю выткаты дыванок, наступнае псіхалагічнае назіранне-папярэджанне:

Ты рабіны не руш
і вярбы не чапай —
тут мой край,
дзе мой сад, дзе мой гай.

Тут матуля жыла,
я шчаслівай была,
тут застаўся дзяцінства рай.

...Па-над берагам
шэра птушачка
завяла пераліўны жаль,
завярэдзіла
маю душачку,
а сама паляцела ўдаль.

У дамінантным творы "Пяшчота пры журбе" (ягоная назва і стала назваю кнігі), у прызнанні "Я думала душой...", а таксама ў шэрагу іншых пранікнёных прызнаннях — тэма кахання роднасная тэме адсутнасці шчасця.

Каханне, якое не адпавядае шчасцю, — яно было, ёсць і будзе!

І кожны творца пра такое каханне будзе складаць свае элегічныя песні.

І слухаючы іх, знаёмячыся з імі ў рэжыме хуткаслухання, хуткачытання можна не звярнуць увагу на значнае, сутнаснае і памылкова прамовіць: "...невядомая паэтка... нічога мне невядомага не адкрыла..."

Так і зрабіў паэт Леанід Галубовіч у дачыненні да паэзіі Алены Гінько ("ЛіМ" № 3, 16 студзеня 2004).

Каб аўтар "Зацемак з левай кішэні" меў час на дэталёвае знаёмства з кнігай "Пяшчота пры журбе", то абвязкова заключыў бы: "Паэтка Алена Гінько адкрыла мне невядомае, новае..."

Менавіта новае.

І ў якасці доказу сярод іншага працытаваў бы:

Знясіленасць зрэштаю сілы,
Зняважанасць
зрэштай асобы...
Такое вам даспадобы?
("Мне смешна,
я смяюся...")

Леанід Дранько-МАЙСЮК

5 красавіка 2004

Букет жыццейскай мудрасці

Прыемна, калі ў рукі трапляе цікавая, жыццёва важная, талковая кніжка, якая можа ўзварушыць, азадачыць, павесяліць, засмуціць, скіраваць на роздум, прымусіць сціснуць кулакі ці ўзрушыцца да горкай або салодкай слязы. Менавіта гэтак уздзейнічае, выдадзеная ў 2003-м годзе выдавецтвам "Мастацкая літаратура" кніжка Навума Цыпіса "Иду и возвращаюсь". Складаецца яна з дзвюх аповесцей: аднайменнай з назваю кнігі "Іду і вяртаюся" і "Хабза" (запіскі настаўніка). Абедзве аповесці аўтабіяграфічныя, але ў гэтым аўтабіяграфізме сапраўднае рэальнае і рэалістычнае жыццё любімай яму Вінніцы і вінніцкага Замосця. "Хабза" ж , можна сказаць, — люстраны адбітак жыцця, вучобы, працы навучэнцаў і настаўнікаў аднаго з Мінскіх вучылішчаў ФЗН. Аповед сапраўды вядзецца ў "жорсткіх дакументальных запісках настаўніка", як і засведчана ў анатацыі да кнігі. Па сутнасці, пад адной вокладкай ужыліся дзве самастойныя кніжкі, якія варта выдаць і паасобна, як актуальныя і патрэбныя ў выхаваўчым працэсе.

Аповесць "Іду і вяртаюся" — гэта песня ва ўспамінах пра складаны перыяд пасляваеннага жыцця вінніцкага Замосця і яго насельнікаў. Пачынаецца яна ўпэўненым сцвярджэннем: "У кожнага чалавека ёсць на зямлі месца, дзе ён нарадзіўся. Галоўная ў жыцці вуліца... Галоўны ў жыцці дом". Далей праз усю аповесць высвечваюцца гэтыя галоўнасці для кожнага замасцянца. А іх, самых разнастайных, адмысловых, прыкметных і непрыкметных, адметных характарам, рысамі характару, знешнасцю, звычкамі, учынкамі, паводзінамі і іншымі прыкметамі і схільнасцямі ў аповесці столькі, што складаецца ўражанне пра цэласны, інтэрнацыянальны асяродак замасцянскага жыхарства.

У творы арганічна і дружалюбна ўжываецца ўкраінскае, яўрэйскае, рускае... Дасведчана выяўляюцца нацыянальныя асаблівасці герояў, падкрэслена высвечваюцца характары як, напрыклад, з украінскай сям'і Кілімчукоў цётка Маруся, якая пра жанчын Замосця з другога канца Стандаркі гаворыць: "Ой, лышэнько! Ну і бабы там — у ступи нэ влучыш. Таку вэрэмию вкруг мэнэ зробылы, сэмэро на одну. Алэ всэ-такы зйилы — видбрехалась, щей як! Дала я по ных так, що гайнулы разом з гракамы хто куды!" І аўтарскае пра яе: "Сварыцца ўмела унікальна — сакавіта, вынаходліва і так гучна, што па вуліцы гнуліся". Яе мужык дзядзька Сярожа не менш каларытная фігура, бо наўрад ці бачыў яго хто цвярозым, як і іхні сын Пецька Кілімчук, які 9 гадоў вучыўся завочна ў маскоўскім аўтамабільным інстытуце і, такім чынам, меў магчымасць 2 разы на год "пускаць хвалю па Маскве". Яго ж сястра Танька была "украинский соловийко".

Аповесць густа населена асобамі рознага ўзросту, паходжання і становішча. Аўтар удала карыстаецца прыёмам успамінаў асабістых і сваіх герояў у 18-ці раздзелах. Усе яны змястоўныя, цікавыя сваімі героямі, жыццёвымі калізіямі, гумарам, афарызмамі, думкамі герояў і аўтарскімі. Вось некаторыя з іх: "Сумленне — гэта глядач з боку сцэны; Людзі, як студні, таксама маюць дно; Памяць можа памыляцца, пачуццё — ніколі; Чэснасць — гэта здароўе душы; Так, перамога чалавека над чалавекам — гэта проста перамога, а перамога чалавека над сабою — гэта трыумф".

Пісьменнік знайшоў свой стыль, мелодыку, фарбы і нават пластыку дзейных асоб, што і вызначае высокі мастацкі ўзровень аповесці.

Галоўным героем твора з'яўляецца бабуля аўтара — Бася Шулемаўна. Яе вобраз высвечаны ў аповесці з усіх бакоў. Вось адзін з іх: "Матэрыяльна Бабуля была бедная, фізічна нямоглая, затое каля душы яе — вось дзе захоўваліся мільёны"! — абагравалася ўсё Замосце. Тут ужо яна магла і рабіла". З любоўю аўтар паказвае розум, знаходлівасць, памяркоўнасць, далікатнасць і іншыя каштоўнасці яе душы. Яна ўжывалася з усімі, дапамагала ў цяжкіх абставінах і слабаму, і моцнаму. Асабліва ярка вобраз бабулі высвечваецца ў раздзелах, якія прысвечаны ёй. Гэта: бабуля і Вінніцкія вяселлі; бабуля і звар'яцелая цётка Вера; бабуля і начальнік Вінніцкай чыгункі; бабуля і сямейныя здрады...

У аповесці шмат роздумна-спавядальнага. Гэта думкі і развагі пра сумленне, нахабнасць і іншыя моцныя і слабыя бакі людскога характару.

Праўда, захопленасць аўтара ўспамінамі часам прыводзіць да пэўнага перабору, як у развагах пра амерыканскія штаты. Пісьменнік умее і любіць смакаваць мастацкую дэталь як, скажам, амерыканскія штаны, хлеў дзядзькі Пеці, у якім чаго толькі няма і "...калі б чалавецтва раптам апынулася на незаселеным востраве, яно зусім паспяхова магло б пачаць новы шлях да вяршынь цывілізацыі і тэхнічнага прагрэсу з хлява дзядзькі Пеці". У канву твора арганічна ўплятаецца характэрная лексіка гумарыстычнага накірунку, напрыклад, "пераведаць бацьку прыехала яго дачка і выратавальніца Танька — "украинский соловийко". Яе маці, цётка Маруся замест звычайнага: "Ой лышенько! Ой любочка! Ой дитятко мое!" — грымнула на ўсю Ленінградскую:

— Танька! Батько знов пье!

І тут дачка, сусветная вядомасць, у парыве праведнага гневу, забыўшыся на ўсе свае тытулы і манеры каралеўскіх прыёмаў, знакамітым голасам на ўсю вуліцу адказала:

— Батько! Як здохнэтэ, ховаты нэ буду!

Дзядзька Сярожа так і адказаў, седзячы тварам да нашай калонкі, — адказаў ціха, але яго чула ўся лаўка. (Дай божа Гегелю і Феербаху так адказаць!).

— Доню... Як я здохну, то можэш на моий сраци дрова рубаты.

Лаўка ацаніла адказ. Нават Танька ўсміхнулася.

На перамовы для замірэння цётка Маруся кліча Яшку.

— Я-а-шо! Я-а-шо! Яшечко! — моцна, нізка, меладычна выпявала яна жывую заклікальную інтанацыю... але безвынікова. За справу ўзялася цётка Моця.

Хіба його так клычуць? Ты ж його як людыну клычеш, а вин же ж холер з трясцею та чесоткою разом! Дывісь, як його клычуть, — і яна раўнула на ўсё замосце: — Я-ашко! Йдыно сюды, злодий! Щось дам!

Яшка з'явіўся, як чорт з табакеркі. Увесь — чаканне, гатоўнасць ухапіць гэта самае "щось" і гэтак жа імгненна знікнуць.

— Сядь, Яшечко... — солодка сказала цётка Маруся.

— Щоб тэбэ посадыло! — дадала цётка Моця.

— А што вы мне дадите? — запытаўся Яшка. — Давайте!

— Послухай, що мы тобі скажэмо...

— А когда дадите?

— Дамо, дамо... Послухай впэрэд, болячка у ступи, що тоби люды скажуть! — "грымнула" цётка Моця".

Аўтарскіх удач у гэтай аповесці шмат. Навум Цыпіс дасягае запланаванай мэты — ускалыхнуць душу чытача ўспамінам пра сваё далёкае і дарагое. У творы, заўважым мякка кажучы, шмат ненарматыўнай лексікі. Там-сям сітуацыя дазваляла абысціся і без гэтага...

На старонках "Хабзы" змешчана больш як 120 запісак настаўніка, як назваў іх аўтар. Фактычна — гэта адмысловы букет, сабраны з формаў малой прозы. Сярод іх апавяданні, навелы, мініяцюры, нарысы, эцюды, замалёўкі, фрагменты запісак... Паабяцаўшы расказаць толькі тое, што ведае, аўтар энергічна распачынае свой аповед. Адштурхнуўшыся ад эйзенштэйнаўскага "мурашка буйным планам стварае ўражанне больш страшнае, чым статак слоноў агульным планам", аўтар апелюе да сістэмы нашай адукацыі, выхавання і навучання. Кожная з жыццёвых рэалій, праблем і здарэнняў уяўляецца кадрам агульнай карціны нашай сучаснай адукацыйнай сістэмы. Цяжка кладуцца на душу гэтыя рэальныя кадры. Прачытаўшы "Хабзу", разумееш, чаму настаўнік, адпрацаваўшы 27 гадоў у вучылішчы ФЗН, шкадуе сябе, хоць і стаў сапраўдным настаўнікам.

"Хабза" падаецца як бы ў жанры нарыса. Тут выразна адчуваецца гарманічная спалучанасць журналісцкай вопытнасці і пісьменніцкага таленту. Амаль усе творы напоўненыя страшнаватай статыстыкай. "Эгаізм, раўнадушша, адсутнасць суперажывання, — гэта я назіраю ў вучылішчы", — піша аўтар. Яго хвалюе "масавае пахаванне маральнасці" і тое, што адбываецца з навучэнцамі. "Вучылішча ж — гэта "кропелька", якая ўжо шмат гадоў ляжыць на шкельцы майго мікраскопа. А сама "балея", адкуль узята гэта "кропелька", — вось яна шуміць за вакном: краіна, народ".

Кніжка "Я іду і вяртаюся" — бясспрэчны поспех аўтара. Пажадаем яму творчых удач і надалей. Талент і вопыт ягонага жыцця на тое паказваюць.

Яўген АДАМОВІЧ

Моцная ці слабая?

Ішло абмеркаванне адной работы. І думалася, што ўдзельнікі здолеюць у выніку прыйсці да канструктыўных, важных для нашай літаратуры, высноў.

На жаль, не спраўдзілася. Гэта ўдвая прыкра таму, што тэма бачылася актуальнай. У рабоце, як настойваў даследчык, па-новаму інтэрпрэтавалася сітуацыя са змяншэннем цікаўнасці чытачоў да беларускай кнігі. І такая інтэрпрэтацыя, калі яму верыць, магла не проста паглыбіць разуменне падзей, але і паспрыяла б выпрацоўцы мер, скіраваных на аздараўленне атмасферы і пераадоленне застойных тэндэнцый у літаратурным развіцці.

Перспектыва, пагодзімся, звышінтрыгуючая, таму ад абмеркавання чакалася многага — аднак гаворкі не адбылося, яна не сталася канструктыўнай. Апанент (а дыспут праходзіў у акадэмічнай установе, і атрыбутыка была адпаведная) выйшаў да трыбуны, пацвердзіў, што прачытаў прапанаваную яго ўвазе манаграфію, сцісла пераказаў вузлавыя моманты. Прызнаўшы напрыканцы, што даследчыцкая версія, закліканая патлумачыць узнікненне чытацкай антыпатыі да кнігі, выглядае лагічнай і недзе нават пераканаўчай.

Так што, на думку апанента, работа заслугоўвае ўвагі, але выключна як манаграфія, звязаная з асэнсаваннем абстрактнай, з рэальным жыццём абсалютна не суаднесенай, літаратурнай мадэлі. Бо наўрад ці пастулаты, распрацаваныя даследчыкам, прыдадуцца пры асэнсаванні жывых рэалій нашай, беларускай, літаратуры.

Вось так, у нейкім пазбаўленым рэальнага напаўнення асяродку працэс будзе развівацца, прынцыпова такое не выключана, але на Беларусі ўся гэтая тэарэтычная верагоднасць спраўдзіцца не здолее — цікавае, ці не праўда, заключэнне? А чаму не здолее? Ды таму, што на Беларусі, як абвясціў апанент, ніякага крызісу не існуе. Паколькі ж так, паколькі крызісу няма — адкуль возьмуцца дадзенага крызісу прычыны, дадзеных прычын проста не можа існаваць!

На гэтым, уласна, абмеркаванне і завяршылася: работу прызналі эксперыментальнай, зацыкленай на аналізе міфічнага, "як яно аморфна здолее адбыцца", літаратурнага збою. Адказу на пытанне "А чаму такі, прынцыпова дапушчальны, збой ніколі не рэалізуецца ў тым ліку на Беларусі, у нашых умовах?" шукаць ніхто не стаў. Але не ў гэтым нават справа (Бог з ёю, з безвыніковасцю чарговага акадэмічнага абмеркавання, колькі раз падобнае ўжо было), занепакоіла іншае: аналагічна, з падобнай жа, блізкай да нулявой, прадуктыўнасцю завяршаюцца ці не ўсе размовы, распачатыя дзеля ўдакладнення дыягназу беларускай літаратурнай хваробы.

Выпрацаваўся нават устойлівы алгарытм такіх дыскусій, які вызначаецца прадвырашанай, загадзя прагназуемай безвыніковасцю. Вось глядзім: дыскусія правакуецца нейкім публіцыстычным, палемічна завостраным, артыкулам, аўтар якога прапануе сваё бачанне перадумоў і дзейсных прычын незайздроснасці стану, у якім апынулася сёння беларуская літаратура.

З'яўленне артыкула выклікае шырокі рэзананс, у рэдакцыю ідуць ліставанні, у якіх адны салідарызуюцца з палемікай і пагаджаюцца, што нешта ў нашай літаратуры не так, другія ж выказваюць абурэнне з нагоды самога надрукавання публікацыі, дзе ганяцца дасягненні, перакрэсліваюцца ўсе здабыткі беларускай літаратуры.

На дадзеным этапе міжволі адбываецца пераакцэнтацыя размоў, надалей замест абмеркавання прычын узнікнення крызісу ўсе ўладжана кідаюцца высвятляць зусім іншае, асабліва калі аргументы вышукваюцца на суб'ектыўным узроўні, "мне асабіста падаецца, што крызіс праяўлены" і "а вось я перакананы, што ніякага збою не існуе, наша літаратура наадварот, квітнее і мацнее".

Абмен меркаваннямі тыпу "мне так падаецца" да канструктыўных высноў дыскусію не прывядзе. Між тым менавіта на такі шлях збочваюць (а таму і завяршаюцца канфузлівым пшыкам) абмеркаванні, аналагічныя што палеміцы вакол "Ружовага туману" С. Дубаўца, што дыскусіі "па Курэйчыку" на старонках "Советской Белоруссии", што акадэмічнаму дыспуту, узгаданаму на пачатку артыкула.

Напрошваецца наступнае: а што, калі перавесці размову ў сферы больш канструктыўныя, насыціць тэрмін "моцная літаратура" (ці "слабая літаратура") калі не матэрыяльнай, дык атрыбутыўнай, прынцыпова падлеглай фіксацыі, асязальнасцю? Досыць прадуктыўным крокам у дадзеным накірунку ўяўляецца пошук параўнанняў.

Давайце ўзгадаем стасункі ў нейкім абстрактным ландшафтным асяродку, складзеным з некалькіх сузалежных адна ад адной біясістэм, і зробім дапушчэнне, што адной з такіх сістэм выступае літаратура. Яе ў дадзеным кантэксце варта інтэрпрэтаваць як субстанцыю, кампанентамі якой выступаюць не толькі ўласна творы, але і творцы, іх памкненні і спадзяванні, а таксама дзейнасць усіх далучаных да літаратурнага працэсу асоб.

Не выклікае праблем і вылучэнне "біясістэм", вымушаных існаваць у межах адной з Літаратураю біясферы. Літаратура, як вядома, функцыянуе не ў вакууме, яна мноствам вузлоў павязаная з Грамадствам, з Дзяржаваю, з Навукаю і Мастацтвам і інш.

У падобных, далёка не заўсёды бесканфліктных, асяродках моцная сістэма проста вымушана будзе вызначацца актыўна-наступальнай прыстасавальнасцю. Моцны тып паводзін абернецца тут як здольнасць перацярпець нават з выгляду невыносныя неспрыяльныя ўплывы звонку, так і уменне, прадпрыняць дзейсныя захады з мэтай відазмянення сітуацыі, пераадолення і нават ліквідацыі найбольш негатыўных знешніх уціскаў.

З гэтага пункту гледжання літаратура выступае моцнай біясістэмай. Яна не толькі прыстасоўваецца, але і заўсёды імкнецца аздаравіць асяродак, перапыніць найбольш неспрыяльныя для сябе вонкавыя ўплывы і валодае велізарным патэнцыялам уздзеяння на навакольны свет.

Але наш "супраціў" у лепшым выпадку абмяжоўваецца скаргамі ды пратэстамі, у горшым — спадзяваннямі на прыход іншых, больш спрыяльных, умоў. Мэтанакіраванай і ўзгодненай работы па падрыхтоўцы, выпрацоўцы прымальных для сябе ўмоў беларуская літаратура амаль не вядзе.

У сувязі з гэтым цалкам рацыяналістычна паводзяць сябе і "суседзі" па ландшафтным асяродку. Бо як толькі заўсёднае памкненне пэўных сістэм (найперш Дзяржавы) "падціснуць" апанента перастае сустракаць рашучае, вартае павагі супраціўленне, традыцыйны "ўзброены нейтралітэт" адразу і лагічна пераўтвараецца ў агрэсіўны націск больш моцнага з бакоў.

Трэба сказаць, у асноўным, за адзінкавымі выключэннямі, беларуская літаратура нагадвае сёння баксёра, які пад націскам больш вопытнага і спрактыкаванага саперніка, патрапіў у куток між канатамі і там стаіць, чакаючы перадыху ці выратавальнага сігналу гонга. Мы дэманструем зайздроснае ўменне трымаць удары, што сыплюцца з усіх бакоў (бо імкнуцца куснуць літаратараў і літаратуру ледзь не ўсе, ад навукоўцаў ці тэатральных рэжысёраў, якім, маўляў, няма чаго аналізаваць ці ставіць на сцэнах, і да малаадукаванага, "пяць класаў ды калідор", чытача, якому, бачыце, нават пагартаць няма чаго), мы не падаем, мы капітуляваць не збіраемся — але ж і захадаў па падрыхтоўцы рашучай контратакі, закліканай памяняць становішча на рынзе, нешта не відно. Мы не перамагчы намагаемся, а ўсяго толькі выстаяць, а гэта тып паводзін слабы, ніяк не моцны.

Праўда, у арсенале апалагетаў версіі пра нескажонае, пазбаўленае прыкмет крызіснасці, развіццё беларускай літаратуры заўсёды застаецца аргумент: усе беды нашых пісьменнікаў, маўляў, ідуць ад непрачытанасці іх твораў. А не чытаюць, бо мовы не ведаюць, моўны бар'ер пераадолець няздольныя. Пры такой пастаноўцы пытання не пісьменнікі ўжо атрымліваюцца вінаватымі, а чытачы, лянота і інерцыя нашай нацыянальнай аўдыторыі.

З выгляду тлумачэнне падаецца бездакорным, яно нібыта пакідае надзвычай зручную магчымасць шчыра верыць у тое, што ў патэнцыяле моцная літаратура гібее толькі з тае нагоды, што яе ўпэўнены і сакавіты голас не даходзіць да ўспрымальнікаў, што літаратуру проста як след не чуюць — але ж не становіцца паратункам і пераклад беларускіх кніг на расійскую ці на якія іншыя мовы, тое, што не чытаюць па-беларуску, звычайна адмаўляюцца браць і ў версіях іншамоўных, перакладных.

У нас яўна пераважаюць ныццё і нараканні, мы зноў жа рэфлексуем па слабым тыпе паводзін, і гэта пры тым, што літаратура ў патэнцыяле мае зброю (напісанне добрых, сапраўды захапляльных твораў, якія захочацца чытаць кожнаму), выкарыстанне якой дазволіць відазмяніць сітуацыю!

Так што выснова напрошваецца адназначная: **мы выжываем па слабым тыпе прыстасавальніцтва, між тым як па норме літаратура павінна паводзіць сябе як моцная, у добрым сэнсе агрэсіўная, біясістэма.** І змена стэрэатыпу паводзін — выразная прыкмета захворвання. Высновы, падказаныя параўнаннем — гэта ўсяго першы крок у напрамку высвятлення фундаментальнага пытання пра наяўнасць альбо адсутнасць прыкмет крызісу на Беларусі. І высвятленне дадзенага аспекту ёсць задача першачарговая, сёння няяснасць у пытанні "Дык маем альбо не маем праявы хваравітасці?" выступае перашкодай памкненням зразумець першапрычыны застойных тэндэнцый. І гэтую перашкоду неабходна прыбіраць.

Міхась Лапата-ЗАГОРСКІ

За турэмнай сцяной

Нічога дзіўнага ў тым няма, што многіх жыхароў Гродна і гасцей Прынёманскага краю цікавіць гісторыя Гродзенскай турмы. Відаць, тыя з гродзенцаў, хто часцяком праходзіць побач з высокай сцяной, уяўляюць, што знаходзіцца там — за гэтымі цаглянымі мурамі. Раней сярод гродзенцаў існавалі, жывуць нават і зараз, пэўныя міфы і загадкі пра гэтую спецыфічную ўстанову. Пэўна, гэтыя абставіны падштурхнулі Вячаслава Лісіцына ўзяцца за пяро, каб прыадчыніць некаторыя таямніцы Гродзенскай турмы для шырокага кола чытачоў.

Кніга ахоплівае перыяд з пачатку XIX стагоддзя аж да 1939 года. Кніга складаецца з чатырох главаў, кожная з якіх прысвечана пэўнаму храналагічнаму перыяду гісторыі Гродзенскай турмы. Выключэнне складае першая глава, у якой падаецца працэс стварэння на тэрыторыі езуіцкага калегіума турэмнага архітэктурнага комплексу з пачатку XIX стагоддзя да 1915 года. Менавіта да гэтага часу было ў асноўным практычна завершана яго фарміраванне і турэмная планіроўка прыняла амаль сучасны архітэктурны выгляд.

Наступная глава ахоплівае гісторыю турмы з пачатку XIX стагоддзя да 1861 года. Гэты храналагічны адрэзак выбраны невыпадкова, бо звязаны з адменай прыгоннага права ў Расіі і пачаткам усталявання на тэрыторыі Прынёманскага краю новых эканамічных і сацыяльна-прававых адносін. Менавіта ў гэты перыяд на тэрыторыі Гродзенскай губерні ва ўсіх павятовых гарадах былі пабудаваны турмы і створана сістэма выканання пакаранняў.

Трэцяя глава ахоплівае перыяд з 1861-га па 1915 год. Гэта быў складаны час у гісторыі Гродзеншчыны. Бурныя і часам трагічныя падзеі гэтага перыяду паскорылі канчатковае фарміраванне карнага механізму, які працаваў з высокай нагрузкай. Роля Гродзенскай турмы ва усёй карнай сістэме губерні была далёка не апошняй, бо ў гэты час яна становіцца самай вялікай і жорсткай не толькі ў краі, але і ў Віленскай акрузе.

Такой установай турма заставалася і ў перыяд знаходжання Гродні ў складзе Польшчы. Гэтаму 20-гадоваму перыяду турмы прысвечана чацвёртая глава. Нягледзячы на кароткі час у гісторыі Гродзеншчыны ён пакінуў свой прыкметны след. Роля Гродзенскай турмы ў сістэме пенітэнцыярных устаноў Польшчы была вельмі прыкметнай, бо яна заставалася адной з самых вялікіх і жорсткіх у дзяржаве.

Нягледзячы на недахопы, якія маюцца ў рабоце Вячаслава Лісіцына, аўтар, на грунце вялікага практычнага вопыту працы ў падобных установах, сустрэч з людзьмі, якія парушылі Закон, палічыў мэтазгодным выказаць сваё бачанне праблем пенітэнцыярнай сістэмы. На сёння, з усіх турмаў, якія дзейнічалі ў Прынёманскім краі, засталася толькі Гродзенская турма, і з гэтай прычыны інтарэс да гісторыі гэтай установы толькі павялічваецца. Гісторыя Гродзенскай турмы зацікавіць усіх, хто неабыякава ставіцца да гісторыі Прынёманскага краю.

Георгій СЫСОЙ



Віктар ШНІП

* * *

У высокіх бяздонных
нябёсах,
Дзе святло,
як у маміных слёзах
Наша вечнасць
і наша імгненне,
Нашы зоры і нашыя цені.
І глядзім мы ў нябёсы
і знаем,
Што ў нябёсы,
як сон, адлятаем,
Але й тут застаемся,
як слёзы,
Як лісцё беларускай бярозы
Ля дарогі з Масквы
да Варшавы,
Дзе шумяць
пажаўцелыя травы
І губляюцца ў пыле і дыме,
І ты думаеш не аб Радзіме
Ды і не аб бяздонных
нябёсах,
Дзе святло,
як у маміных слёзах...
Ты ідзеш да царквы,
каб маліцца,
Каб душою з нябёсамі зліцца
За самотныя маміны слёзы,
Што бяздонныя,
нібы нябёсы...

БАЛАДА ВАСІЛЯ САХАРЧУКА

Цябе няма, але ты ёсць —
адсутны
На час, які ўжо знаеш
толькі ты.
Цяпер ты пэўны:
ісціна і сутнасць —
Як у віне, у свеце нематы,
З якога
не вяртаюцца дадому,
Каб расказаць,
дзе быў і што рабіў,
Каб зразумелым стала
тут любому,
Што ты жыццё,
не больш віна, любіў.
Цябе няма, як нас
няма ў тым свеце,
Якога мы не ведаем яшчэ.
Ты светам стаў,
які самотна свеціць
У ціхае слязіне на шчацэ
У той адной,
што сёння зразумела —
Цябе няма
і ўжо не будзе тут,
Дзе пад крыжом тваё,
як кокан, цела
Ляжыць, не помнячы
зямных пакут,
З якіх душа ляпілася,
як з гліны
Нябачнае
нябачны той сасуд,
З якога п'е жыццё
і сэнс Айчына
І кожнаму дае
для шчасця кут...
Цябе няма
і хутка нас не будзе
На час,
якога мы не знаем тут.
Не будзе нас,
нібы віна ў сасудзе,
І будзе свет,
як без віна сасуд...

* * *

Нібы апошні снег
пасля зімы,
Чужыя,
адзінокія дамы
Бялеюцца сярод
счарнелых дрэў.
І хочацца адгэтуль уцякаць,
Нібы сябе
з магілы даставаць,
Не веручы,
што ты даўно сатлеў.

А можа, гэта ўсё
пракляты сон
І ўжо не першы раз
мне сніцца ён
Пад небам хмарным,
дзе жыццё, як снег,
Ляціць пад ногі
смерці і плыве
У шуме дрэў,
у маладой траве
За намі ўслед,
як першародны грэх.

І я зайдуся ў белыя дамы,
Як нож у цела
стомленай зімы,
І не схачу нікуды я ўцякаць,
Бо тут мой плач,
бо тут мае сябры,
Самотныя, як гэтыя муры,
Дзе нашы душы,
бы ў турме, сядзяць...

БАЛАДА СКРЫПАЧКІ

Дзяўчына на скрыпцы
іграла,
Нібыта з Хрыстом
размаўляла,
Нібыта агнём частавала...

Самота ў агні бушавала,
Яе, каб памерці — хапала...
І вены, як струны, парваны,
Вада вылівалася з ванны,
Як кроў з пачарнелае раны...

І плакала скрыпка і маці,
І людзі, як цені, у хаце,
І сонца крывёй, як у ваце,
У хмарах,
шапталі аб страце...
І ты быў ва ўсім вінаваты,
І бег ты ад чорнае хаты
Па вуліцах, як па пустэчы,
І воран садзіўся на плечы
Табе і з цябе вылятала
Душа,
што з Хрыстом размаўляла
У час,
як на скрыпцы іграла
Дзяўчына,
якая кахала...

ПІРАЦКАЯ БАЛАДА

Няма даўно на караблі
Ні маракоў, ні капітана.
І не даплыць нам да зямлі,
І паміраць яшчэ нам рана,
Бо залатое ў нас руно,
Як наша смерць,
пыліцца ў скрыні.
Яшчэ ў біклагах ёсць віно,
Нібы аазіс у пустыні,
І мы, як прывіды, плывём
Праз туманы,
праз вецер, хмары.
Марской вадою, як агнём,
У нас апаленыя твары.
Нам вочы сонныя, як лёд,
Спакойна сонца раз'ядае.
Па ланцугах здзічэлы кот,
Як мы, сам па сабе гуляе.
І не ўратуе нас руно,
Якое болей нам не трэба,
Бо неба,
як марское дно,
І дно марское, быццам неба...

Яўген БАРТНІЦКІ

(Сурыновіч Сяргей Уладзіміравіч)
Нарадзіўся ў 1976 годзе на Гродзеншчыне. Напачатку вучыўся ў Гродзенскай духоўнай семінарыі, потым лёс склаўся так, што стаў навучэнцам Пецярбургскай духоўнай семінарыі, паспяхова яе скончыў, абараніў працу па багаслоўі ў Лютэранскім універсітэце ў Рыме, застаўся служыць Богу ў Расіі. Працаваў у Пермі, зараз працуе ў Калінінградзе (прыход Святой Сям'і).

* * *

Зноў сумуеш, сябра мілы мой:
Вочы апусціў — і твар журыцца.
Кружыць свет нясталасцю сваёй —
І няма табе дзе прыхіліцца.
Колькі ты прайшоў ужо дарог,
Колькі страціў сіл, і колькі планаў
Лёс змяніць, бы чараўнік той, змог,
Колькі здрад спаткаў ты
і падманаў.
Так жадаў ты шчасце даганяць:
Бегчы, крочыць — тое ж уцякае.
Крыж з плячэй хацелася так зняць,
Сэрца ж кажа: Бог цябе чакае.
Нас чакаюць! Дай сваю далонь —
Разам пойдзем віхрам на сустрэчу.
Што нам дождж,
і што для нас агонь —
З Богам пераможам страх, пустэчу.

* * *

Я дзедзіч неба
Асушка хлеба,
Вясковай мовы,
Каня падковы,
Брыля з саломы,
Уласнай стомы;
Васпан вадзіцы,
Зары святліцы,
Красы палеткаў,
Вясенніх кветкаў,
Дажджу часіны,
Лістка асіны;
Я спадкаемца
Ў стажочку сенца
Блакітных росаў,
Чаканых вёснаў,
Маёй адзінай
Зямлі радзімай

* * *

Зайшоў ужо над рэчкаю
Круг сонца залаты,
І шэпчуць казку даўніх дзён
У жоўцені лісты.
Далёкі голас чутны стаў
Далёкі чутны спеў,
Калыша на траве расу
Лагоднасці павеў.
Казыча промень ночы дол,
Трывожыць сон лясоў,
А пах мядовы траў сухіх
Завіс вакол палёў.
У водары цвітучых зёл
І цьмяных зор балад
Паэзіяй пячэ душу
Радзімы далягляд.
Паўцень зямліцу ахінуў,
Настаў час дзіўных мар,
На фарбы дня махнаты цень
Сцягнуў сівізну хмар.
Раскінуў крылы скрозь свае,
Як свету бы знарок,
Спяшыць зашыць ад дня сляды,
Каб заўладарыў змрок.

КАЛЫХАНКА

Пішчыць закінуты асвер,
Там-сям пуклее брукаванка.
Знямеў ваколіцы бязмер —
Струхлела старасцю альтанка.
Апараніўся ў хату цень,
Трашчыць на топалі буслянка.
Ссівеў ад стомы летні дзень —
Ляціць з ваколіц калыханка.
На небе чырвань. Санцапад,
Гарыць нябёсаў вышыванка.
Дабранач —
шэпча сонны сад —
Бывай мой край.
Пакуль.
Да ранку.

ВОСЬ ТОЛЬКІ ДУМКІ АБ ВЯСНЕ...

І сніцца мне лісток асіны,
Таполі лісце залатой.
І сняцца
ў чырвані рабіны
Уздоўж сцяжынкі паласой,
Якою бегаў да крыніцы,
Нагой ступаў у глыб вады
І чуў як казкі,
таямніцы
Шапталі мне палі, сады...
Як вербы, бачыў, мылі косы
І ветру шэлест чуў і гам,
Я чуў,
як плачуць ранкам росы
На павітанне сонным дням.
І сніцца мне лісток асіны,
Радзімы восень сніцца мне —
Дажджоў халодных
валасіны,
Вось толькі думкі аб вясне...

Серафіма БЕСТАВА

У ВЯНОК СВЕТЛАЙ ПАМЯЦІ МАТУЛІ

Прыпаду на жвір халодны
Слёзна, у адчаі.
Мамачка, матуля родна,
Што ж ты не страчаеш?
Над табой расце бярозка,
Уецца матылёк,
Ты раней бы кожну слёзку
Сцерла з маіх шчок.
Над табою флоксаў квецень,
Ветрыка павеў.
Так як ты, ніхто на свеце
Суцяшаць не ўмеў.
Як жа на душы тужліва,
Смутак там, імгла...
Ах, якой жа я шчаслівай
Пры табе была.

* * *

Свежаю фарбай абноўлены дзверы.
Донейка, глянь,
пасвятлела ж ў хаце.
Толькі б не страціць у лепшае веру,
Толькі б надзею не страціць.
Вось памяняем яшчэ мы шпалеры,
Сёння нам, донейка, не да багацця.
Толькі б не страціць надзею і веру,
Толькі б не страціць,
Толькі б не страціць.
Вось і радочак на чыстай паперы.
Душа не балела гэтак пры маці
Толькі б не страціць надзею і веру,
Толькі б не страціць.
Толькі б не страціць.

* *

Нібы кніжачку гартаю
Біяграфію сваю.
І ўздыхаю, я ўздыхаю,
І сама сябе караю
Там, дзе толькі існую.
Госцяй рэдкаю — удача.
Як узняць мне галаву.
Бо, напэўна, штосьці ж значу,
Калі ўсё-такі жыву...

* * *

Ты каму гадочкі лічыш,
Варажбітачка лясная?
Тут пад ціхі звон крынічны
Ажываю, ажываю.
Вам не ўбачыць слёзак-градзін,
Я іх хуценька схаваю.
І пад спеў салоўкі ў садзе
Ажываю, ажываю.
А ці той іду сцяжынай,
Ці аб тым, што трэба дбаю.
Што пасля сябе пакіну?
У сябе штодня пытаю.
Я цябе паклічу слоўка,
І натхненне пагукаю.
Не урані рука алоўка,
Слухай: сэрца размаўляе.

АПАВЯДАННЕ-БЫЛЬ

Назавіце імя сваё...

Іван СТАДОЛЬНІК



Усё жыццё Святаслаў Лявіцкі імкнуўся не рабіць людзям не толькі зла, але нават хоць якой-небудзь шкоды, калі не лічыць, што ў галодныя і халодныя гады пасляваеннага дзяцінства аднойчы залез да багатага і вельмі ж скупога суседа Максіма ў сад. Бо вельмі ж тады хацелася есці і была нейкая незразумелая крыўда на скупасць Максіма. Пра гэтую яго шкоду так і не даведаліся ні ягоныя сябры, ні суседзі, ні цяпер нябожчыца-маці, і, вядома ж, сам Максім, таксама ўжо нябожчык. І цяпер тыя старыя, якія яшчэ жывуць у ягонай вёсцы Янкі, і якія добра ведаюць Святаслава з самага нараджэння і ніколі не скажуць пра яго нешта дрэннае.

Усё гэта сталася, можа, таму, што, як казала ягоная мама, у іхнім родзе ніколі не было ні злодзеяў, ні злыдняў, ні хітруноў, ні проста злосных людзей. А можа, і таму, што мама і яе родныя сёстры былі вельмі набожныя, імкнуліся, паколькі гэта ўдавалася, свята прытрымлівацца Дзесяці запаведзяў і патрабавалі гэтага ад маёй сястры Манечкі. Таму яму і сястры ўвесь час хацелася і хочацца нешта зрабіць людзям прыемнае. Для Святаслава гэта як патрэба душы, як нейкае ачышчэнне, як аблягчэнне іхняга не вельмі сытнага і лагоднага жыцця, як святая прычасць. Можа, з-за гэтага ў ягоным вельмі нялёгкім жыцці не траплялася дрэнных людзей, якія б яму нечым нашкодзілі. Ніводнага чалавека.

Чамусьці ўсё, што ён змог зрабіць людзям добрага, не застаецца ў памяці, як правальваецца некуды ў нябыт. Толькі адзін учынак назаўсёды ўрэзаўся ў памяць. І калі цяжка на душы, калі нейкае няладдзе ў жыцці, яму адразу прыходзіць на памяць адна жанчына з дзіцём, і ў вушах чуецца выяўна, як і тады, яе даволі адчайны, надрыўны, з прымессю плачу, голас:

— Назавіце імя сваё!..

Было гэта не так даўно, як цяпер любяць напамінаць, у шчаслівыя застойныя гады, калі як быццам ўсе былі багатыя і шчаслівыя. У той дзень і Святаслаў быў ледзь не самы шчаслівы чалавек. Перад гэтым у касе папярэдняга продажу ўдалося, як тады казалі, "дастаць" білет на аўтобус у Полацк. І Святаслаў быў апошні шчаслівец. Тым, хто стаяў за ім, білетаў ужо не хапіла. А ў дзень ягонага ад'езду ўдалося купіць каўбасы і нават апельсінаў дочкам. І таму яму было страшэнна радасна на душы, што не прапала дарэмна доўгае стаянне ў чэргах, і што ў намечаны час прыедзе дамоў, ды яшчэ с гасцінцамі.

У такім шчаслівым настроі Святаслаў і прыйшоў на аўтастанцыю. Прыйшоў загадзя з нейкім трывожным страхам, што можа сарвацца па нейкай прычыне рэйс, ці, не дай Бог, запозніцца.

Быў ліпень месяц. Стаяла невыносная гарачыня. Духата. І людзей на пероне процьма, таўкатня, нейкая надрыўная гамана, крыкі.

Святаслававага аўтобуса яшчэ не было, а людзей на прыпынку стаяла вельмі шмат. Ясна, што шчасліўцаў з білетамі было яўна палавіна. Як "абілечаны", ён не захацеў праціскацца ў натоўп, стаў ззаду, дзе было крыху вальней.

І раптам недалёка за ягонай спіной пачуўся надрыўны, з плачам, крык дзіцяці.

— Мама, ма-а-а-мачка! Хачу да бабу-у-лі!..

— Што, я цябе на сабе панясу. Хіба не бачыш, колькі людзей! — адразу ў адказ пачуўся істэрычны крык жанчыны. — Паедзем назад!

А хлопчык усё мацней плакаў, прасіўся да бабулі. Святаслаў чуў, як жанчына пляснула дзіця некалькі разоў па шчаце і той заплакаў, залемантаваў яшчэ мацней. Святаслаў прымусіў сябе нейкі момант не звяртаць увагі, як і ўсе, што былі вакол, на гэту непрыемную для ўсіх сцэну. Але калі жанчына ўдарыла дзіця зноў і тое закрычала яшчэ больш адчайна, роспачна, ён не вытрымаў, праціснуўся на голас, бо ніколі не вытрымліваў, калі хто плача, асабліва дзіця. Перад лаўкай, на самым краёчку якой нейкім чынам удалося прыткнуцца і сесці светлавалосай у лёгкай паркалёвай сукенцы жанчыне, стаялі два даволі ладныя клункі, на адным з якіх сядзеў хлопчык гадоў сямі і плакаў.

— Навошта вы б'яце дзіця? — цяпер недалікатна запытаў Святаслаў.

— А што я магу зрабіць? Білетаў няма. Самой хоць пад колы кладзіся. А тут ён яшчэ. Да бабулі, да бабулі. — І жанчына сама заплакала ледзь не наўзрыд.

— Ну, не плачце, — ужо мякчэй, далікатней сказаў Святаслаў, — Можа, як-небудзь удасца яшчэ сесці.

— Удасца?! — скрозь слёзы злосна ўсміхнулася жанчына. — Мы з самага ранку ўжо тут. Тры аўтобусы пайшлі на Полацк. А мы, як тырчэлі, так і тырчым. — І жанчына зноў гаротна заплакала, абхапіўшы галаву рукамі. А потым, зыркнуўшы на Святаслава неяк нядобра, як ўсё роўна ён быў у нечым вінаваты, дадала: — З самага Днепрапятроўска едзем, цэлых двое сутак. А людзей, самі бачыце, колькі?! Ледзь не ўсю дарогу стаялі. І ўсё праз яго, — ужо гэтак жа злосна, як і на Святаслава, бліснула вачыма на малога. — Заладзіў: да бабулі, да бабулі. А як дабрацца да той бабулі? І я, дурная, паслухалася.

Крыху супакоіўшыся, жанчына сказала, што едзе да маці ў Себеж. У Полацку жыве яе сястра, там і збіраецца пераначаваць, а назаўтра ўжо дабірацца на сваю радзіму.

Хлопчык, як бы адчуў Святаслававу спагаду да яго, а мо і нейкую падтрымку, раптоўна заплакаў гучней:

— Мамачка. Паедзем. Паедзем да бабулі!.. Мамачка.

— Едзь! Ну едзь! Бачыш, як мы едзем, — раптоўна ўскочыўшы са свайго месца, скрозь плач закрычала жанчына і зноў ударыла па шчацэ хлопчыка. Той ўскрыкнуў, ускочыў з клунка і хацеў некуды ўцякаць. Але жанчына паспела схапіць яго за руку.

У Святаслава кальнула ў пяты. Чамусьці, калі ён бачыць, што некаму баліць, яму заўсёды коле ў пяты.

— Пачакайце, пачакайце. Я журналіст. Я, можа, і дапамагу вам, — міжволі смела схапіў Святаслаў жанчыну за руку.

Жанчына з недаверам, а як яму здалося, і са страхам зірнула на Святаслава. Ён зразумеў, што жанчына і сапраўды яго баіцца, не верыць. І ён хуценька дастаў з нагруднай кішэні свой журналісцкі білет, паказаў ёй. Убачыўшы дакумент, жанчына крыху супакоілася.

— Нікуды адсюль не ідзіце. Я пастараюся вам дапамагчы, — ужо на хаду сказаў Святаслаў і падбегам накіраваўся ў будынак вакзала.

Ні ў касах, ні ў дзяжурнага вакзала ён не знайшоў дапамогі. Дабраўся да начальніка вакзала, ведаючы, што ў таго заўсёды ёсць бронь. Але і тут не пашанцавала. Начальніка не было на месцы. Бегам, прадзіраючыся праз натоўп, імчаўся да аўтобуснага прыпынку, ведаючы, што па часе пасадка павінна быць у самым разгары. Ён аж задыхаўся ад думкі, што жанчына можа палічыць яго за падманшчыка, аферыста ці больш таго.

Жанчыну і праўда заспеў ужо з клункамі ў руках. Яна не плакала, не плакаў і хлопчык. На іх тварах быў цень нейкай абыякавасці, беззыходнасці.

— Ідзіце садзіцца, — выпаліў ён. — Вось білет! Мой.

Жанчына аж акамянела. Нейкім дзіўным позіркам уставілася ў Святаслава. Нібы стараючыся зазірнуць у душу і потым паўшэптам перапытала:

— Ваш?.. А вы?..

— Я тут усё ведаю, я і на спадарожных дабяруся, — і не чакаючы згоды жанчыны, уклаў у далонь ёй білет і, ўзяўшы клункі, першы пайшоў да аўтобусных дзвярэй, якія вось-вось гатовы былі зачыніцца. У дзвярах жанчына запынілася, спрабуючы расшпіліць сумачку, відаць, каб заплаціць за білет, але Святаслаў прапусціў уперад хлопчыка, паставіў на прыступкі сумкі і амаль сілай упіхнуў жанчыну ў салон.

Аўтобус яшчэ крыху затрымаўся, бо нехта з безбілетнікаў адчайна хацеў убіцца ў яго, але шафёр, даволі малады хлопец, не дазволіў.

У Святаслававым білеце было пазначана і месца. І ён убачыў праз акно аўтобуса, што жанчына хоць з цяжкасцю, але праціскаецца да яго.

І калі аўтобус ужо адправіўся, у адчыненым акне паказалася галава жанчыны, і Святаслаў пачуў яе радасны, вельмі цёплы, поўны слёз голас:

— Назавіце імя сваё!

— Бог назаве! — крыкнуў Святаслаў наўздагон аўтобусу і ледзь не заплакаў сам ад нейкай лёгкасці на душы, нейкай раней неадчуванай радасці.

У той дзень яму пашчасціла. Ён удала сеў на спадарожную машыну і шчасліва даехаў да свайго Полацка...

• ТВОРЫ ЛІТКВАРТАЛАЎЦАЎ

Галіна ЗАБАЎСКАЯ

Лёшка

1

У дзяцінстве ў мяне быў сябар Лёшка. Яшчэ тады мы пачалі заўважаць, што ён не такі, як усе. Лёшка не быў падобны ні на маці, ні на бацьку. Ён увогуле адрозніваўся ад усіх навокал. Мабыць, у сталіцы гэта і незаўважна, але жыў Лёшка ў маленькай вёсачцы Падбор'е. Гэта вёска — з'ява унікальная: дзесяць дамоў з усіх бакоў абкружаныя лесам і ўсё. Вось тут хлопец і вылучаўся сярод іншых вельмі ж моцна. Маленькі, каржакаваты, з чорнымі-чорнымі валасамі, цёмнымі, крышку раскосымі вачыма і смуглай скурай, ён уяўляў сабой нешта накшталт "твару каўказскай нацыянальнасці". Трэба зазначыць, што ніхто з Лёшкінай сям'і, нават самыя далёкія продкі, не быў звязаны з Каўказам. Хлопец не ведаў у чым тут справа, але ведала ўся вёска: "Лёшка — з дзіцячага дома".

2

Гэта звестка пераходзіла да ўсіх, і аднойчы яна дайшла і да яго. Даволі выпадкова, але дайшла. Тады Лёшку было дванаццаць гадоў. Адразу ўсё стала зразумелым: і чаму ён непадобны да астатніх, і чаму так дрэнна да яго адносіцца дзед, ды і ўвогуле ўсе вяскоўцы.

Спачатку дрэнныя адносіны не былі навідавоку, але ўсё змянілася, калі Лёшкін дзед перанёс інсульт. Паўінвалід, дзед усю злосць выкідваў на хлопца. І аднойчы гарачая каўказская кроў не вытрымала... Назаўтра ўсё Падбор'е ведала, што хлопец "ганяўся за старым Аркашам з сякерай". Вядома ж, дзеля таго, каб засекчы дзеда. Канечне, ніякіх такіх думак у Лёшкі не было, але так казалі людзі. Здаецца, усім вядома, што такое грамадскае меркаванне.

А праз некаторы час уся вёска гаманіла, што Лёшка, прабачце, "няправільнай арыентацыі". Быццам бы ён звёў у лес Грыбавага ўнука Францішака. Ніхто гэтага не бачыў, але так казалі ўсе. І вось паступова Лёшка з проста непадобнага да ўсіх хлопца пераўтварыўся ў нейкага "ізгоя", "ворага народа".

3

Усе дзесяць падбар'янскіх сем'яў паўсталі супраць аднаго чатырнаццацігадовага юнака. Лёшку было цяжка зразумець, чаму з ім не віталіся, чаму пра яго хадзілі розныя плёткі, чаму яму так і не прабачылі ўчынак з сякерай. Падбор'е выбачала большае, але чамусьці Лёшку не даравалася нічагусенькі!

Ён вырашаў помсціць. Хлопец збег з дому. Тады было лета, і ён жыў на так званай "грыбавай дачы" (недабудаваным доме Грыба). Лёшка пачаў красці з агародаў вяскоўцаў. Так працягвалася месяц. Днём ён хаваўся ў лесе, а ноччу вяртаўся ў вёску. Хлопец стаў ненавідзець людзей, сцерагчыся іх як загнаны звер.

Усё ж такі Лёшку знайшлі. Той жа Грыб. Вяртаючыся ўночы з пасядзелак, п'яны ён прыдыбаў на сваю "дачу" і заўважыў там хлопца. Сп'яна і з перапалоху Грыб падняў гвалт на ўсё Падбор'ё.

Лёшка быў вымушаны вярнуцца да бацькоў, бо на вёсцы заставацца было немагчыма. Сяк-так ён скончыў 9 класаў, атрымаў атэстат, але летам яму прыйшлося пераздаваць свае двойкі.

— Ну чаму ты такі, Лёша? — пыталася ў яго настаўніца рускай літаратуры, якая шчыра спачувала юнаку. — Ты ж разумны хлопец, мог бы добра вучыцца.

Лёшка не ведаў, што адказаць. Хіба яна зразумее, што значыць быць не такім як усе, што значыць жыць на "грыбавай дачы", быць прыёмным?

Пасля школы Лёшка звязаўся з

4

крымінальнікамі і пачаў красці ў магазінах. Дома ён не з'яўляўся, жыў у кагонебудзь з банды ці проста на вакзале. Так працягвалася некалькі месяцаў, пакуль яны не вырашылі залезці ў кватэру. Дамушнікаў злавілі. Лёшку далі два з паловай гады, але адсядзеў ён толькі год: папаў пад амністыю.

Лёшку тады здавалася, што жыццё, такое жорсткае да яго з дзяцінства, у рэшце рэшт усміхнулася і яму. Поўны новых спадзяванняў, ён пісаў лісты з турмы да сваіх, прасіў прабачэння за ўсё: за непадабенства, за сякеру, за дзеда Аркашу, за Францішака, за "грыбаву дачу", за крадзяжы. Ён хацеў стаць добрым хлопцам, пайсці вучыцца, потым працаваць, дапамагаць бацькам, пабудаваць дом, выхаваць сыноў, унукаў ды шмат чаго яшчэ. Лёшка пісаў пра гэта ў пісьмах, але Падбор'е было суровым, нішто не магло прымусіць вяскоўцаў змяніць свае погляды і адносіны.

Хлопец зноў сутыкнуўся са знаёмай з дзяцінства чэрствасцю, зноў адчуў сябе ізгоем. І тады ён зразумеў, што шкадавання ў Падбор'і шукаць не трэба.

Дзесьці пад Кіевам была ў яго цётка. Лёшка сцягнуў у прыёмнай маці грошы і паехаў туды, каб пачаць новае жыццё. А грошы, думаў хлопец, ён верне, абавязкова верне...

НОВЫЯ "ПАЎЛІНКІ"

Уручэннем традыцыйных нацыянальных узнагарод ад Саюза тэатральных дзеячаў быў азнаменаваны Міжнародны дзень тэатра ў Мінску. Урачыстая цырымонія падвядзення творчых вынікаў года адбылася, як заўсёды, на купалаўскай сцэне. Галоўны прыз — "Крыштальную Паўлінку" — атрымала за адданасць беларускаму нацыянальнаму мастацтву народная артыстка краіны, вядучы майстар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Марыя Захарэвіч. "Крыштальную зорку" за вялікі ўклад у тэатральнае мастацтва здабыў з небасхіла творчасці Аляксей Еранькоў, загадчык музычнай часткі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М.Горкага. Адзначаны яркі дэбют актрысы Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра Яўгеніі Белацаркоўскай. Уручэнне прыза, якім ганаруюцца акцёрскія дынастыі, гэтым разам суправаджалі тужлівыя ноткі: "Крыштальны агмень" прынялі актрыса Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М.Горкага Зоя Асмалоўская ды актрыса купалаўскага тэатра Алена Сідарава, удава і дачка выдатнага майстра Юрыя Сідарава, які амаль тры месяцы таму пакінуў зямны свет...

Сёлета ўпершыню сярод прызоў з'явіўся "Крыштальны анёлак" — сюрпрыз для дзеячаў лялечнага жанру. І трапіў ён да сапраўднага Артыста, Уладзіміра Уласава.

Для тых, чый кон — пра тэатр пісаць, крышталь не прадугледжаны: відаць, каб не пацярпеў ад крытычных стрэлаў. Але і лепшыя крытыкі без узнагарод у Дзень тэатра не засталіся. Тэатразнаўцаў і рэцэнзентаў Таццяну Арлову, Тамару Гаробчанку, Анатоля Сабалеўскага можна павіншаваць з дыпломамі.

С.Б.

"ШЧОДРЫЦА" З КАМВОЛЬНАГА

Ансамбль народнай песні "Шчодрыца" Палаца культуры Мінскага камвольнага камбіната справіў сваё 10-годдзе.

Пачыналася ўсё з невялікага ансамбля, які прадэманстраваў сваё мастацтва ў вытворчых цэхах. Праз нейкі час ансамбль пад кіраўніцтвам Ірыны Вакульчык і музычнага кіраўніка, Валянціны Трамбіцкай стаў лаўрэатам вядомага фестывалю народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік" у Паставах. Потым былі міжнародныя фэсты ў Эстоніі, Расіі, Германіі, Чэхіі, Польшчы, Славакіі, Венгрыі...

Уладзіслаў БАСЬКО

ШОУ ПЛЮС БІЗНЕС — НАРОДЗЯЦЦА ЗОРКІ?

Між лянотай і справай бывае хвіліна для спрэчак. А спрачацца мы любім пра ўсё, што заўгодна. Пра надвор'е, пра спорт... Пра эстраду, і досыць канкрэтна: скажам, ёсць у нас "фабрыка зорак" ці не? Зрэшты, як бы там ні было, а ў нейкім сэнсе спробы "вытворчасці" беларускіх поп-зорак вядомыя ўжо з другой паловы мінулага стагоддзя. Пачынаеш прыгадваць — і высвятляецца, што гэтая, па сутнасці саматужная, вытворчасць мае даволі плённыя традыцыі.

Каштоўнасць гэтых традыцый і набыткаў адцяняецца ўвогуле, на жаль, нездавальняючым узроўнем падрыхтоўкі прафесійных спевакоў эстраднай спецыялізацыі ў навучальных установах культуры і мастацтва.

Ну, і як жа выглядае абагульненае аблічча нашай "фабрыкі зорак"?

Перапрашаю, калі шаноўнаму чытачу будуць назаляць сякія-такія шматкроць ужытыя словы, але ж таўталогія тут непазбежная. Дык вось, да падрыхтоўкі ды папулярызацыі беларускіх зорачак ды зорак спрычыненыя Магілёўская студыя эстраднай песні "Вясёлка", яе "малодшая сястра" ў Маладзечне, шэраг больш ці менш паспяховых аналагічных суполак у абласных і раённых цэнтрах краіны; студыі "Верасы", "Сябры", цэх салістаў Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі. Яшчэ — тэлевізійныя фестывалі для юных спевакоў ды конкурсы маладых выканаўцаў у межах папулярных масавых фэстаў. Нарэшце, Дзяржаўны маладзёжны тэатр эстрады, знітаваны з навучальным працэсам у БДУ культуры, а таксама студыя пры Дзяржаўным ансамблі "Песняры" і створаная на пачатку сакавіка пры Дзяржаўным канцэртным аркестры Беларусі студыя эстраднай песні.

Што да гэтага, зусім новага ўтварэння, дык яно бярэ на сябе як функцыі асяродка прафесійнай падрыхтоўкі ды выхавання айчынных выканаўцаў эстраднай песні, так і функцыі дзяржаўнага прадзюсерскага цэнтра, закліканага займацца прапагандай менавіта свайго, беларускага эстраднага мастацтва ў нашай краіне. Сярод задач студыі — падрыхтоўка патэнцыяльных удзельнікаў міжнародных конкурсных праектаў, стварэнне рэзерву кадраў для папаўнення і абнаўлення складу вакалістаў Дзяржаўнага канцэртнага аркестра. Як заўважыў яго мастацкі кіраўнік маэстра М. Фінберг, студыя ўжо займаецца падрыхтоўкай да Нацыянальнага фестывалю беларускай паэзіі і песні "Маладзечна-2005", а сёлетняй восенню яе выхаванцы возьмуць удзел у маштабным праекце "Анталогія беларускай песні", які прэзентуе сучаснае ўвасабленне адмысловых вакальных твораў ад 16-га стагоддзя да нашых дзён. Узначаліў студыю дасведчаны прафесіянал, адзін з вядучых айчынных кампазітараў А.Елісеенкаў.

•

А тым часам у Мінску рыхтуецца вялікі эстрадны канцэрт. Ён мае адбыцца 27 красавіка — з мэтай, як вызначае кіраўніцтва Першага нацыянальнага тэлеканала, — эмацыянальнай падтрымкі дуэта "Аляксандра і Канстанцін", які 3 мая выпраўляецца ў Стамбул, дзе будзе прадстаўляць Беларусь на Міжнародным песенным конкурсе "Еўрабачанне-2004". У праграме канцэрта пад умоўнай назвай "Беларусь — Еўропа" плануецца максімальная колькасць удзельнікаў, сярод якіх — і колішнія канкурэнты нашага зорнага дуэта па адборачным туры, і прадстаўнікі журы гэтага тура, і знакамітыя людзі краіны.

Цешуся надзеяй, што хаця б адзін уедлівы чытач заўважыў на лімаўскіх абсягах (гл. газету за 9 красавіка 2004 г.) і запомніў воклiч: "Гайда ў шоу-бізнес!" За воклічам хавалася абяцанка: распавесці пра тыя грандыёзныя планы, якія мае наша Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія наконт пошуку, выхавання ды "раскруткі" айчынных зорак эстрады, здатных засвяціцца і на небасхіле міжнароднага шоу-бізнесу. Такім чынам — абяцанае: пра перспектывы развіцця айчыннага шоу-бізнесу, якія акрэсліліся перад журналістамі падчас нядаўніх сустрэч у галоўным тэлевізійным доме краіны.

Удзел у адказным новым міжнародным праекце вымушала кіраўніцтва Белтэлерадыёкампаніі правесці працэдуру адборачнага тура конкурсу "Еўрабачанне" юрыдычна карэктна. Таму, паводле слоў генеральнага прадзюсера Першага нацыянальнага тэлеканала У.Максімкава, яго намесніка А.Капёнкіна, выканаўчага прадзюсера С.Кухто ды іх кампетэнтных калег, літаральна кожнае дзеянне, кожны крок арганізатараў падмацоўваліся адпаведным юрыдычным дакументам. У выніку з'явіліся і абавязкі па развіцці шоу-бізнесу і падтрымцы айчынных эстрадных выканаўцаў.

Васіль Раінчык і Аляксандр Ціхановіч

Белтэлерадыё заўсёды знаходзіла з артыстамі агульную мову, але плённыя творчыя кантакты ўсталёўваліся хаатычна. Цяпер жа рыхтуецца т.зв. рамачнае пагадненне, на аснове якога можна будзе весці канструктыўны дыялог, планаваць далейшую працу, знаходзіць паразуменне ў такой фінансава далікатнай справе, як выкарыстанне "прадукта супольнай вытворчасці". Ужо сёння выканаўцы, у тым ліку маладыя, атрымліваюць магчымасць бясплатна запісвацца ў студыі БТ — адной з лепшых айчынных студый. Бярэ БТ на сябе абавязацельства бясплатных здымак відэакліпаў, каб потым гэты "супольны прадукт" прапаноўваць на рынках за межамі Беларусі. У сетцы вяшчання ёсць некалькі праграм, разлічаных на ўдзел гуртоў-пачаткоўцаў, якія могуць выпрабаваць сябе ў эфіры, паспаборнічаць з гэткімі ж суполкамі, а ў выніку поспеху трапіць у праекты больш высокага ўзроўню, кшталту "Кліп-абоймы" ці далей — "На скрыжаваннях Еўропы". І ўсё тут будзе рабіцца ў адпаведнасці з юрыдычнымі дакументамі, што гарантуе паразуменне ў матэрыяльна-грашовых стасунках і пэўную бізнес-перспектыву для абодвух бакоў: прадзюсера і артыста. А таксама паспрыяе цывілізаваным адносінам са спажыўцамі на міжнародным рынку шоу-індустрыі, з нашымі суседзямі.

Ці не занадта абстрактна ўсё гэта падаецца? Сёння можа скласціся і такое ўражанне. Але ў бліжэйшы час будзе створаны т.зв. аўдыёвізуальны савет. І калі новая песня добра зарэкамендуе сябе на радыё, набудзе попыт у слухачоў, кампетэнтныя эксперты прапануюць здымкі кліпа. Абодва бакі зробяць свой унёсак у агульную справу і разам скарыстаюць яе вынік. Два дзяржаўныя тэлеканалы і пяць радыёстанцый — гэта своеасаблівы холдынг, дзе такую працу мяркуецца наладзіць за два гады.

Вядомы артыст і шоумен А.Ціхановіч, між іншым, заўважыў, што нават на сваім "Славянскім базары" беларускія выканаўцы далёка не заўсёды на першых ролях. І вось упершыню Беларусь трапляе на "Еўрабачанне": трэба гэта скарыстаць, звярнуць увагу на сябе, на краіну. Каб быць цывілізаванай дзяржавай, трэба быць такой і ў шоу-бізнесе, хочам гэтага мы ці не. Маленькімі крокамі, а ўсё ж мы туды ідзём. І рабіць гэта трэба цывілізавана, гнутка, далікатна, не перакрываючы каналы адно аднаму, не заяўляючы пра свае выключныя правы на трансляцыю нейкага папулярнага масавага шоу...

Вось пакуль і ўсе навіны пра падрыхтоўку айчынных поп-зорак ды іх "раскрутку"... А, дарэчы, — ці не наспеў час ужываць гэтае поп-слова без двукосся, ужо як тэрмін з навукі шоу-бізнесу?

С.БЕРАСЦЕНЬ
Фота М.ЗАМУЛЕВІЧА

"БЕЛАРУСЬФІЛЬМ" ЗДЫМАЕ...

Ні для кога не сакрэт (пра гэта і "ЛіМ" нядаўна пісаў — гл. нумар за 19.03.2004г., "Беларусьфільм": у пошуках панацэі?"), што кінастудыя наша зведала не самыя добрыя часы. Але сітуацыя, відаць, палепшылася. Ці не пра гэта сведчаць новыя рэжысёрскія працы ў мастацкім кіно?

Экранізацыяй рамана М.Чаргінца "Вам — загад", што распавядае пра лёс беларускай міліцыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, заняты рэжысёр Ю.Бяржыцкі. У галоўнай ролі здымаецца маскоўскі акцёр беларускага паходжання В.Ходзін.

Лірыка-драматычная гісторыя, што адбылася ў тыле ў 1944 годзе, паўстане ў экранізацыі апавядання расійскага пісьменніка В.Канецкага — "Яшчэ пра вайну". Рэжысёр стужкі П.Крывастаненка, у ролях — маладыя беларускія акцёры С.Кажамякіна, В.Палякова, А.Кот, А.Канановіч.

"Маленькія ўцекачы", гэткі эксцэнтрычна-прыгодніцкі аповед пра бабулю з унукамі, у якім рэальнасць пераплятаецца з фантазіяй, — будучая карціна Р.Грыцковай.

А вось праца вядомага рэжысёра А.Яфрэмава над сумесным расійска-беларускім праектам "Дунечка" (ужо неаднойчы паведамлялася пра здымкі гэтага кранальнага сюжэта на вечную тэму выхавання пачуццяў і нараджэння першага кахання, дзе прататыпам галоўнага героя быў М.Яроменка-малодшы) завершана.

Апошнім часам адбылося некалькі дэбютаў сцэнарыстаў, сярод якіх С.Шафранская і Ю.Ляшко. Рэдактура кінастудыі ўскладае вялікія надзеі на студэнтаў кінасцэнарнага аддзялення БДУ культуры, тым больш, што займаюцца яны пад кіраўніцтвам рэжысёра М.Лук'янава. Вялікія надзеі звязваюць на "Беларусьфільме" і з абвешчаным конкурсам на стварэнне серыяла пра беларускую моладзь. Плануецца таксама конкурс сцэнарыяў на спартыўную тэму...

Цікавасць да супрацоўніцтва з "Беларусьфільмам" праявілі айчынныя пісьменнікі: рэдкалегія разглядае тэмы і сцэнарыі, прапанаваныя В.Праўдзіным, Ан.Жуком, Л.Левановічам, І.Масляніцынай, Л.Дайнекам, А.Федарэнкам, А.Дзялендзікам, Р.Баравіковай.

Мікола АДАМ

Здымаецца фільм "Яшчэ пра вайну".

Фота А. ДЗМІТРЫЕВА

Як трэба радзіму любіць!

Наша краіна здаўна была шматнацыянальнай. Яе абшары рабіліся прытулкам для прадстаўнікоў розных народаў, а памяркоўныя і талерантныя беларусы ветліва прымалі тых, хто мусіў пакідаць сваю радзіму.

Так сталася, што пасля распаду СССР і магутнага землятрусу шмат людзей з Арменіі ў пошуках лепшай долі прыехалі на Беларусь. Каб падтрымліваць адно аднаго, а таксама не забывацца на ўласную культуру і традыцыі, армяне ўтварылі сваю абшчыну "Айастан". Адбылося гэта ўжо больш як 12 гадоў таму. Галоўныя асяродкі абшчыны знаходзяцца ў Мінску і ў Барысаве. "Айастан" вядзе актыўнае культурнае жыццё і штогод бярэ ўдзел ва Усебеларускім фестывалі нацыянальных культур.

Сярод мастацкіх калектываў вылучаюцца барысаўскі квартэт нацыянальных інструментаў, мінскі дзіцячы хор "Арвак" (у перакладзе з армянскай мовы — "ручай" і танцавальны калектыў моладзі "Эрэбуні", названы ў гонар армянскай крэпасці. Ёсць і таленавітыя салісты-спевакі: Іскуі Абалян, Юрый Давіцян. Наша дзяржава ставіцца да культурнай дзейнасці абшчыны вельмі шчыра і зычліва. Паводле слоў кіраўніка "Эрэбуні" Рузаны Аванесян, кіраўніцтва як горада, так і краіны заўсёды ідзе насустрач пры правядзенні канцэртаў і матэрыяльна дапамагае ўдзельнічаць у фестывалі нацыянальных культур.

На працягу года, а таксама непасрэдна перад фестывалем, у Мінску і ў іншых гарадах Беларусі з дапамогай старшыні ўсебеларускай абшчыны Грыгорыя Егіазарана арганізуюцца канцэрты. На адзін з іх, што праходзіў у Рэспубліканскім доме ветэранаў, мне давялося трапіць.

Кажучы шчыра, нічога звышнатуральнага я ўбачыць не спадзявалася, але... Канцэрт сапраўды ўразіў мяне вельмі глыбока і змусіў зусім з іншага боку паглядзець на гэты непаўторны паўднёвы народ.

Перш за ўсё адзначу высокую прафесійнасць выканаўцаў. Напэўна, адна з прычын яе — асабліва моцная любоў да сваіх традыцый і культуры, калі армяне не толькі захапляюцца гэтым, але і намагаюцца як мага лепей паказаць усю прыгажосць і самабытнасць сваёй культуры іншым людзям. У пацвярджэнне — і ўзнагароды калектываў, адзначаных на трох Усебеларускіх фестывалях нацыянальных культур. Прыемна таксама, што ў рэпертуар калектываў уваходзяць і беларускія нацыянальныя спевы і танцы. Так, гурт "Эрэбуні" на фестывалі выканаў і беларускую "Лявоніху".

Падчас іх выступленняў у залу сплывае такая энергетыка і шчырая радасць, што гледачы проста не могуць застацца абыякавымі. Прыгожыя старажытныя армянскія касцюмы і танцы быццам пераносяць у таямніцу казкі. Здаецца, быццам зліваешся са словамі спеву на незнаёмай мове і з мелодыяй дудука — нацыянальнага інструмента. Перад вачамі нібы паўстаюць зубчастыя верхавіны Каўказа. Па тварах некаторых гледачоў разумееш, што для іх гэта — адзіная магчымасць пабыць на радзіме хаця б у думках, уявіць сябе сярод квітнеючых дрэў граната пад пяшчотнымі промнямі ерэванскага сонейка.

Такія канцэрты таксама дапамагаюць бацькам — выхаваць нашчадкаў у любові да Бацькаўшчыны, роднай мовы і культуры, бо сярод гледачоў і ўдзельнікаў шмат дзяцей, моладзі. Пераемнасць пакаленняў, што не дае народу знікнуць і страціць сваё аблічча нават на чужыне, — відавочная. Бо гэтыя дзеці з самага маленства выхоўваюцца ў нацыянальных традыцыях. Дарэчы, адна з іх праяў — асаблівая павага да бацькоў і старэйшых. Таму, напэўна, у Арменіі амаль што няма дамоў састарэлых.

Пабываўшы на канцэртах, паразмаўляўшы з армянамі, разумееш, як цяжка на чужыне захоўваць і развіваць сваю культуру і нацыянальную свядомасць. Але, падтрымліваючы адно аднаго, сустракаючыся на канцэртах, армяне трываюць у любові да радзімы і перадаюць наступным пакаленням духоўную спадчыну сваіх продкаў.

Ды ў той жа момант вельмі балюча ўсведамляць, што наш народ нават на сваёй роднай зямлі, якая вякамі апекавалася ім, цураецца роднай мовы, саромеецца размаўляць на ёй, забываецца на традыцыі продкаў. Узнікае думка, што, можа, толькі страціўшы Бацькаўшчыну, пачнеш, нарэшце, належным чынам любіць яе? Але не, бо нельга любіць тое, чаго не ведаеш, не шануеш. А калі Бацькаўшчыны няма найперш у сэрцы чалавека, то для яго яе няма і ва ўсім свеце... Дзейнасць жа армянскай дыяспары з'яўляецца яскравым доказам любові да радзімы і яе гісторыі. І варта было б нам павучыцца ў гэтага народа, які нават на чужой зямлі не забываецца на сваю мову і традыцыі.

Ларыса ДАРАШЭНКА

Пачатак вясны беларускія мастачкі Ала Блізнюк, Любоў Кірылава і Эліна Малішэўская аздобілі яскравай, эмацыянальнай выставай сваіх твораў.

Тры розныя творчыя стаўленні, тры адмысловыя тэхнікі: жывапіс, пэчворк, батык, і пры гэтым — поўнае адзінства ва ўсведамленні прыгажосці, унікальнасці свету, што вакол нас.

Як заўважыў Мікалай Пагранаўскі, мастацтвазнаўца, дырэктар мастацкай галерэі "ONIK" — выстава атрымалася цэласная і ўражлівая. Майстэрства і талент мастачак не пакідаюць сумнення ў тым, што мы насамрэч жывём у цэнтры Еўропы.

Наладзіла выставу мастацкая галерэя "ONIK" пры Музеі беларускага кіно, што паблізу Чырвонага касцёла.

Ян БАНГУРА

Фота К. ДРОБАВА

ПЕРАКЛАДЫ

Суп з грахоў айца Нікадзіма

Элін Пялін (1877—1949)

Сённяшні дзень, хаця і быў самым звычайным днём, але меў нешта своеасаблівае. Неяк па-святочнаму распасціралася неба, свяціла сонца, нешта малітоўнае было ў цішыні лесу, у набожным спеве крынічкі. Штосьці пакорлівае адчувалася нават і ў поступе чорнага ката, які павольна прайшоўся цераз двор і ўзабраўся на гарышча.

Мы з айцом Сысоем сядзелі разам за сталом у засені прыгожай манастырскай лазы і цешыліся з гэтага цудоўнага дня. Перад намі далёка ўнізе распасціралася зялёная роўнядзь поля, акружанага сіняватымі сілуэтамі гары і ланцужковымі разгалінаваннямі лесу, што пакорліва, нібыта ў малітве, выпрасталі пакатыя вяршыні да неба. Айцец Сысой сядзеў, адкінуўшыся на спінку лаўкі, павольна перабіраў сваімі прыгожымі поўнымі рукамі зярняты ружанца і задуменна маўчаў.

Цераз двор праклыпаў глухаваты манастырскі кухар з завязаным белым фартухом і місаю ў руцэ.

Айцец Сысой махнуў яму рукой.

— Можа, гатова ўжо? — гучна і выразна запытаўся ён у кухара, пасля дастаў з кішэнькі на сваім скураным рамяні гадзіннічак і паглядзеў на яго.

— А-а, будзе, будзе, — адказаў кухар, і папярэдзіў, каб мы трошкі пачакалі. Не пачуўшы іншых пытанняў, ён накіраваўся да кухні. На твары айца Сысоя мільгнула добрая ўсмешка.

— Ці ведаеш, што мы сёння будзем есці? — звярнуўся ён да мяне.

— Ты зноў падрыхтаваў нейкую спакусу, ойча, — адказаў я і зірнуў на бутэльку з віном, што ахалоджвалася ў крынічцы.

Калі ў крынічцы знаходзілася бутэлька віна, абед заўсёды абяцаў нешта незвычайнае: гюзеч, якую-небудзь вострую страву з бараніны, печанае кураня альбо шашлык.

— Не, — прамовіў айцец Сысой і паклаў рукі на стол. — Сёння мы будзем есці самую звычайную страву, але яна мае пэўны сэнс. Я пачастую цябе супам з грахоў айца Нікадзіма.

— Я ў здзіўленні паглядзеў на яго і пахваліў за ўдалы жарт.

— Я не жартую, шаноўны, — адказаў (святар і задуменна нахіліў галаву. — Я кажу чыстую праўду — сёння мы будзем есці суп з грахоў айца Нікадзіма. Вось ужо цэлы год, царста яму нябеснае, як адпачывае гэты нявінны чалавек на манастырскіх могілках пад айвой, якую сам пасадзіў і выгадаваў. Імя манаха з-за яго сціпласці хутка забылася. Яго душа жыла ў страху перад Богам і ў імкненні да раю, таму ўвесь час знаходзілася ў пошуках і разважаннях.

Я застаў айца Нікадзіма тут за год да смерці. Ён быў ужо стары, але выглядаў здаровым і дужым. Быццам бы цяпер бачу яго моцную, плячыстую фігуру, а прайсці праз царкоўную браму ён мог толькі крыху прыгнуўшыся. Айцец Нікадзім крочыў цяжка, павольна і ўладна, як патрыярх. Яго вялікія круглыя вочы, над якімі, нібы гронкі вінаграднай лазы, навісалі густыя бровы, мелі загадкавы і дзіўны позірк. Гэты позірк зусім не адпавядаў той моцы, што мела дужая постаць. Раніцай айцец Нікадзім выходзіў з засені сваёй келлі і прыпыняўся перад царкоўнай брамай, каб перахрысціцца. На яго шырокія плечы, абцягнутыя старой вылінялай расай, падалі сонечныя промні, нібыта на хрыбет нейкай гары. І мне, даруй Божа, кожны раз здавалася, што гэтаму чалавеку не пасуе маліцца, ён выглядаў мацнейшым за ўсе грахі, супроць якіх яму трэба было б падымаць не руку, каб перахрысціцца, а сціснуты кулак.

Айцец Нікадзім жыў самотна ў невялічкім пакойчыку і не выказваў асаблівай цікавасці да мяне. Ён харчаваўся адзін, заўсёды своечасова наведваў ўсе царкоўныя службы — ранішнія і вячэрнія.

З любоўю і стараннасцю манах даглядаў кветкі ў садзе. Асабліва яму падабаліся белыя ружы, якіх ён насадзіў там розных гатункаў. Цудоўнымі майскімі ранкамі, калі ружы расцвіталі, манастырскі двор нібыта напаўняўся маленькімі белымі анёлкамі. Айцец Нікадзім ішоў да кветак, доўга праходжваўся сярод кустоў, нюхаў ружы і заўсёды адломваў толькі адну. Цікава, што гэтую ружу потым знаходзілі на лаўцы ў парку за манастыром. Цяпер я ўжо ведаю, што гэта мела пэўны сэнс, хаця выглядала вельмі дзіўна.

Цёплымі вясеннімі і летнімі днямі гэты ціхі чалавек праседжваў з вудай каля ракі. Ён ахвяраваў свайму захапленню доўгія гадзіны, і я не ведаю нікога, хто б лепш лавіў фарэль, чым айцец Нікадзім. Гэты дзіўны манах мог нястомна хадзіць гадзінамі па цяністых лагчынах каля ракі, прабірацца праз гушчарнік, што пакрываў яе берагі, караскацца па вялікіх, пазелянелых ад часу, круглых камянях. У такія дні ён звычайна прапускаў вячэрню. Але людзі бачылі, што пачуўшы звон, ён прыпыняўся і хрысціўся, пакуль не спынялі званіць.

Айцец Нікадзім прыйшоў у манастыр дваццацігадовым юнаком, але і тады быў такім жа дзіўным. Колькі разоў прапаноўвалі айцу Нікадзіму стаць ігуменам, але ён заўсёды сціпла адмаўляўся.

Зараз гэты чалавек адпачывае, супакоены, пад айвой. Яна схіліла над яго магілай сваю прыгожую галіну, усыпаную маладымі і яшчэ зялёнымі пладамі. А мы сёння будзем есці суп з яго грахоў.

Айцец Сысой мудра ўсміхнуўся, крыху прыўзняў рукі, каб не перашкаджалі доўгія рукавы яго расы і прадоўжыў свой аповед:

— Учора ў келлі айца Нікадзіма, дзе цяпер ніхто не жыве, у глыбі схаванай шафы я знайшоў гаршчочак з фасоляй, які быў накрыты малітоўнікам нябожчыка. Кожная фасоліна з гаршчочка была асобна загорнута ў паперку.

А на першай старонцы малітоўніка было напісана....

Айцец Сысой дастаў з-за пазухі невялічкую кніжачку ў чорным пераплёце і прачытаў : "За кожнае маё праграшэнне, у думках альбо на яве, пакідаю тут па адной фасоліне — чорнай за недаравальныя грахі і белай за тыя, што прымушаюць маю душу сумнявацца і разважаць, і я не магу зразумець, грэх гэта альбо не. За чорныя фасоліны я вельмі каюся перад Богам, за белыя — прашу прабачэння".

Айцец Сысой загарнуў малітоўнік, паклаў яго на стол і выцягнуў з кішэні белую хустачку, у якой нешта знаходзілася. Разгарнуўшы яе, святар высыпаў на стол жменю невялічкіх пакамечаных паперак, што разляцеліся ад яго ўздыху ў розныя бакі.

— У гэтыя паперкі былі загорнутыя фасоліны. На кожнай з іх айцец Нікадзім запісаў здзейснены грэх. Я прачытаў іх усе адну за адной і бачу, што душа беднага чалавека, мабыць, дарэмна пакутавала, і літасцівы Божа прымаў малітвы манаха з ласкавай і ўсядаравальнай усмешкай. Давай прачытаем некаторыя паперкі.

"Я ўспомніў пра сваё свецкае жыццё і маладосць. Узгадаў і аб сваім каханні, што прывяло мяне ў манастыр, і пра тую, якую кахаў і яе белыя ружы, якімі яна любіла ўпрыгожвацца" — чорная фасоліна.

"У памяць пра яе белыя ружы пасадзіў тры ў садзе" — чорная фасоліна.

"Кожны дзень пакідаю на лаўцы ў парку за манастыром па адной белай ружы для таго, хто яе знойдзе. Няхай гэты невядомы чалавек пацешыцца з яе, як некалі цешылася яна" — белая фасоліна.

"Адна думка не дае мне спакою — чаму я уцёк ад звычайнага жыцця. Выратаваў альбо пагубіў сябе?" — белая фасоліна.

"Калі чалавек выратоўвае сваю душу ці не знішчае ён цела?" — белая фасоліна.

"Разважаю і не ведаю, што з'яўляецца галоўным у чалавека — душа альбо цела. Можа, яны па сутнасці непадзельныя, і ці не перамагае душа над салодкімі жаданнямі цела ?" — белая фасоліна.

Дык вось — ва ўсіх паперках, што ляжалі ў гаршчочку, пісалася зусім не пра здзейсненыя грахі. Айцец Нікадзім дзяліўся ўспамінамі маладосці, думкамі, што нараджалі сумненні, і сумненнямі, якія непакоілі душу нябожчыка.

Прачытаўшы паперкі, айцец Сысой клапатліва сабраў іх, загарнуў у хустачку і схаваў у кішэню. Пасля загадкава зірнуў на мяне і сказаў :

— Што значыць чалавек!

— Чорная фасоліна, — адазваўся я.

— І чорная, і белая, — усміхнуўся айцец Сысой.

У гэты момант манастырскі кухар пачаў збіраць на стол, бо надышоў ужо час абеду. Ён паставіў вялікую гліняную місу з фасолевым супам, ад якога ішоў цудоўны духмяны пах. У супе былі белыя і чорныя фасоліны.

— Вось, гэта і ёсць суп з грахоў айца Нікадзіма. А віно, што ахалоджваецца ў крынічцы, мы вып'ем за нябожчыка, і няхай Гасподзь даруе яго праграшэнні, — прамовіў айцец Сысой і запрасіў мяне абедаць.

Пераклала з балгарскай мовы Вольга КУЛЕШ

ШЛЯХАМ ЖЫЦЦЯ

Сёлета спаўняецца 18 год з дня трагедыі на Чарнобыльскай АЭС. Але на працягу ўсіх гэтых гадоў постчарнобыльская праблема застаецца адной з самых актуальных, бо тычыцца захавання жыцця на зямлі. 18 гадоў "Шляхам жыцця" па чарнобыльскіх раёнах Беларусі, Расіі і Украіны праходзяць, згодна праграме рэспубліканскай міжнароднай творчай дабрачыннай акцыі "Чарнобыльскі шлях — шлях жыцця", яе шматлікія ўдзельнікі. Варта нагадаць, што першыя тры гады праграма займала 140 — 160 дзён у год, ідучы па паселішчах і вёсках, многія з якіх засталіся зараз толькі на карце. За гэтыя гады выпрацавалася цэлая сістэма культурнага абслугоўвання насельніцтва аддаленых рэгіёнаў Беларусі, а галоўнае, — выяўлення і падтрымкі адораных дзяцей і падлеткаў.

Праграма "Шляху жыцця" на працягу столькіх гадоў праходзіць па ініцыятыве і дзякуючы арганізацыйнай працы ЦК грамадскага аб'яднання "БРСМ". Пастаянна фінансавую падтрымку ў яе падрыхтоўцы і правядзенні аказваюць Камітэт па праблемах наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Дэпартамент па справах моладзі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзіцячы фонд.

У выніку гэтых сумесных праграм жыхары з самых аддаленых раёнаў Беларусі сустрэліся з вядомымі музыкантамі і выканаўцамі. Сярод іх — Стэла, Сяргей Мінскі, Андрэй Шумак, Паліна Данская, Георгій Волчык, ансамбль Беларускай дзяржаўнай філармоніі "Купалінка", "Песняры", тэатр "Фантазія" і інш. Такім чынам, у акцыі прымаюць удзел амаль усе артысты беларускай эстрады. "Мы ездзім у чарнобыльскія раёны ўжо не першы год і вельмі задаволены. На перыферыі няшчасныя дзеці, але яны вельмі добрыя і, як гэта ні парадаксальна гучыць, больш выхаваныя, чым у Мінску. Я адчуваю, ім надта патрэбна ўсё тое, што мы робім. Яшчэ я б хацела прыгадаць такі выпадак: у адной з вёсак падчас канцэрта да мяне падышла жанчына гадоў пяцідзесяці і сказала, што ўпершыню ў сваім жыцці... бачыць тэатр. Я паглядзела ёй у вочы і адчула, што мы ім патрэбныя, яны нас чакаюць", — падзяліпася ўспамінамі мастацкі кіраўнік тэатра "Фантазія" Таццяна Можар.

"Акрамя таго, у кожным раёне праходзіць агляд конкурсу таленавітых дзяцей, па выніках якога ўдзельнікаў запрашаюць у Мінск. Дзеці і падлеткі атрымалі магчымасць рэалізаваць сябе, паказаць свой талент у праграмах беларускага тэлебачання і на вядучых сцэнічных пляцоўках рэспублікі. Дзесяткі юных дараванняў, якія выйшлі на сцэну ў праграмах "Чарнобыльскага шляху" — сёння ўжо студэнты творчых вышэйшых навучальных устаноў краіны. Многія з іх — працаўнікі прафесійных творчых калектываў," — паведаміла галоўны спецыяліст аддзела працы з первічнымі арганізацыямі і рэалізацыі маладзёжных ініцыятыў ЦК АА "БРСМ" Алеся Іназемцава.

Гэтыя праграмы, дзякуючы свайму міжнароднаму статусу, дазволілі ажыццявіць тэхнічнае забеспячэнне музычных школ, школ мастацтваў, творчых цэнтраў дзяцей і моладзі чарнобыльскага рэгіёна, дзіцячых рэабілітацыйна-аздараўленчых цэнтраў.

Разам з тым, у склад праграмы "Чарнобыльскі шлях — шлях жыцця" ўваходзіць некалькі акцый. Па-першае, гэтая міжнародная творчая дабрачынная акцыя "Чарнобыльскі шлях...". Па-другое, рэспубліканская тэлевізійная акцыя "У будучыню з надзеяй", якая праводзіцца штогод 26 красавіка. Па-трэцяе, "Маладая Беларусь — у будучыню з надзеяй", якая таксама праводзіцца штогод 24 дні ў чэрвені. Па-чацвёртае, "Дзеці думаюць пра дзяцей". Гэта штогадовая акцыя ахоплівае снежань — студзень. І, нарэшце, "Калядная ёлка".

Дадзенная праграма садзейнічае сацыяльнай і духоўнай рэабілітацыі насельніцтва. Таму, "каб уявіць сабе, што такое "Чарнобыльскі шлях...", трэба паехаць і пабачыць усё сваімі вачыма", — падкрэсліла Алеся Іназемцава. Між тым, па яе словах, на першым адкрыцці акцыі, як кажуць, яблыку недзе было ўпасці. Бо ўсе месцы, з якіх можна пабачыць сцэну, былі занятыя. А гэта сведчыць аб неверагодным жаданні вяскоўцаў, што жывуць на паўднёвай тэрыторыі Беларусі, жыць з радасцю ў сэрцы, жыць з надзеяй і верай. Абы толькі мы, людзі творчыя і шчодрыя, не забываліся на іх...

Марына ЦЯРЭШЧАНКА

Супрацоўніцтва на карысць нацыі

Падпісана Праграма супрацоўніцтва Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя РБ, Камітэта па праблемах наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС пры Савеце Міністраў РБ і Беларускай Праваслаўнай Царквы. Мэта — захаванне нашага навакольнага асяроддзя.

Распрацаваная ў межах Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай Праваслаўнай царквой ад 12 чэрвеня 2003 года Праграма накіравана на ўзаемадзеянне органаў дзяржаўнай улады і прадстаўнікоў царквы дзеля аздараўлення нацыі і захавання нацыянальнай прыроднай і культурнай спадчыны. Для планавання і каардынацыі сумеснай дзейнасці будзе створаны пастаянна дзеючы Каардынацыйны Савет з прадстаўнікоў Мінпрыроды, Камчарнобыля, Царквы, а таксама грамадскіх аб'яднанняў экалагічнай накіраванасці, іншых зацікаўленых арганізацый.

"У Камчарнобылі высока ацэньваюць экалагічную дзейнасць Беларускай Праваслаўнай царквы, — адзначыў першы намеснік старшыні Камчарнобыля Уладзімір Собаль, — і гатовы супрацоўнічаць, аказваць падтрымку царкоўным аб'яднанням у іх намаганнях па ахове навакольнага асяроддзя, экалагічным выхаванні насельніцтва. Мы ўпэўнены ў добрых выніках ад сумеснага ўдзелу ў акцыі па псіхалагічнай рэабілітацыі насельніцтва, якое пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС".

Таццяна ХРАПІНА
прэс-сакратар Камчарнобыля

Яшчэ ў 60 — 70-я гады, калі "касмічныя караблі бараздзілі прастору..." ды будаваліся першыя рэактары РВМК (рэактар вялікай магутнасці канальны), аўтарытэт тэхнічнага прагрэсу быў непарушны. Хутка рэкі на Зямлі павінны былі павярнуцца назад, а асноўныя спрэчкі разгараліся вакол таго, наколькі адрозніваюцца ад зямных жыццёвыя формы на Марсе.

Але вось ужо 18 гадоў, як чалавецтва спазнала, што далёка не ўсе дасягненні навукі ў стане ціхамірна служыць яму. Здарэнне, якое паклала пачатак нашаму тэхналагічнаму дэкадансу, адзначае сваё паўналецце.

На поўдзень Беларусі і поўнач Украіны мы адправіліся, каб знайсці адказ на самае злабадзённае пытанне сучаснасці: ці ёсць жыццё ў Чарнобылі?

...А бярозавік

Краіна кіслотных дажджоў

Паўмільённы Гомель — другі па велічыні горад Беларусі. Для жыхароў абласнога цэнтра ў XXI стагоддзі важна як і іншым гарадам і вёскам краіны — радыяцыйная бяспека.

Вёска Барталамееўка знаходзіцца ўсяго ў 15-ці хвілінах язды ад гомельскага міжнароднага аэрапорта, але каб трапіць сюды, ужо патрэбны спецыяльны дазвол. Дарэчы, попыт на дазволы назіраецца толькі раз на год і толькі з боку журналістаў: насельніцтва вёскі — нулявое.

У момант катастрофы дзьмуў паўднёвы вецер, таму радыёактыўнае воблака накіравалася ў цэнтральнае Палессе. Але праз некалькі дзён паветраныя масы напрамак змянілі: радыяцыя набліжалася да савецкай сталіцы.

На думку старэйшага даследчыка мінскага Інстытута атамнай энергетыкі Міхаіла Малько, калі б не спешныя дзеянні ўлады, радыяцыя распаўсюдзілася б па агромністых тэрыторыях у дробнай канцэнтрацыі, не шкоднай для чалавечага жыцця. Аднак Крэмль страшэнна баяўся дзвюх рэчаў: розгаласу інцыдэнта ды самой радыяцыі, калі б яна дайшла да сталіцы. У выніку, па загадзе Масквы, з дапамогай ваеннай авіяцыі воблака было расстраляна над Веткаўскім і Чачэрскім раёнамі Гомельскай вобласці. Радыеактыўныя ападкі вызначылі яшчэ адну пляму на ўрадлівых паўднёвабеларускіх землях.

Пасля прымусовага адсялення некалькі былых жыхароў вярнуліся ў Барталамееўку — і апынуліся заложнікамі радыяцыі. Бо бліжэйшая крама чыстай прадукцыі ў дзесяці кіламетрах ад вёскі, таму натуральная гаспадарка становіцца адзіным шансам выжывання. У той час як "знешняе" апраменьванне і не так шкодна, ужыванне прадуктаў, што вырублены на тэрыторыі з забруджаннем у 15-40 Кюры — справа небяспечная.

Апошняя жыхарка Барталамееўкі памерла каля пяці гадоў таму — кажуць, ад рака страўніка.

Узровень выпраменьвання ў дзесяткі разоў перавышае беларускую норму. Мы з калегамі з розных выданняў "на ўсялякі выпадак" начапілі марлевыя павязкі — яны як-ніяк абараняюць ад радыеактыўнага пылу. Нечакана журналістам, якія ўжо шмат чаго пабачылі, даводзіцца зведаць лёгкі шок: уздоўж адной з бярозавых алеяў да дзесяці-пятнаццаці дрэваў прымацаваны навюткія пяцідзесяцілітровыя поліэтыленавыя мяхі; на дрэвах відаць свежыя надрэзы. Нехта збірае бярозавы сок...

Афіцыйных заявак на візіты прадстаўнікоў мас-медыа ў той дзень не было, таму не было і падставы знішчыць слядыможна сказаць, злачынства. Затое цяпер мы ведаем: у забруджанай зоне збіраюць бярозавік у прамысловых маштабах.

Маладосць супраць радыяцыі

Калі Ветка — самы папулярны маршрут беларускіх журналістаў, то да самага пацярпелага Брагінскага раёна не кожны з іх даедзе. Але па-іншаму нельга зразумець маштабы з'явы: 150 кіламетраў на паўднёвы захад пераадольваюцца хутка.

Старшыня Брагінскага райвыканкама Аляксандр Ятчанка, бадай што, адзін з самых маладых у Беларусі. Ён расказвае, як у 1987 годзе паехаў з роднага горада ў Гомель — але не на пастаяннае месца жыхарства, як большасць сяброў, а каб атрымаць вышэйшую адукацыю. Пасля заканчэння універсітэта была магчымасць застацца ў больш чыстых раёнах... але стрымала пачуццё адказнасці перад сваякамі. На працу ў раён прыехаў у 1992-м, а ў 2003-м указам Прэзідэнта быў прызначаны старшынёй адміністратыўнай адзінкі.

Брагін — самы "брудны" райцэнтр Беларусі. Пасля аварыі тут выпадаў нават плутоній, а цяперашні ўзровень забруджвання — каля 20 Ku/км². Па ўсіх паказчыках гэта — зона паслядоўнага адсялення; але насельніцтва пасля аварыі скарацілася на 60 — 70 працэнтаў.

Як ні дзіва, пасля выбуху прыехала шмат маладых сем'яў. Некаторыя — перасяленцы з Казахстана ці Кіргізіі — такім чынам людзі атрымалі від на жыхарства. Перасяленцы беларускія, вядома, ехалі за льготамі і танным жыллём, якое засталося ад былых гаспадароў!

Па падліках спецыялістаў, для таго, каб справіцца з наступствамі Чарнобыля Беларусь павінна была за 25 пасляаварыйных гадоў затраціць 34 гадавыя бюджэты з 24 працэнтаў дзяржаўнага бюджэту Беларусі. З выдзеленых сродкаў на гэтыя мэты ў канцы 1980-х, на сёння засталося толькі 10 працэнтаў. Прымусовае адсяленне даўно скончана; у нашыя дні эвакуіруюцца з Зоны выключна добраахвотна. Тым не менш, вялікія сродкі патрэбныя на прафілактыку, аздараўленне і — самае важнае — інфармаванне людзей.

Радыяцыя знаходзіцца ў глебе, і таму большасць прадуктаў, што вырашчаны на радыеактыўных землях, ужываць небяспечна. Асабліва гэта датычыць агародніны і малака. Аднак чыстай ежы ў крамах тутэйшыя не купляюць, аддаючы перавагу забруджанаму, але свайму прадукту.

тут збіраюць!

"Змяніць менталітэт людзей — на гэта аніякіх выдаткаваных дзяржавай сродкаў не хопіць, — канстатуе сп-р Ятчанка.— Але гэта з'яўляецца нашай першай задачай".

Малады кіраўнік самага небяспечнага раёна — не выпадковасць: сярэдні ўзрост жыхара райцэнтра — 26 гадоў. Таму не дзіва, што гэта адзін з ліку рэгіёнаў краіны, дзе пры сённяшняй дэмаграфічнай катастрофе нараджальнасць перавышае смяротнасць.

Вось такое яно, чарнобыльскае шчасце Беларусі.

Кельтаў тут няма

З Брагіна накіроўваемся на поўдзень, у бок Камарына. Са школьных заняткаў па геаграфіі яшчэ памятаю: гэта самая паўднёвая частка нашай краіны. Першы прыпынак азначаны загадзя: нават не самыя заўзятыя аматары беларускай тапанімікі не маглі прамінуць вёсачку з цудоўнай назвай Дублін.

Пры больш дэталёвых роспытах становіцца зразумелым, што з ірландскай сталіцай палескае мястэчка не мае анічога агульнага. Уласна ірландцаў тут ні разу ў жыцці не бачылі. Затое прыязджалі французы, амаль кожны год наведваюцца немцы. Дзівяцца з назвы мястэчка ды робяць здымкі на фоне адной і той жа закінутай хаты.

Насельніцтва беларускага Дубліна — 24 чалавекі. У асноўным гэта перасяленцы — былыя жыхары адселеных вёсак, што знаходзяцца побач. У радыяцыйна-экалагічным запаведніку, мяжа якога пралягае адсюль у трох кіламетрах, у 1986-ым праводзілася прымусовае адсяленне. Але некаторыя вяскоўцы не здолелі прыстасавацца да гарадскіх умоваў, і вярнуліся сюды, у зону перасялення "добраахвотнага". Тут і да родных мясцін рукой падаць, і жыць дазволена.

І ўсё ж такі многія скарысталі прадастаўленае права і назаўсёды пакінулі наседжаныя месцы. Бо да сярэдзіны 90-х за пакінуты ў вёсцы дом сяляне атрымлівалі неблагую кампенсацыю плюс жыллё ў любым кутку Беларусі. Але ў 1995-ым грашовыя выплаты скасавалі — перасяляцца стала больш чым накладна.

Бабуля Лідзія атрымлівае сярэднестатыстычную беларускую пенсію ў 100 тысяч рублёў; гэткая ж зарплата ў калгасе. Насуперак існуючай думцы, ніякіх спецыяльных даплат тут не бачылі ўжо даўно, ды і зарплату затрымліваюць.

Для характарыстыкі стану калгаснай тэхнікі нават сяляне выкарыстоўваюць тэрмін "забітая". Між тым, згодна працоўных нормаў, тэхніка для работы ў забруджаных зонах павінна быць абсталявана кандыцыянерамі — гэта каб забруджанае паветра ў кабіне камбайна не застойвалася. Нават у Міністэрстве працы прызнаюць, што нармальнымі трактарамі з гаспадарак забруджанай зоны сёння забяспечаны адзінкі. Вось такія экстрэмальныя ўмовы працы.

"Тут у нас і буракі свае, і бульба, і цыбуля", — адзін з жыхароў вёскі Валахоўшчына прачыняе склеп. Натуральная гаспадарка закладзена ў нашых людзях падсвядома як адзін са спосабаў выжывання. Як і "экскурсіі" ў лес, па грыбы і ягады.

Спецыялісты на гэты конт пярэчаць, што ў зоне, дзе легальна жывуць людзі, збіраць дарункі прыроды яшчэ можна. Праблема ў тым, што тутэйшыя па грыбы ходзяць на поўдзень, кіламетраў за дзесяць, дзе пачынаецца ўжо зона забруджвання плутоніем-238, -239 ды — 240, — там і збіраюць больш. "Чорт яго ведае — нібы ад той радыяцыі ўраджайнасць павялічваецца", — у задуменні кажа мясцовы аксакал Пётр Пракоф'евіч.

Выгнанне з раю

Цяжка перадаць тое адчуванне, якое ахоплівае цябе пры наведванні адселенай вёскі. Сонечны — не вёска ўжо, а цэлы пасёлак, прычым з неверагоднай гісторыяй. У мірны (ад/на)селены пункт, якога няма на самай падрабязнай карце, нас згаджаецца правесці намеснік старшыні Брагінскага райвыканкама.

На пачатку 80-х пабудаваць камунізм яшчэ не атрымлівалася — але надзеі электарата трэба было падтрымаць. Аблупленыя савецкія вёскі больш не схілялі да сацыялістычнага аптымізму, таму і партыйныя работнікі распрацавалі мадэль "сельскага населенага пункта XXI стагоддзя". Ці то "Незнайка ў Сонечным горадзе" Носава натхніў бальшавікоў, ці нешта іншае, але менавіта беларускі пасёлак Сонечны значыўся ў планах партыі як першы з эксперыментальных: ён павінен быў стаць савецкім сельскім раем.

На змену жыллёвай гігантаманіі прыйшла савецкая эстэтыка 80-х. Жылыя чатырохпавярховікі для простых смяротных упершыню ў Саюзе мелі... прасторныя двухярусныя кватэры з усімі выгодамі.

За некалькі гадоў тут былі пабудаваны гандлёвы цэнтр ды агромністая кіназала. У першым квартале 1987-га непадалёку ад пасёлка чакаўся ўвод у эксплуатацыю стадыёна на 2000 месцаў.

Чырвоную стужку перарэзаць не паспелі; на карце мёртвы горад па вядомых прычынах вырашылі не пазначаць. Але гэтае ўжо не дапамагло: праграма будаўніцтва пасёлкаў павышанай камфортнасці хутка была скасаваная, як і сам Саюз.

Зараз Сонечны знаходзіцца ў зоне Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка. Уваход у рай — выключна па дазволах.

...Машына журналістаў са службовым райвыканкамаўскім эскортам уязджае ў пусты мінігорад. Закінуты населены пункт здалёк — гэта яшчэ не так страшна, а вось псіхалагічна няёмка адчуваеш сябе, калі бачыш былыя вуліцы вёсак і гарадоў: яны пазарасталі мхом, палынам ды піжмай.

Зазірнулі ў кватэры... Вакол — сведчанні вельмі хуткай прымусовай эвакуацыі. Кінутыя адзенне, цацкі, танныя прылады працы (астатняе забралі мародзёры). Дарэчы, апошнія паарудавалі ў зоне рупліва: ужо шмат гадоў як не засталося ў былых кватэрах больш-менш каштоўнай рэчы, а будынкі пазбавіліся аконных рамаў, часткі цэглы і шыферу. Бясплатныя будматэрыялы пайшлі на новае будаўніцтва — і як растлумачыць людзям, што яны радыеактыўныя?

Кажуць, ад назвы горада залежыць яго лёс. Так было з Чарнобылем, гэтая ж ісціна справядлівая і тут.

У прыемны веснавы дзень назва забруджанага пасёлка "Сонечны" выклікае кантрастны настрой. Тут да сонечнай радыяцыі дадаецца выпраменьванне глебы, а сам знак радыяцыйнай небяспекі ў форме чорнага сонейка на жоўтым фоне падаецца сімвалам канцэптуальным.

Сучасныя ліквідатары

Чарнобыль самым пераканаўчым чынам даказвае свае міжнародныя маштабы. Дзяржаўную мяжу вызначае толькі ўказальнік "Украіна", што знаходзіцца пры дарозе. Указальнікі радыяцыйнай небяспекі па абодва бакі мяжы аднолькавыя.

Гэта — адзінае месца, дзе ўкраінска-беларускую граніцу можна перасячы без аніякага мытнага кантролю — і прытым абсалютна легальна. Праўда, такі пераход магчымы толькі для пэўных катэгорый грамадзян, што працуюць у Чарнобылі і Прыпяці.

Каб праверыць сапраўднасць чутак, спецыяльна не бралі афіцыйны дазвол на праезд у Зону. Аказалася, зламалі яшчэ адзін стэрэатып: хабару тут не бяруць. "Працу за 300 долараў у месяц на Украіне трэба яшчэ пашукаць", — тлумачыць работнік кантрольна-прапускнога пункта. За гэткую таксу 23-гадовы памежнік аддае частку свайго здароўя дзяржаве.



Працуюць па кантракце, па сістэме "суткі праз двое". Большасць тутэйшых рабочых, зразумела, у адселенай зоне не жыве, а ездзіць на працу з Кіева ці Чарнігава. Да таго ж, паводле двухбаковай дамоўленасці, электрычка з апошніх 15 кіламетраў праязджае транзітам праз тэрыторыю Беларусі без мытнага кантролю — так значна хутчэй.

Журналісцкае пасведчанне робіць сваю справу. "Для іншаземцаў у нас, зразумела, існуюць больш жорсткія правілы ўезду", — кажа па тэлефоне адзін з намеснікаў дырэктара станцыі. І дадае: "Але ж вы ў нас блізкія іншаземцы".

Мінуўшы два КПП, уязджаем у славутую 30-кіламетровую зону вакол чацвёртага энергаблока ЧАЭС. Хутка — славуты мост цераз Прыпяць і від на сам рэактар здалёк. Але цікавая рэч: тут, у 13-ці кіламетрах ад маркотна знакамітай станцыі, радыяцыя нібыта скончылася: лічыльнік паказвае 17Мкр на гадзіну. Дарэчы, у Гомелі паказчык гэткі жа.

Тлумачэнне знаходзім у спецыялістаў. "Радыяцыйнае воблака паднялося ў вышэйшыя слаі атмасферы, і, "дзякуючы" ветру, субстанцыі пачалі выпадаць у некалькіх кіламетрах на поўнач, — кажа намеснік дырэктара ЧАЭС Ірына Коўбіч.— Таму на Беларусь і прыйшлося каля 65 працэнтаў радыеактыўных ападкаў".

Сучасны Чарнобыль нагадвае Швецыю 50 — 60-х: працы тут хопіць кожнаму. Да гэтага часу працягваецца г.зв. "дэкантамінацыя" тэрыторый: людзі счышчаюць і змываюць увесь бруд і пыл, што ўтрымлівае небяспечныя ізатопы. У гэтым годзе падпісана дамоўленасць аб узвядзенні другога аб'екта "Сховішча" над рэактарам. Праект коштам 700 мільёнаў долараў фінансуецца ўкраінскім урадам і Еўрапейскім парламентам пры падтрымцы Еўрапейскай камісіі.

Дарэчы, адна з умоваў дамоўленасці — удзел у рэалізацыі праекта еўрапейскіх будаўнічых фірм. Аднак наўрад ці знойдуцца ў Еўропе людзі, якія будуць згодны рызыкаваць жыццём на звышнебяспечным будаўніцтве. Хутчэй за ўсё, працай па ўмацаванні рэактара на чале з еўрапейскімі спецыялістамі зоймуцца украінскія рабочыя.

* * *

Слова "Чарнобыль" палохае сотні мільёнаў людзей па ўсім свеце. Насамрэч, лічыльнік Гейгера паказвае тут гэткі ж узровень радыеактыўнага забруджання, як у адносна чыстых раёнах.

Радыеактыўнае воблака аказалася і вандроўцам, і прыстасаванцам. Вандроўцам і прыстасаванцам з адной далёкай мэтай: яшчэ раз прадэманстраваць чалавецтву, хто сапраўдны гаспадар на гэтай планеце.

Сам горад Чарнобыль часта блытаюць з Чарнобыльскім рэактарам — але адлегласць паміж імі 15 км. Як і ўсю Зону, яго акружаюць міфы і стэрэатыпы. На карце пункт пазначаны як адселены; тым не менш, назіраем акуратныя фіранкі і адчыненыя форткі ў некаторых вокнах.

У адрозненне ад беларускай Зоны, людзі тут не толькі жывуць, але і працуюць — прычым абсалютна легальна, за лепшую ў Кіеўскай вобласці зарплату. Заключаюць кантракт на 1-2 гады і пасля заканчэння тэрміну пажыццёва карыстаюцца шматлікімі льготамі і прывілеямі.

Мікалай АНІШЧАНКА

ФОТА аўтара

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва", Саюз беларускіх пісьменнікаў смуткуюць з прычыны смерці аднаго са старэйшых сяброў па пяры **ЛУК'ЯНАВА Мікалая Піліпавіча** і выказваюць спачуванне блізкім і родным нябожчыка.

ТВОРЧЫ ПРАЕКТ

ЛЮБОЕ КІНО — ГІСТОРЫЯ

Нядаўна ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі адбылося ўрачыстае адкрыццё творчага праекта "Мастак у гістарычным кіно" мастака-пастаноўшчыка фільма "Анастасія Слуцкая" Валерыя Назарава.

Варта адзначыць, што на творчым рахунку гэтага мастака больш за 30 фільмаў. Сярод іх "Лясныя арэлі" (рэжысёр М. Пташук), "Сустрэча на далёкім мерыдыяне" (рэжысёр С. Тарасаў), "Расклад на паслязаўтра" (рэжысёр І. Дабралюбаў), "Раскіданае гняздо" (рэжысёр Б. Луцэнка), "Чорны замак Альшанскі" (рэжысёр М. Пташук), "Пейзаж з трыма купальшчыцамі" (рэжысёр В. Рубінчык), "Анастасія Слуцкая" (рэжысёр Ю. Ялхоў).

На выставе, якая будзе працаваць аж да 6 кастрычніка, прадстаўлены эскізы да кіна- і тэлефільмаў, тэатральных пастановак, а таксама графічныя аркушы і жывапісныя палотны майстра. Там можна пабачыць "Хутар Зяблікаў" (эскіз да кінафільма "Раскіданае гняздо"), "Дзяцінства" (эскіз да кінатэлефільма "Вадзіцель аўтобуса"), "Асада горада Слуцка татарамі" і "Гарашчы горад" (эскізы да кінафільма "Анастасія Слуцкая"). Разглядаючы працы, можна сказаць, што яны зроблены... пад беларускі менталітэт. Цікава афармленая і зала музея, апынуўшыся ў якой, адчуваеш сябе на здымачнай пляцоўцы. "Выстава — гэта, перш за ўсё, рэалізацыя свайго творчага праекта, бо тут прадстаўлена мая творчасць у розных накірунках. І гэта натуральна, бо кіно — мая асноўная прафесія, а ў мастацтве я працую на свабодныя тэмы. Іншымі словамі, кіно — гэта праца на зададзеную тэму", — падкрэсліў мастак-пастаноўшчык. Каб здзівіць гасцей выставы, Валерый Назараў пры дапамозе атрыбутаў рэжысуры, пастаноўкі і мастацтва зымправізаваў, як адбываецца працэс здымак у кіно, пачынаючы з традыцыйнага разбівання талеркі і заканчваючы "Стоп! Знята!".

Па законах жанру мастак кіно заўсёды знаходзіцца за кадрам. А між тым ён выконвае даволі вялікі аб'ём працы. З гэтай нагоды Валерый Назараў сваёй выставай сцвярджае, што першым пачынае рэалізоўваць свята стварэння новага кінатвора



менавіта мастак-пастаноўшчык. "Кінематограф — відовішчны, пластычны від мастацтва. Кіно пачынаецца са сцэнарыя і галоўная асоба ў ім — рэжысёр", — падкрэслівае В. Назараў. Падчас адкрыцця выставы ён адказаў на некалькі пытанняў.

— Валерый Мікалаевіч, наколькі я зразумела, вам падабаецца працаваць менавіта ў гістарычным кіно.

— Гістарычная тэма для мастака найбольш цікавая, тут ён можа сябе рэалізаваць, бо запатрабаваныя яго фантазія, густ, уменне, талент, прыдумкі, прычым усё разам. Мастак можа імправізаваць... Працаваць з гістарычнымі тэмамі – адно задавальненне, але разам з тым і цяжкасць. Дарэчы, лічу, што любое кіно — гэта гісторыя.

— У чым сакрэт фільма "Анастасія Слуцкая" і адпаведна — яго папулярнасці сярод гледачоў?

— Перш за ўсё, у запатрабаванасці. Зараз беларускі народ хоча ўсвядоміць сваю значнасць, зазірнуць у гісторыю. Фільм – гэта шматгранны арганізм, які складаецца са сцэнарыя, рэжысуры, падбору акцёраў, працы мастакоў. Але пералічанае мною не заўсёды атрымліваецца звесці ў адно. Значнасць нашага фільма ў тым, што ён адбыўся як бы насуперак. Мяркую, гэта можна расцаніць, як удачу. Таму мне б хацелася, каб у кінематаграфістаў яшчэ ажыццявіліся праекты на гістарычныя тэмы.

Марына ЦЯРЭШЧАНКА

ЮБІЛЕЙНЫ КАЛЯНДАР

У красавіку споўнілася б 60 гадоў з Дня нараджэння паэта Уладзіміра ЛІСІЦЫНА.

Споўнілася 105 гадоў з дня нараджэння паэта, драматурга, мастака і рэжысёра Веры СУРСКАЙ, якая стварыла першы ў Беларусі дзіцячы тэатр лялек (г.Брэст), шэраг кніжак, інсцэніровак і п'ес для дзяцей.

Абвестка

Паважаныя сябры!

Аргкамітэт па правядзенні XII Гарэцкіх чытанняў паведамляе, што канферэнцыя "XII Гарэцкія чытанні" па тэме: "Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць", раней запланаваная на 23 красавіка 2004 года, пераносіцца на 4 мая 2004 года і адбудзецца ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры па адрасе: 220029, г. Мінск, вул. М. Багдановіча, 13. Даведкі па тэл. 8-0172-89-34-75.

Аргкамітэт

26 красавіка ў Маскве ўрачыста адкрыецца "Год культуры Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі". Сярод найбольш значных падзей, запланаваных у межах праекта, — адкрыццё помніка Янку Купалу ў Маскве.

С.Б.

"СМІ" І БЕЛАРУСЬ

4 — 7 мая ў Мінску адбудзецца VIII Міжнародная спецыялізаваная выстава "СМІ на Беларусі". Галоўнай мэты выставы лічыцца актывізацыя супрацоўніцтва паміж беларускімі і расійскімі СМІ ў сферы інфармацыі.

У праграме — "круглыя сталы", семінары з удзелам прадстаўнікоў дзяржаўных органаў кіравання і грамадскіх структур. Таксама прадугледжана правядзенне Дней расійскай і ўкраінскай прэсы, прамых тэле-радыёэфіраў і ўручэнне ўзнагарод лепшым журналістам.

ЗАЦІКАВІМ ЕГІПЕТ?

Напрыканцы сакавіка ў Егіпце ў рамках 37-й Міжнароднай Каірскай ярмаркі прайшлі Дні Беларусі. Наша дэлегацыя наведала свабодную эканамічную зону правінцыі Суэц, а таксама малыя гарады правінцыі. Адбыліся перамовы ў міністэрствах прамысловасці, будаўніцтва, транспарта, нафты і газа Федэрацыі егіпецкай прамысловасці і Асацыяцыі егіпецкіх бізнесменаў. Удзельнікаў з нашага боку налічвалася больш за 20 суб'ектаў гаспадарання.

БЕЛАРУСЬ У ІНТЭРНЕЦЕ

Адна з самых слухацкіх праграм Першага Нацыянальнага канала Беларускага радыё "Радыёфакт" цяпер гучыць не толькі на звыклых хвалях у звыклы час, але і ў любы іншы час у любой краіне свету. Вядома ж, дзякуючы Інтэрнету.

На працягу многіх гадоў з 7 да 8 гадзін раніцы вядучыя "Радыёфакта" знаёмяць нас з апошнімі навінамі, а ўласныя карэспандэнты расказваюць пра тое, што адбываецца ва ўсіх кутках Беларусі і за яе межамі. Цяпер пра ўсё гэта можна прачытаць на афіцыйным сайце WWW. TVR.BY

ВІКа

Нёман і Бесядзь... праз лёсы

Нёман і Бесядзь сталі сімвалам творчасці народных паэтаў Якуба Коласа і Аркадзя Куляшова. Творцы не раз сустракаліся пры жыцці.

У Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылася вечарына, прысвечаная 90-годдзю Аркадзя Куляшова. У прэзідыуме, як пераемная еднасць — сын народнага песняра М. Міцкевіч, дачка юбіляра В. Куляшова, зямляк віноўніка свята, паэт Алесь Пісьмянкоў.

Уступнае слова сказала дырэктар Коласаўскага музея З. Камароўская, заўважыўшы, што імёны класікаў стаяць побач нават па алфавіце. Лічба 90 сёлета яшчэ паўторыцца: столькі ж было б старэйшаму сыну Я. Коласа, равесніку А. Куляшова, заснавальніку Коласаўскага музея Данілу Канстанцінавічу. А сам музей адзначае палову гэтай даты з дня свайго адкрыцця.

Вядучы вечарыны А. Пісьмянкоў гаварыў пра еднасць двух паэтаў, іх значэнне для беларускай літаратуры. Маўляў, як Нёман і Бесядзь упадаюць у акіян, так і творчасць Куляшова і Коласа ўпадаюць у сусветны паэтычны акіян. А ліра Аркадзя Куляшова — самая інтэлектуальная ў беларускай паэзіі.

Дачка юбіляра Валянціна Аркадзьеўна, аўтар кнігі пра бацьку "Лясному рэху праўду раскажу..." узгадала цікавыя эпізоды з жыцця паэта, якія былі вызначальнымі для яго з самага маленства і да апошніх дзён. Яна ж адкрыла тайну прататыпаў галоўных герояў знакамітай паэмы "Сцяг брыгады" камісара Заруднага і салдата Ворчыка.

Ветэран вайны, паэт Пятро Прыходзька, якога вучыла ў школе маці А. Куляшова Кацярына Фамінічна, распавёў пра свае стасункі з юбілярам. А яны даўнія, яшчэ даваенныя. Праз усё жыццё Пятро Фёдаравіч нясе ў сваім сэрцы высокае імя паэта-земляка.

Ён жа напісаў паэму, прысвечаную А. Куляшову, урывак з якой прачытаў на вечарыне.

Другі ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны, паэт Мікола Аўрамчык расказаў, якім непаўторным кансультантам па паэзіі быў А. Куляшоў, калі ён працаваў у Саюзе пісьменнікаў, як ён дапамагаў маладым. "Калі б не Куляшоў, то, можа, не было б і мяне" — прызнаўся ў канцы выступоўца.

Было што сказаць і лаўрэату Дзяржаўнай прэміі Беларусі, паэту Генадзю Бураўкіну. Творчасць А. Куляшова ён вывучаў яшчэ ў школе. А пасля, будучы галоўным рэдактарам часопіса "Маладосць", давялося яму друкаваць новыя творы народнага паэта, сустракацца з ім.

Дапоўніў папярэдняга выступоўцу паэт Міхась Башлакоў. Пра пераклады, архівы А. Куляшова ўзнёсла гаварылі кандыдаты філалагічных навук Міхась Кенька і Тэрэза Голуб. Пляменнік паэта Віталь Маслоўскі расказаў пра творцу, як пра цудоўнага чалавека.

На працягу вечарыны гучалі вершы юбіляра ў выкананні артыстаў А. Вінярскага і А. Пастрэвіч. Зачараваў усіх прысутных верш-песня "Алеся", які быў прачытаны на беларускай і англійскай мовах. Выдатным заключным акордам сталася выступленне вакальнага гурта "Ліцьвіны", якім кіруе ўнук паэта У. Берберaў.

Вечар запісвала здымачная група рэспубліканскага відэатэлецэнтра, якая стварае дакументальны фільм пра А. Куляшова.

Яўген ХВАЛЕЙ

Цёпла, па-зямляцку

Вялікая вечарына, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова адбылася ў Магілёўскім Дзяржаўным універсітэце, які носіць імя паэта. Актавая зала не магла ўмясціць усіх прыхільнікаў таленту славутага земляка. Вечарыну адкрыў рэктар універсітэта К.М. Бандарэнка. Апладысментамі і кветкамі віталі прысутныя гасцей з Мінска лаўрэата Дзяржаўнай прэміі паэта Міколу Аўрамчыка, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова Казіміра Камейшу, дачку паэта Валянціну Куляшову, пляменніка паэта Віталя Маслоўскага. Усе яны згадвалі пра свае сустрэчы з А. Куляшовым, чыталі вершы, прысвечаныя яму.

Мясцовы паэт і кампазітар Мікола Яцкоў выканаў свае песні на словы юбіляра "Мне сніўся сон" і "Птушка залатая".

Наогул паэзіі і музыкі ў гэты вечар было шмат. Цёпла было сустрэта прысутнымі выступленне ансамбля "Ліцьвіны".

У другой частцы вечарыны выступалі самі гаспадары, студэнты і выкладчыкі. Яны падрыхтавалі вялікую музычна-літаратурную кампазіцыю па творах Аркадзя Куляшова, пастаноўку якой ажыццявіў выкладчык універсітэта пісьменнік Яраслаў Клімуць.

К. ВІКЕНЦЬЕЎ

ХАЛОДНЫЯ АБДЫМКІ АЙЧЫНЫ

Жыву паблізу сталічных Маскоўскіх могілак. Часцяком бываю тут, хаджу між кладоў, спыняюся ля тых, чые прозвішчы ведаю. Думаю. Абставіны, як кажуць, схіляюць да одуму, не заўсёды вясёлага. Няхай даруюць мне памерлыя, не хачу трывожыць іх вечны сон. Вядома ж, пра мёртвых ці толькі добрае, альбо зусім нічога. Ды я і не пра мёртвых. А пра жывых. Пра тое, як ставяцца яны да памяці сваіх папярэднікаў.

Босыя перад вечнасцю

З суседам-фізікам маем завядзёнку ўвесну, прыхапіўшы пляшачку ды такую-сякую закусь, пайсці на Маскоўскія клады, памянуць добрых людзей. Найболей наведаць магілы нашых пісьменнікаў, дзеячаў культуры — наогул слынных людзей. Па той жа завядзёнцы чамусьці (не памятаю ўжо і чаму) пачынаем з магілы "вульгарызатара і фальсіфікатара беларускай гісторыі" Лаўрэна Абэцэдарскага. Яна шчытна аточана раслінными кушчамі, дык тут лацвей унікнуць пільнага міліцэйскага вока. Ды мы не нахабнічаем — кульнём "светлай памяці раба Божага" Лаўрэна і стаім сабе ціха, нават пафасна на душы робіцца. Потым ідзём да магіл пісьменнікаў, не беручы да ўвагі іх рангі ды званні.

На Маскоўскіх могілках, дзе зараз хаваюць людзей нейкім чынам заслужаных перад дзяржавай, прапісныя сентэнцыі, накшталт, "усе там будзем", "усе роўныя перад Богам", губляюць сваю звычную непарушнасць. У канцы зямной дарогі раптам высвятляецца, што не кожнаму мажліва сюды патрапіць, бо не ўсе роўныя. Перад Богам — яно мо і ўсе... А вось перад Айчынай зусім не ўсе. Аказваецца, нехта варты яе мармуровых абдымкаў болей, а нехта меней. Сярод жывых чамусьці ўкаранілася меркаванне, што сумарныя вынікі знаходжання чалавека на зямлі, павінны адпавядаць велічыні і дыхтоўнасці помніка на ягонай магіле. Мо яно і так. Толькі бывае вельмі цяжка параўнаць гэтыя вынікі і заслугі. Хто варты большай пашаноты пасля смерці — герой-генерал ці акадэмік-хірург? (У немцаў і амерыканцаў генерал і шараговы атрымаюць на свой курганок аднолькавы каменны крыж альбо слупок). А калі мы ўжо робім па-свойму, то давайце як мага праўдзівей трымацца гэтай адпаведнасці.

Амаль восем гадоў спыняліся мы з суседам, лічы, ля неабазначанай магілы Пімена Панчанкі. Шукалі якога дзеркача, каб абмесці апалыя лісцё і шыльнік, якога капача, каб падправіць курганок. І вось нарэшце — з'явілася надмагілле. Такое беднае і нехлямяжае, што робіцца прыкра і за нас з вамі, і за Айчыну. Няўжо ў яе не знайшлося крыху болей грошай на помнік Народнаму паэту Беларусі?!

Нахіліўшыся над невялічкім бетонным вычварэннем "скульптурнай думкі", каб лепей разгледзець крываватыя літары надпісу, я ледзь не злякнуўся: бліснула з-за хмары сонца — і на магілу паэта абрынуўся агромністы цень Каменнага Госця! З выкшталцонага шэрага граніту на мяне пыхліва пазіраў Начальнік. Захацелася папрасіць грошай на рамонт дзіравай страхі. Але насмеліўся і прачытаў надпіс... О, нябёсы! Зноў неўміручы "П.П. Шарыкаў, начальнік пададдзела ачысткі горада" — усяго толькі! А помнік траха меншы як Машэраву... Спачуваю родным, яны рана страцілі блізкага і дарагога чалавека, але што такое гераічнае ён паспеў зрабіць на карысць Айчыны, каб яна ўзнесла яго "вышэй Александрыйскага слупа"?

Ветэран пахавальнага руху

Вядома, я рады поспехам нашай дэмакратыі, але ж у брэжнеўскія часы ў справе пахавання і ўшанавання знаных нябожчыкаў і то было праўдзівей. І хавалі мы сваіх пісьменнікаў, і паміналі куды з большай годнасцю. Дзе хаваць памерлага, на прывілеяваных Маскоўскіх ці звычайных Чыжоўскіх, Паўночных і г.д., вырашалася на самым высокім узроўні — ЦК, Саўмін. Іншы раз да апошняй хвіліны ў СП не ведалі, куды павязуць труну.

Кажу гэта з досведам, бо трынаццаць гадоў (з 1976 як прыйшоў на працу ў "Маладосць") уваходзіў у трунаносную каманду, якую набіралі з супрацоўнікаў рэдакцый часопісаў, "ЛіМа" і літрэдакцыі радыё. Кіраваў намі тады адказны сакратар "Маладосці" Леанід Дайнека. Напярэдадні пахавання ён абзвоньваў трунаносаў і прызначаў: каму ехаць па труну, а потым — у трупярню лечкамісіі па нябожчыка, каму даставіць у Дом літаратара вянкі і кветкі, хто будзе несці труну, вечка, чырвоную "тумбачку", партрэт... Ніхто не адмаўляўся — работа была ганаровая, нават пачэсная, бо трунаносаў па народнай завядзёнцы першымі садзілі за хаўтурны стол. А хаўтуры тады спраўлялі за кошт Літфонду не горш за юбілеі...

Труну ставілі на прыбранае кілімамі ўзвышша ў вестыбюлі другога паверха Дома літаратара. Народныя і ўганараваныя Дзяржпрэміяй пісьменнікі траплялі на сцэну актавай залы. Тут ужо распарадчыкам быў нейкі Эскінд, ён вызначаў радоўку — хто за кім будзе стаяць у ганаровай варце ля труны, чапляў ім на левую руку чырвона-чорныя павязкі, дамаўляўся з выступоўцамі, якія будуць казаць жалобнае развітальнае слова. Калі пісьменнік быў слынным аўтарам і добрым чалавекам, дык ахвочых выказацца было ажно зашмат. У нябожчыка знаходзілася столькі сяброў і прыхільнікаў ягонага таленту, каб ён ведаў гэта пры жыцці, дык быў бы найшчаслівейшым чалавекам на зямлі. Эскінду даводзілася вылучаць з гэтай плойімы "сяброў" найбольш шаноўных, красамоўных і... цвярозых. Бо аднойчы на жалобным мітынгу па Народным паэце ў зале Палаца прафсаюзаў адзін з літаратараў на добрым падпітку перабіў афіцыйнага прамоўцу: "Маўчы! Ты яго не ведаў! Дай я скажу!" — і пачаў караскацца на сцэну. Пахіснуўся і... зваліўся ў аркестравую яму. Добра, што яна была запнутая брызентам. З таго брызенту яго і сцягнулі цішком за ногі.

Здаралася, што ахвочых выказаць жалобу не знаходзілася. Жыў чалавек, нешта пісаў, дакладней — быў пісьменнікам, а памёр... і сказаць добрае слова няма каму і няма чаго. Тады заклікалі штатных "плакальшчыкаў", здатных красамоўна ды патэтычна сказаць пра зямны шлях нябожчыка. А на гэта не кожны здатны. У пачатку 90-х, калі ў Літфондзе ўжо не было грошай не тое, што на труну, нават на вянок, пісьменніка хавалі на кошты родных і блізкіх. Абы толькі ім на ўцеху труна з памерлым пастаяла ў Доме літаратара ды адбыўся грамадзянскі мітынг з прамоўцамі і ганаровай вартай. Калі нябожчык займаў нязначнае месца ў літаратурным працэсе, дык тую ганаровую варту, як некалі нас, трунаносаў, збіралі па рэдакцыях, а ўжо неслі труну блізкія ды знаёмыя памерлага. Цяжэй за ўсё было знайсці "плакальшчыка". Найчасцей шанцавала ўпрасіць (па ягонай дабраце душэўнай) майго сябра-паэта, тадышняга рэдактара "ЛіМа". Доўгі час працуючы сакратаром СП, ён навастрыўся ў гэтай справе, нават дасягнуў пэўных вяршынь у прамаўленні жалобнай казані па нябожчыку. Неяк на пахаванні старога, сярэдняй рукі літаратуразнаўцы, ён так натхніўся, так завёўся, што хвілін 15-ць ракатаў сваім рэпрадуктарным голасам, які нябожчык быў добры навуковец і чалавек. У мяне ажно горла перацяла ды сляза нагарнулася. Калі адышлі з ім убок пакурыць, кажу прачула: "Мусіць, з гэтым чалавекам вы не адну чарку перакулілі?" "Ты што?! — вырачыў ён вочы. — Пры жыцці адзін раз бачыў! Во ў труне — другі..."

Па размаху пахавальнай цырымоніі і багацці хаўтурнага стала ў 80-я гады можна было беспамылкова меркаваць аб значнасці пісьменніцкіх здабыткаў нябожчыка. Сталы зазвычай накрываліся літарай "П" (вышэйшы узровень) альбо літарай "Т" (ранг крыху ніжэйшы) у кафэ Дома літаратара, дзе спраўлялі таксама пісьменніцкія юбілеі. Таму не абыходзячыся трыма кананічнымі чаркамі, застольнікі іншы раз забываліся на абавязковы ў такім выпадку смутак, гучна гаманілі між сабою, а той-сёй ужо і песню спрабаваў зацягнуць... Тады чуўся прафесарскі голас стырнавога СП Ніла Гілевіча: "Панове, не забывайцеся! Нябожчык, вядома, быў вясёлым чалавекам. Таму і смуткуем па ім, што рана пайшоў..."

Першы раз у складзе "камандас" мне давялося несці труну з Іванам Мележам у жніўні 1976 года. А за 13-ць гадоў на маіх плячах перабралася ў лепшы свет ледзь не палова сяброў творчага саюза. Парадкі ў камандзе былі строгія: Дайнека сачыў, каб на падпітку пад труну не станавіліся, такім давяралі несці хіба што вечка. Нехта з "камандас" склаў жартаўлівы дэвіз трунаносаў:

Не важна,
калі прызначаць вынас.
Галоўнае:
каб мы вас, а не вы нас!

Ды вось неяк выносім труну з Іванам Шальманавым, аўтарам славутай "Цагельні" — ён апошнія гадоў дзесяць быў нашым брыгадзірам. І тут стрэліла ў галаву здагадка... Каб чула ўся шасцёрка, трэба было гаварыць прыглушаным голасам сабе пад ногі, пад труну, я і кажу: "Хлопцы, трэба разбягацца — мы ўжо сваіх пачалі насіць!" Труна ўздрыгнула. Мікола Базарэвіч, які хадзіў пад труною пасярэдзіне, засіпеў: "Сціхні! Не хапала Івана выкуліць..."

Брама неўміручасці

Надмагільны помнік сатырыку Кандрату Крапіве зроблены таксама ў сатырычна-гратэскным стылі — на галаву славутаму байкапісцу скульптар уздзеў лаўровы вянок, як прыналежнасць Крапівы да сойму алімпійцаў. Героі крапівоўскай "Брамы неўміручасці" дамагаліся вечнага зямнога жыцця — заказчыкі ж помнікаў тым, хто ляжыць на Маскоўскіх кладах, імкнуліся, каб пра іхных нябожчыкаў вечна помнілі. Уяўленні аб прыкметах вечнай памяці і ўдзячнасці памерлым у кожнага жывога свае. Іншы раз гэтыя ўяўленні вельмі безгустоўныя. Але, хто плаціць грошы, той, вядома ж, замаўляе і музыку. Знаёмы скульптар-мемарыяліст на маё пытанне пра невысокую мастацкую вартасць некаторых надмагілляў паціснуў плячамі: калі помнік замаўляе скульптару дзяржава, дык работу прымае мастацкі савет дасведчаных спецыялістаў і яны патрабуюць ад мастака яе пэўнага кшталту. Калі заказчыкам з'яўляецца нейкая ўстанова, фірма ці прыватная асоба — тут усё цалкам залежыць ад густу заказчыка. Дый і скульптары, ведаючы наперад, што чым меней яны будуць выстаўляць сваю вынаходлівасць у творчых пошуках, тым меней клопату з заказчыкам. Таму і з'яўляюцца надмагіллі пісьменніка з абавязковай асадкаю ў руках, мастака з палітраю альбо пэндзлем, акцёра з маскаю Мельпамены... Да чаго тады даўмеецца мастак, калі акадэмік быў лепшым у свеце ўрачом-практолагам? Банальныя паставы, трывіяльныя позы — адным словам штамп на штампе. Не буду называць пэўныя скульптурныя "адкрыцці", але найбольш не шанцуе ў гэтай справе генералам — іхныя бюсты падобны адзін да аднаго, як гаршчкі на івацэвіцкім кірмашы. Міністэрства абароны суровы заказчык і не любіць адхіленняў ад раз і назаўсёды прынятага ўзору. Зрабі, мастак, вось так і не іначай!

Ля гожай магілы з густоўным помнікам і пастаяць прыемней. Больш за ўсіх мне даспадобы надмагілле Іосіфа Жыновіча. (Па стылі, думаю, гэта работа Бембеля). Чырвоны туф, плыўкія лініі паставы, аблічча без фатаграфічных "падрабязнасцей" — мастак стварыў вобраз музыканта, а не партрэт з прыкметамі падабенства. Добры помнік паэтцы Жэні Янішчыц, акцёрам бацьку і сыну Яроменкам, кінарэжысёру Віктару Тураву. Застаўся б задаволеным сваёй выяваю і драматург Андрэй Макаёнак, хаця скульптар Анатоль Анікейчык і зрабіў у ягонай паставе амаль "рэмікс" купалаўскага надмагілля на Вайсковых кладах. Але побач — чырвоны гранітны валун, на спіле якога каліграфічнымі бронзавымі літарамі пазначана "Уладзімір Караткевіч". Гэтая выдатная работа належыць таму ж Анікейчыку. Ды побач магіла — на ёй такі ж самы, кропля ў кроплю, гранітны валун з такім жа спілам, з тым жа бронзавым шрыфтам, толькі надпіс іншы: "Анатоль Анікейчык"! Ці то калегі-скульптары такім чынам аддзячылі некалі вельмі паспяховаму канкурэнту, ці Анікейчык пры жыцці зрабіў сабе надмагілле, працытаваўшы некалі знойдзенае ўдалае рашэнне слова ў слова?

На Маскоўскія могілкі людзі прыходзяць як на экскурсію. Ходзяць між радамі магіл, ля ўпадабаных спыняюцца, кветку пакладуць... Некага помняць жывым, пра некага чулі добрыя словы, а то і таму, што помнік падабаецца. Ля магілы Ларысы Пампееўны Александроўскай заўсёды кветкі, заўсёды наведвальнікі — адразу па трох вышэйназваных прычынах.

Тым, хто трапіў у пантэон на Маскоўскіх могілках, пашанцавала (калі да месца такое слова). Іхныя магілы дагледжаныя, прыбраныя, да іх прыходзяць людзі. Менш пашанцавала тым, каго абмінулі мармуровыя абдымкі Айчыны. Адмірал беларускай паэзіі, ейны самы народны паэт Анатоль Вялюгін ляжыць на Паўночных могілках разам са сваім народам: справа пакладзены 40-гадовы ліквідатар-чарнобылец, злева — лётчык-падпалкоўнік, што застаўшыся без войска і самалёта, застрэліўся на цешчынай дачы... У снежні з кампаніяй пісьменнікаў былі мы на магіле паэта. Разгрэблі снег, паклалі колькі кветак, паставілі чарку з гарэлкай — памянулі Адмірала ў дзень ягонага юбілею.

А вось магіла Паўлюка Труса на Вайсковых кладах выглядае зусім несамавіта. Мо Трус, як паэт, і не роўня некаторым і памятаем яго толькі па школьных падручніках, але ж сціплага крыжа, зваранага з вадаправоднай трубы, усё ж недастаткова. Побач — сіратлівы чорны мармур Кузьмы Чорнага. Відаць, Саюзу пісьменнікаў варта было б стварыць нейкі грамадскі камітэт па доглядзе занядбаных магіл, каб было каму перад Радуніцай хаця прыбраць іх, ускласці кветкі — калі няма грошай на больш дыхтоўныя.

* * *

У канцы маскоўскага пантэона — тры магілы яшчэ пад драўлянымі крыжамі: Уладзімір Мулявін, Васіль Быкаў, Міхаіл Пташук... Днямі завяршылася даволі шумная баталія паміж скульптарамі за заказ на помнік Мулявіну — Айчына знайшла на яго неблагія грошы. Хто перамог у гэтай баталіі — прамаўчу. Будзем спадзявацца, што мастак зробіць годны помнік Песняру. А Васілю Быкаву, як Пімену Панчанку, чакаць восем гадоў?..

Алесь ГАЎРОН
Фота Кастуся ДРОБАВА

ЛеГалІЗАЦЫЯ

Мішэль МАНТЭНЬ:

"Ніколі не бывае, каб два чалавекі аднолькава разважалі пра адныя і тыя ж рэчы, і дзвюх абсалютна аднолькавых думак немагчыма знайсці ні толькі ў двух розных людзей, але і ў аднаго і таго ж чалавека ў розны час. Звычайна мяне адольваюць сумненні якраз з той прычыны, на якую каментатар не пажадаў звярнуць увагі."

Васіль СЁМУХА. "Адкрыты ліст..."(газета "Наша Ніва", № 14, за 9 красавіка 2004г.)

Даўно ўжо так глыбока не расчароўвалі мяне людзі, да якіх я ставіўся з такой павагай і гэтак высока цаніў іх талент, як Васіль Сёмуха ў сваёй нядаўняй нашаніўскай публікацыі. Аднак каб увесці чытача ў сутнасць справы, трэба пачаць з прэамбулы. З таго, што Бог ёсць і Ён напраўду-такі "на Беларусі... жыве". Бо недзе за два тыдні да Вялікадня, падрыхтаваўшы да друку падборку вершаў паэта з Баранавіч Івана Лагвіновіча, мне падалося, што да верша "Кніга", прысвечанага беларускамоўнай Біблії, добра пасавала б прысвячэнне яе перакладчыку. Я адразу ж патэлефанаваў у Баранавічы і зрабіў такую прапанову, на што спадар Лагвіновіч з удзячнасцю пагадзіўся: *"Так, так, вядома, калі яшчэ не позна, пастаўце прысвячэнне Васілю Сёмуху..."* За дзень да выхаду газеты ў свет, ідучы дахаты купіў у газетным шапіку вячэрні нумар заўтрашняй "Нашай Нівы". Далёка не ўсё падзяляючы ў гэтай газеце, я заўжды ставіўся да яе з павагай і яшчэ не прапусціў аніводнага нумара з дня аднаўленага яе выхаду ў свет. Нават выдрукаваў "юбілейны" артыкул да яе дзесяцігоддзя, дзе дарэчы адкрытым тэкстам выказаў сваю нязгоду з тарашкевіцай, на маю думку, састарэлым, пазбаўленым нармальнага эвалюцыйнага ўдасканальвання, правапісам, а таксама звярнуўшы ўвагу на яшчэ такую-сякую спрэчную рэдакцыйную скіраванасць... (Аднак, не зважаючы на ўсё тую ж тарашкевіцу, з пачуццём душэўнай узнёсласці адным з першых купіў я беларускамоўную Біблію з рук самога яе перакладчыка, шаноўнага Васіля Сёмухі.)

І вось цяпер, прачытаўшы "Адкрыты ліст Васіля Сёмухі", я натуральна абрынуўся ў стан расчаравання і глыбокай дэпрэсіі.

Пра што ў лісце. *"Літаратар-перакладчык, ляўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа"*, як пазначана пад лістом, мусібыць, для важкасці заявы, абураны тым, што яго падпісалі на тыднёвік "ЛіМ", як аднаго са *старэйшых і малазабяспечаных* літаратараў на грошы, дабрачынна выдаткаваныя дзеля гэтага з ганарара паэта Юрася Нератка. Васіль Сяргеевіч "лічыць за гонар і шчасьце не чытаць холдынгавых выданьняў, не друкавацца ў іх і тым больш падтрымліваць іх сваёй падпіскай". Але найбольш расчаравала мяне ў спадары Сёмуху вось гэта: *"Я, натуральна, не зьбіраюся судзіцца зь "ЛіМам" і холдынгавым начальствам ды патрабаваць маральнай кампэнсацыі за абразу — Бог вам судзьдзя і той, каго вы за бога маеце, — і, як што гаварыць пра нейкую мараль у падобнай сітуацыі аніяк не выпадае, толькі патрабую выключыць мяне зь любых сьпісаў вашых прыхільнікаў і віватоўцаў"*. ("Віватоўцы" — гэта, відаць, новы арыгінальны наватвор Васіля Сяргеевіча. Нечым яны ў гэтым кантэксце напамінаюць мне тых, што ходзяць ці яшчэ будуць хадзіць у ватоўцы.) Між іншым у гэтым жа нумары "Нашай Нівы" на апошняй старонцы выдрукаваная падзяка *"групе моладзі зь Берасьця, якая падпісала на "НН" 5 адрасатаў"*. Калі і яны не правяралі сваіх адрасатаў, прабачаюся, на "вашывасць", то таксама маюць шанц нарвацца на эфект бумеранга. Ці ўсё ж падпісалі людзей надзейных і з ўсіх бакоў годных?.. Трэба ўсё-ткі, як казаў адзін чыноўнік, трымаць свой *"народ на кантролі"*...

Зрэшты, здараюцца і адваротныя выпадкі. Надоечы патэлефанаваў у рэдакцыю Пятро Прыходзька: *"Хлопцы, вы, мабыць, падпісалі мяне на "ЛіМ"?! Дык я ж і сам падпісваюся. Але — дзякуй. У мяне суседзі любіцелі беларускае пачытаць, то аддаю адзін нумар ім. Усё карысць..."* Праўда, як розняцца разуменні **беларускай сітуацыі** двума літаратарамі. Але наўрад ці думка Пятра Прыходзькі можа быць важкім аргументам для Васіля Сёмухі. Ведаю таксама, што не зважаючы ні на што, працягваюць падпісвацца на нашу газету шмат **адраджэнцаў** і даволі вядомых **беларускіх людзей**, якія з болем успрымаюць сённяшні стан беларускай мовы, хоць у іх, шаноўны Васіль Сяргеевіч, нашмат больш аб'ектыўных прычынаў накласці на наша выданне сваё "табу". Але яно — **БЕЛАРУСКАЕ**, спадар Сёмуха. Яго ж нам, як матцы — хваравітае дзіця, можа, больш за іншых любіць трэба. Вядома, вы — дэмакрат і я не збіраюся вас настаўляць як і што рабіць. Можаце сабе падпісвацца хоць на "Washington Post", а чытаць і друкавацца ў "Комсомольской правде" і "БДГ"... Вольнаму — воля.

Не чытаеце і не хочаце бачыць у сябе "ЛіМ", дык мы ж вас і не змушаем, перакідвайце яго ў іншую паштовую скрынку (мо ад гэтага рукі не адваляцца), раптам людзі нечакана для сябе ўсёй сям'ёй беларускія словы ўзгадаюць ды раздумаюцца над сваім айчынным лёсам... Ну, навошта вам пра сваю нелюбоў да беларускіх выданняў у друку гнеўныя філіпікі друкаваць?! Каму патрэбная ваша *прапілатаўская поза* (**помиловать нельзя казнить**)?! Я ж не пішу скаргаў у "Народную волю" , калі мне перад якімі чарговымі выбарамі "СБ" падкідваюць. А вось калі б мяне хто-небудзь на "НН" падпісаў ці, скажам, на "Прессбол", альбо часопіс "Маладосць", то шчыра падзякаваў бы. (А вы ўзялі ды абазвалі нас *"эксплюататарамі"* паэта Юрася Нератка. Ён жа, будучы ў бальніцы пасля сур'ёзнай аперацыі, сам даслаў нам ліст-даручэнне на выкарыстанне яго ганарара дзеля падпіскі на наша выданне *"прыхільнікаў беларускага краснага пісьменства"*. А тое, што наша тэхнічная супрацоўніца, якой усё роўна было, на чыім прозвішчы ў пісьменніцкім даведніку спыніцца, вас таксама залічыла да тых самых спадзяваных прыхільнікаў, як аказваецца цяпер, проста выпадковая недарэчнасць. А вы падумалі ўжо, што мы вас спецыяльна *агітуем*, як будучага *ідэалагічнага байца-навабранца* для саюзнай дзяржавы. Ды кіньце вы, ростам не выйшлі!)

І паралельна два словы да прымыкаючай да "Адкрытага ліста" зацемкі ў "НН" "Бывай, "Маладосць". І дурню зразумела, што поруч два аднатэмныя матэрыялы ў адной газеце на адной старонцы выпадкова стаяць не будуць. Ці не прырост тыражоў у холдынгаўскіх выданняў некага **змушае** да гэтага? А наконт пасажа карэспандэнта А.Шанскага, што *"незалежны часопіс "Arche" праблемаў са сьпісаньнем ня мае, яно невялікае"*, і што ад спісанняў "Полымя" і "Маладосці" пацярпеў незалежны часопіс "Дзеяслоў", магу сказаць толькі адно: спадар Шанскі, наведайце, калі ласка, хаця б адну толькі "Кнігарню пісьменніка" на Казлова, што поруч з вашай рэдакцыяй, і акіньце бясстрасным вокам паліцы, спецыяльна ахвяраваныя для перыядычных часопісных выданняў. Нават аднаго гэтага агляду вам будзе дастаткова, каб значна падкарэкціраваць свой суб'ектыўны погляд на акрэсленыя вамі рэчы...

Аднак, вернемся да нашай канкрэтнай тэмы. Ці ўсё ўжо так паскудна сёння ў тым "ЛіМе", Васіль Сяргеевіч, і хто там каму *"бог"*, як вы намякаеце, пішучы тое слова з малой літары? Няўжо мы заклікаем да таталітарызму, русіфікацыі ці міжканфесійнай барацьбы? А калі вы не згодныя з якімі канкрэтнымі пасыламі ў артыкулах нашых канкрэтных аўтараў (Т.Бондар, У.Саламахі, Л.Галубовіча, Р.Баравіковай, В.Куртаніч, А.Гаўрона ды інш.), то палемізуйце з імі на нашай ці нейтральнай тэрыторыі, пакажыце нарэшце сваю сапраўдную еўрапейскую дэмакратычную вытанчанасць... Не памятаю, хто з мысліцеляў сказаў, што **хоць ён і не падзяляе пэўных меркаванняў, але за тое, каб яны былі выказаныя, ён аддаў бы сваё жыццё**... Амаль даслоўна. Прынамсі, за сэнс ручаюся.

А мо вы, наглядзеўшыся і наслухаўшыся расійскіх тэлеканалаў, міжволі пачалі падзяляць падсвядомы пастулат рускай нацыянальнай ідэі: *"Бі сваіх, каб чужыя баяліся"*?..

Калі б я вас так не паважаў, то не пісаў бы ўсіх гэтых, пэўна, залішне эмацыянальных і там-сям несправядлівых адносна вас слоў. Але пішу, бо не пакідае мяне расчараванне. Яго ў мяне і так хапала, а тут яшчэ вы чарговую порцыю падсыпаеце. Цяпер мне засталося верыць толькі Богу, Маме, Жонцы, Дачцы, Разанаву ды Айчыннаму Слову... Яшчэ, як бачыце, ёсць каму.

Каб Вы, Васіль Сяргеевіч, не былі перакладчыкам Біблії, у мяне, магчыма, не было б такой горычы ў сваім расчараванні да Вас. Бо як жа, думаю я, чалавек больш дзесятка гадоў учытваўся ў кожнае Слова Кнігі Кніг — і раптам пакідае мяне ў такім бязвер'і да сябе самога. Памятаеце, у Святым Дабравесьці паводле Лукаша, у васемнаццатым раздзеле Вы пераклалі словы Хрыста так: *"Сказаў таксама да некаторых, якія былі ўпэўненыя ў сабе, што яны праведныя, і прыніжалі іншых, наступную прытчу: два чалавекі ўвайшлі ў храм памаліцца: адзін фарысэй, а другі мытнік. Фарысэй, стаўшы, маліўся сам сабе так: Божа! Дзякую Табе, што я не такі, як іншыя людзі, рабаўнікі, крыўдзіцелі, блудадзеі, альбо як гэты мытнік: пашчуся два разы на тыдзень, даю дзесяціну з усяго, што набываю. А мытнік, стоячы воддаль, не адважыўся нават падняць вочы да неба; але б'ючы сябе ў грудзі, казаў: Божа! будзь міласэрны да мяне, грэшніка! Кажу вам, што гэты пайшоў у свой дом апраўданы болей, чым той; бо кожны, хто ўзьвялічвае сам сябе, паніжаны будзе, а хто паніжае сябе, узвысіцца"*.

Але напрыканцы яшчэ ўспомнім рускага паэта Фёдара Цютчава:

Нам не дано предугадать,
Как наше слово отзвется,
Но нам сочувствие дается,
Как нам дается благодать.

Бо ўсё ж не маю сілы пазбыцца сваіх ранейшых пачуццяў да Вас, шаноўны Васіль Сёмуха. Спадзяюся, небеспадстаўна. Унутраны голас падказвае мне, што неўзабаве, спазнаўшы свае памылкі, мы зноў паразумеемся. Без гэтага нельга, жывучы на адной зямлі, пад адным небам, з адным Словам...

Анатоль КІРВЕЛЬ. "Дыстыляваны дождж" (Санкт-Пецярбург, 2004, "Новая Беларусь", рэдактар А.Хатэнка, 500 экз., 160 стар.)

Час ад часу гэтага *швыдкага* беларускага пецярбуржца можна сустрэць з вечна свежым недапалкам гародзенскай цыгарэты ў нашых сталічных літаратурных калідорах. Лёгкі і хуткі да спраў і гаворак, ён пакідае пасля сябе помны тытунёвы пах і няпэўную творчую аўру ў выглядзе незалежнай газеты піцерскіх беларусаў "Родзічы", прывітання ад Аўгінні Кавалюк альбо сваёй новай афарыстычнай кніжкі...

Анатоль Мяфодзьевіч мне падабаецца. Ён выдае сябе такім як ёсць, і па- хамелеонску не мяняе сваёй аднатоннай афарбоўкі.

Гэтую кніжку аўтар падрыхтаваў да друку яшчэ ў 1996 годзе, аднак дарма... Чаму? Адзін Бог ведае. Затое цяперашні яе выгляд уражвае: і партрэтамі самога А.Кірвеля на першай і апошняй вокладках, і малюнкамі ажно пяці мастакоў (А.Марачкіна, У.Скрыгана, Н.Салаўёвай, В.Смірновай ды М.Васільева), і, безумоўна ж, самімі лірычнымі мініяцюрамі аўтара. А. Кірвель — празаік **чыстай вады**, аднак, пры рэзкай зменне атмасфернага ціску (чытай, пры глыбокіх душэўных перажываннях), з **яе** выпарэнняў так і прэ непадробная паэзія: своеасаблівы доўгачаканы дождж на сасмяглую глебу душы. Таму ў кніжцы дастаткова іскрамётных афарыстычных мініяцюр, хоць трапляюцца і падобныя да легкаважных хмарак, што намагаюцца закрыць сабой спякотнае сонца. А.Кірвель на самым зачыне просіць сучасных чытачоў чытаць гэтую ягоную кніжку *"гэтак як чыталі даўней — маючы вольны час і не похапкам, а па старонцы ў дзень, альбо па дзве — як каму лацвей, — а потым адкласці і не думаць пра яе: займацца сваімі справамі"*. Хоць адзін аўтар праявіў спагаду да свайго чытача. Дзякуй. Я так і зрабіў. Наастатку працытую адзін з ўпадабаных мной тэкстаў.

Спазнанне каштуе роўна гэтулькі,
колькі ты за яго заплаціў:
жыццё,
палову яго,
альбо нічога.
Якая плата —
такое і спазнанне.

Шаноўныя чытачы, усе гэтыя кніжкі вы можаце набыць у "КНІГАРНІ ПІСЬМЕННІКА" (г.Мінск, вул.Казлова, 2).

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе
ўзнагароджаны ордэнам
Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:

Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Леанід ГАЛУБОВІЧ,
Віктар КАВАЛЁЎ,
Вольга КУРТАНІЧ,
Віктар ПАТАПЕНКА — намеснік галоўнага рэдактара

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск,
вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-79-65
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-81-53
паэзіі, літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы — 284-66-73
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-81-53
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-84-61

Электронны адрас:
e-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце — www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Ф. Скарыны, 79

Індэкс 63856 Наклад 1891
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 21.04.2004 у 11.00

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 641

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12